Леанід Лаўрэш Галіна Лаўрэш

# Там, дзе спыніўся час…



Леанід Лаўрэш

Галіна Лаўрэш

# Там, дзе спыніўся час…

*Лідскія гістарычныя некропалі*

«ГроКарДрук»
2024

УДК 94(476)
ББК 63.3(4Беи)
Л 13

**Лаўрэш, Л.Л.**
**Лаўрэш, Г.І.**
Л 13 Там, дзе спыніўся час… . Лідскія гістарычныя некропалі / Л.Л. Лаўрэш, Г.І. Лаўрэш,– "ГроКарДрук", м. Казімір, 2024. – 222 с.

ISBN 978-625-7257-92-7.

У кнізе, грунтуючыся на архіўнай інфармацыі, працах гісторыкаў, мемуарах лідзян і артыкулах старых газет, расказваецца гісторыя старажытных могілак (да паловы ХХ-га ст.) горада Ліда.

Кніга будзе цікавай жыхарам Ліды, экскурсаводам і гасцям горада, а таксама ўсім чытачам, якія цікавяцца беларускай мінуўшчынай.

**УДК 94(476)**
**ББК 63.3(4Беи)**

**ISBN 978-625-7257-92-7**

© Лаўрэш Л.Л., Лаўрэш Г.І.,2024

pawet.net

Люблю я могілкі з каплічкай,
Прыселле насыпаў і пліт,
Дзе крыж і страшыць, і галубіць,
Слязой дзе кожан дол абмыт.

*Янка Купала*

Тут, дзе стагоддзі ў зямлю ўбіты,
Дзе пахавана войнаў замяць,
Між мёртвых помнікаў і плітаў
Жывым вятрыскам вее памяць.

*Станіслаў Суднік*

# Ад аўтараў

Думаю, што нікога не можа здзівіць думка, што большасці жыхароў любога горада сярод нас ужо няма, яны памерлі, і мы, тыя хто жыве зараз, у нейкім сэнсе дзелім свае гарады з імі. Прычым, для іх гісторыя ўжо адбывалася, і героі назаўжды застануцца героямі, мярзотнікі мярзотнікамі, а звычайныя, добрыя людзі, якія заўжды былі большасцю, добрымі людзьмі. У кожным старым горадзе ёсць месцы, дзе фізічна адчуваецца прысутнасць тых, хто раней за нас нарадзіўся, любіў, ненавідзеў, пакутаваў і радаваўся. Гэтыя месцы – старыя гарадскія могілкі. Усім вядомы могілкі на Росах у Вільні, Кальварыя ў Менску ці Лычакоўскія могілкі ў Львове. Ёсць такія ж старажытныя, толькі зразумела, меншыя ў Лідзе – гэта старыя гарадскія (сярод жыхароў горада яны маюць назоў «каталіцкія») і старыя праваслаўныя могілкі. Тут, сярод клёнаў і соснаў жыве мінулае нашага горада, і мы, калі прыходзім сюды, рухомыя сваёй цікаўнасцю да гісторыі найчасцей каб адшукаць магільны помнік кагосьці з тых, пра каго пішам, адчуваем сапраўдны подых мінуўшчыны. Але старыя лідскія могілкі – ахвяра вандалізму канца савецкай эпохі. Большасць помнікаў тут разбіта і перавернута, д'ябальская злая моц у свой час зрабіла ўсё магчымае, каб ператварыць могілкі ў пустэльню.

Аднак, дзякуючы валанцёрам, старыя гарадскія (каталіцкія) могілкі ў 2017–2020 гг. былі прыведзены ў адносны парадак, узноўлена тое, што яшчэ можна ўзнавіць і складзены спіс пахаванняў па помнікам, на якіх яшчэ нешта можна было прачытаць.

Да XIV ст. амаль што адзіным месцам для могілак служылі пляцы цэркваў і касцёлаў, але з ростам гарадоў месцаў каля храмаў стала не хапаць і могілкі пачалі ўладкоўваць на ўскраінах гарадоў. У XVII і асабліва ў XVIII ст. урады, зыходзячы з меркаванняў санітарнай бяспекі, пачалі забараняць пахаванне памерлых пры храмах, а ў XIX ст. усталявалася норма, якая забараняла могілкі ўнутры гарадоў ці паселішчаў. Могілкі павінны былі знаходзіцца на вызначанай адлегласці ад апошняга жытла. У Італіі адлегласць гэта вызначалася ў 100 м, у Саксоніі ў 136 м, у Аўстрыі і Францыі ў 200 м. Брусельскі гігіенічны кангрэс 1852 г. прызначыў адлегласць як мінімум у 400 м, па рускім заканадаўстве могілкі ўладкоўваліся ў гарадах на адлегласці не менш за 200 м ад апошняга жытла, а ў селішчах – на адлегласці паўвярсты: «Для гарадскіх могілак адводзяць месцы за горадам ... у месцах зручных, адлегласцю ад апошняга гарадскога жылля не менш за сто сажняў»[1]. Таму практычна ўсе мемарыяльныя могілкі ў гарадах нашага краю заснаваны пры канцы XVIII – пачатку XIX ст.

У гэтай кнізе мы паспрабуем расказаць пра ўсе вядомыя нам лідскія гістарычныя могілкі – тыя, якія існавалі раней і існуюць зараз.

Для нас гісторыя могілак – гэта, у тым ліку, і гісторыя людзей, нашых землякоў лідзян, якія тут пахаваны.

[1] Свод Законов Российской Империи. Ст.-Петербург, 1842. Т. XIII. С. 90.

# Старажытныя ўніяцкія могілкі

Нагадаю, што сёння можна з упэўненасцю казаць пра існаванне паселішча на тэрыторыі Ліды ўжо ў XII ст., рэшткі якога былі знойдзены ў 1930-х гг.[2] Цікавым і важным для нас з'яўляецца тое, што паселішча было славянскім, а не балцкім, як пісаў Тэадор Нарбут[3] пры тым, што датыроўка археолагаў адносна добра супадае з датай заснавання нашага горада якую Нарбут падаў як 1180 г.

Па традыцыі каля хрысціянскага храма амаль што заўжды існаваў цвінтар – месца дзе хавалі парафіян гэтага храма. Таму можна дакладна сказаць, што першыя лідскія могілкі знаходзіліся каля першых лідскіх хрысціянскіх храмаў. Самым ганаровым лічылася пахаванне непасрэдна ў царкве – гэтым правам карысталіся толькі самыя важныя асобы – найперш калятары (тыя хто фундаваў храмы) і святары. Цвінтар – тэрыторыя побач з царквой, быў другім па прэстыжнасці месцам апошняга прытулку. У другой палове XVIII ст. царкоўнымі іерархамі была ўстаноўлена мінімальная плошча храмавага цвінтара на беларускіх землях – 24 квадратныя локці ці 10,08 м$^2$. Зразумела, што гэта вельмі мала, на гэткіх могілках месца хапіла б толькі на пяць паўнавартасных магіл, і праз некаторы час святару даводзілася б хаваць нябожчыкаў паверх ранейшых пахаванняў[4]. Лідскія цвінтары былі не надта вялікімі але, канешне ж, значна большымі за мінімальныя.

Маецца інфармацыя, што ўжо ў першай палове XVII ст. у горадзе дзейнічалі чатыры царквы: св. Яна, св. Мікалая

---

[2] Лаўрэш Леанід. Лакалізацыя «Ліды Нарбута», першаснага паселішча на тэрыторыі нашага горада // Лідскі Летапісец. 2023. № 2(102). С. 30–35.
[3] Narbutt T. Cokolwiek z historyi miasta Lidy // Narbutt T. Dzieje starożytne narodu litewskiego. T. 5. Wilno, 1839. Dodatek I. S. 1.
[4] Лісейчыкаў Д. В. Штодзённае жыццё ўніяцкага парафіяльнага святара беларуска-літоўскіх зямель 1720–1839 гг. Мінск, 2011. С. 94–95.

(каля рынкавай плошчы), св. Спаса (Збаўцы, у горадзе), царква Прачыстай (на Зарэччы)[5], аднак не з'яўляецца фактам тое, што ўсе яны існавалі адначасова.

Месцазнаходжанне цэркваў св. Яна і св. Спаса не высветлена. Вядома толькі, што царква св. Спаса знаходзілася недзе бліжэй да цэнтра горада. Улічваючы, што старая Ліда займала зусім маленькую тэрыторыю, сёння меўся б шанец, можа нават і выпадкова, знайсці падмуркі цэркваў ці, што больш верагодна, чалавечыя парэшткі на каляцаркоўных могілках. На дадзены момант у гістарычнай частцы горада Ліда дакладна ідэнтыфікаваны чацвёра былых могілак вакол сакральных будынкаў: двое былых рыма-каталіцкіх могілак вакол фарнага і кармеліцкага касцёлаў (пра іх гаворка пойдзе далей) і двое грэка-каталіцкіх могілак вакол былых цэркваў св. Мікалая (пераасвечаную потым у царкву св. Міхала) і Прачысценскай царквы. Нягледзячы на бясконцыя раскопкі дзеля тэхнічных камунікацый, да сёняшняга часу ў нашым горадзе не знойдзена ні слядоў цэркваў св. Яна і св. Спаса ні, што важна, могілак каля іх.

Таму можна выказаць гіпотэзу, што царква св. Спаса стаяла на месцы цэркваў св. Мікалая – св. Міхала, а царква св. Яна нейкі нязначны перыяд часу дзейнічала на месцы Прачысценскай (потым Уваскрэсення Гасподняга) царквы. Вядома, што драўляныя цэрквы часта гарэлі ці прыходзілі ў нягоднасць з-за гніення дрэва і пасля аднаўлення на тым жа самым (ці прыкладна на тым жа самым) месцы, маглі асвячацца па-іншаму. Гэта мы бачым на прыкладзе цэркваў св. Мікалая – св. Міхала (гл. далей). І, дарэчы, для зусім невялікага ў той час горада, двух цэркваў адначасова было б цалкам дастаткова.

---

5 Rouba N. Przewodnik po Litwie i Bialej Rusi. Wilna. 1909. S. 107–109.

Такім чынам, мы дакладна ведаем пра існаванне двух уніяцкіх могілак (магчыма, яны існавалі і раней як праваслаўныя Канстанцінопальскага патрыярхату) у нашым горадзе.

Прачысценская царква стаяла каля сучаснага скрыжавання вуліц Калініна і Стралкоўскага[6]. У другой палове XVIII ст. Ліда інтэнсіўна развівалася і ў 1765–1770 гг. паўстаў новы фарны мураваны касцёл, пабудаваны замест старога драўлянага. Недзе тады ж на Рынкавай плошчы пабудавалі мураваную ратушу ўпрыгожаную порцікам з калонамі. Пры ратушы існавала старадаўняя драўляная пабудова, выкананая ў гатычным стылі.

Лепшы знаўца нашай гісторыі Міхал Шымялевіч пісаў: «Пад канец XVIII ст. хрысціянскія могілкі горада Ліды знаходзіліся на ўзгорку паміж вуліцамі Гражыны, Вызвалення, Гарыстай (сёння – праспект Перамогі, вуліцы Калініна і Стралкоўскага. – Л. Л.). Тут, над старым млынарскім ставам, стаяла драўляная ўніяцкая царква Ўваскрэсення Госпадняга, пабудаваная з дрэва парафіяльнага касцёла разабранага ў 1765 г. Пры царкве знаходзіўся шпіталь для ўбогіх, г. з. прытулак»[7]. З іншай крыніцы вядома, што ў 1765 г. з дрэва разабранага старога фарнага касцёла, («як кажуць, яшчэ добрым для сценаў»), пабудавалі новую ўніяцкую царкву[8].

У «Вопісе парафій Лідскага дэканата ў 1784 г.» запісана, што на Зарэччы існуе «карчма старасты лідскага, прадмесце і плябанія ўніяцкая (ritus graci uniti)»[9].

---

6 Шымялевіч Міхал. Збор твораў / укл. Л. Лаўрэш. Гродна, 2019. С. 27.

7 Шымялевіч Міхал. Збор твораў. С. 216.

8 Pyzel K. Kościoł parafialny p.w. Podwyższenia krzyża św. w Lidzie // Kościoły i klasztory rzymskokatolickie dawnego województwa wileńskiego. Kraków, 2008. T. 2., cz. III. S. 103.

9 Rybak Andrzej. Dekanat lidzki w 1784 r. świetle opisów parafii. Białystok, 2004. S.70.

Зразумела, што новая царква Уваскрэсення Гасподняга была пабудавана на пляцоўцы былой Прачысценскай царквы. На карце канца XVIII ст. бачна, што яна мела форму падвойнага крыжа.

На гэтым старым, намоленым царкоўным пляцы знаходзіліся прыходскія могілкі, жыхарка горада Я. Ярмант пісала ў мемуарах пра сваё жыццё ў 1930-я гг.: «Наш дом стаяў ніжэй вуліцы Вызвалення (цяпер Калініна), калісьці на гэтым месцы былі могілкі, бо ў агародзе знаходзілі чалавечыя косці»[10].

Лідзянін XIX ст. Нікадзім Сегень пабудаваў дом недалёка ад гэтай былой царквы. Яго сын гэтак апісаў сваё наваколле: «Сырасць Дзяканкі (р-н горада паміж фарным касцёлам і рэчкай Лідзеяй. – Л. Л.), відаць непакоіла Нікадзіма (тут стаяў ранейшы дом Сегеняў. – Л. Л.), бо ён купіў кавалак сухой пясчанай зямлі на так званай Горцы. Гэтыя землі нядаўна былі далучаны да гарадскога раёна Зарэчча. Да гэтага тут, на Горцы, доўгі час мелася пляцоўка для вывучкі казакоў, якія стаялі ў горадзе. А ў яшчэ больш раннія часы на Горцы мусілі быць могілкі, бо там (у значнай глыбіні) часта выкопваліся чалавечыя косткі.

Набыты Нікадзімам участак зямлі прылягаў да дзвюх яшчэ нядаўна пазначаных вуліц: Мастоўскай (былая дарога на хутар Мастоўшчына[11]) і Гарыстай, якая вяла ад млына да дарогі на Ліпнішкі (зараз перакрыжаванне вуліц Чарнышэўскага і Стралкоўскага. – Л. Л.). Ля падножжа замка працаваў вадзяны млын з вялікай сажалкай. Вуглавое размяшчэнне пляца пад дом Нікадзіма было вельмі зручным для будучага падзелу дома паміж дзецьмі, бо дазваляла кожнаму мець добрую будаўнічую пляцоўку з выхадам на вуліцу»[12].

---

[10] Ярмонт Е. В тени замка Гедимина. Лида, 1995. С. 38.

[11] На ўсходняй ускраіне Зарэчча яшчэ ў першай палове XX-га ст. існаваў невялікі засценак «Мастоўшчына», потым ён стаў лічыцца фальваркам.

[12] Архіў аўтара.

Знакаміты віленскі гісторык, прафесар Іяхім Лелявель у 1805 г., вандруючы праз Ліду, занатаваў: «Ліда – мураваны горад з драўлянымі сценамі[13]. Тут ёсць толькі мураваныя касцёлы, з іх піярскі касцёл ужо 6 гадоў як накрыўся дахам і белым пакрыццём[14]. Апрача гэтых двух з паловай касцёлаў[15] ёсць яшчэ замак з чатырма высокімі сценамі, які сведчаць што Ліда была горадам літоўскіх князёў і мела здольнасць да абароны. Па рагах замка стаяць разваленыя вежы, з трох бакоў замка цячэ рака Лідзея[16] а за замкам – драўляная пустая царква (Уваскрэсення Гасподняга. – Л. Л.)»[17].

У 30-х гадах XIX ст. царкву Уваскрэсення Гасподняга на Зарэччы зруйнавала бура[18]. Але ўжо ў 1816 г. царква знаходзілася ў дрэнным стане і адміністратару царквы Аляксандру Канеўскаму было загадана ў звычайныя дні весці богаслужэнні ў фарным касцёле а ў нядзелю і па святах у Ольжаўскай капліцы. Пляц напаўразбуранай царквы трэба было абсадзіць дрэвамі і паставіць крыж[19].

Вызначаныя сучасным метадам каардынаты пляцоўкі Прачысценскай – а потым Уваскрэсення Гасподняга царквы – (і, магчыма, раней св. Яна): 53°53’10.3”N 25°18’26.3”E[20].

---

13 Гэта метафара Лялявеля кажа пра наяўнасць мураванага замка з касцёламі ў цалкам драўляным горадзе.

14 Верагодна маецца на ўвазе белы тынк.

15 Касцёлы: фарны, карmеліцкі і трэці, недабудаваны, піярскі – адсюль «два з паловай касцёла».

16 Насамрэч рэкі Лідзея і Каменка.

17 Listy Joachima Lelewela: oddział pierwszy: listy do rodzeństwa pisane. Poznań, 1878. T. 1. S. 44.

18 Шымялевіч Міхал. Збор твораў. С. 30.

19 Стренковский С. П. і інш. Сия есть вера, победившая мир, вера наша: Православие на Лидчине в XIII – XXI века. Мінск, 2024. С. 41.

20 Лаўрэш Леанід. Дзе і што археолагам шукаць у Лідзе // Лідскі Летапісец. 2023. № 3(103). С. 36–41.

Другія ўніяцкія могілкі меліся каля царквы св. Мікалая (і магчыма, раней, св. Спаса), якая ў XVIII ст. пасля перабудовы была пераасвечана ў царкву Міхала Арханёла, што бачна з актаў візітацый. Пазначаная царква і на тагачаснай карце горада, яна стаяла трошкі на поўдзень ад кляштара піяраў. Насупраць яе праз Віленскую вуліцу мелася сінагога. Пры канцы XVIII ст. – на пачатку XIX ст. горад меў два цэнтры, размешчаныя на восі, якой была вуліца Віленская. У адным цэнтры знаходзіўся замак, фарны касцёл, кляштар кармелітаў, у другім – ратуша, сінагога, уніяцкая царква Міхала Арханёла і кляштар піяраў[21].

Царква Міхала Арханёла ў канцы XVIII ст. ўжо знаходзілася ў дрэнным стане. Яна была пабудавана на падмурку, крытая гонтай, мела фацыяту[22] і купал з жалезным крыжам па-над царквой[23], акрамя вялікага купала, меўся яшчэ і «другі малы купал з крыжам жалезным»[24]. На карце канца XVIII ст. бачна, што царква Міхала Арханёла мела форму крыжа.

У 1784 г. у царкоўным архіве захоўваўся фундуш вялікіх князёў ВКЛ 1524 г. і фундуш на юрыдыку[25] ў г. Лідзе пад назвай Папоўшчына, падпісаны мітрапалітамі Антонам Сялявам 4 ліпеня 1644 г. і Львом Кішкам 4 ліпеня 1717 г. у маёнтку Рута Наваградскага павета[26]. У 1784 г. юрыдыку арандаваў яўрэй Ісак Ёселевіч, плацячы штогод 8 злотых 15 грошаў[27]. У 1792 г. юрыдыка пустая, «падлеглая заняпаду»[28].

21 Чантурия Ю. В. Градостроительное искусство Беларуси второй половины XVI – первой половины XIX в.: Средневековое наследие, Ренессанс, барокко, классицизм. Минск, 2005. С. 51.
22 Фацыята – паддашак, мансарда.
23 Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі (далей – НГАБ). Ф.136. Воп. 1. Спр. 41244. Арк. 35.
24 Дзяржаўны гістарычны архіў Літвы (далей – ДГАЛ). Ф.634. Воп. 1. Спр. 53. Візіты цэркваў Лідскага і Слонімскага Дэканата. 1784 г. Арк. 85.
25 Юрыдыка – частка горада, якая падпарадкоўвалася феадалу і на жыхароў якой не пашыралася судовая і адміністрацыйная ўлада магістрату.
26 ДГАЛ. Ф. 634. Воп. 1. Спр. 53. Арк. 86 адв.
27 Там жа. Арк. 96 адв.
28 НГАБ. Ф. 136. Воп. 1. Спр. 41244. Арк. 36.

Пры царкве Міхала Арханёла меўся шпіталь і пабудовы плябаніі: хата святара з каморай, пякарня, клець (амбар), гумно, хлеў. Плябанія «часткова плотам, а часткова жэрдкай агароджана, з брамай, пабудаванай стараннем двара і святароў»[29]. Дарэчы, наяўнасць брамы – прыкмета багатай парафіі, таму ў акце візітацыі запісана, чыім стараннем яна пабудаваная. Тут жа каля царквы знаходзіў старажытны цвітар. «Пляц, дзе пабудаваны царква са шпіталем, і дзе знаходзяцца могілкі мае паўтара морга»[30]. Морг роўны 0,71 га, адсюль вылічваем, што ўвесь царкоўны пляц быў трошкі большым за 1 га.

Пры капітальным рамонце вуліцы Сувальскай (першасная назва – Віленская, зараз – Савецкая) і пракладцы тэлефонных кабеляў да будаванай у той час новай пошты па вуліцы Міцкевіча ў 1937 г. былі знойдзены парэшткі XVIII ст. «лідскіх месцічаў, якія былі пахаваны на могілках пры ўніяцкай царкве, якая згарэла ў першай палове XVIII ст. Потым ужо праваслаўныя святары прадалі пляц былых могілак каля царквы пад участкі для будаўніцтва, і тут былі пабудаваны дробныя крамы»[31], – тут маецца на ўвазе царква св. Мікалая, якая згарэла, наступнай на гэтым была царква Міхала Арханёла.

На карце горада 1842 г. былой уніяцкай царквы ўжо няма, але памяць пра яе захавалася ў назве сучаснага праваслаўнага храма.

Каардынаты пляцоўкі цэркваў св. Мікалая і Міхала Арханёла (і магчыма св. Спаса): 53°53’36.0”N 25°18’13.4”E[32].

---

[29] Там жа. Арк. 35 адв.

[30] ДГАЛ. Ф. 634. Воп. 1. Спр. 53. Арк. 86–86 адв.

[31] Słowo. № 268 (4832), 28 września 1937.

[32] Лаўрэш Леанід. Дзе і што археолагам шукаць у Лідзе // Лідскі Летапісец. 2023. № 3(103). С. 36–41.

Зразумела, што большасць пахаванняў тагачасных лідскіх грэка-католікаў мелі толькі драўляныя крыжы і магілы знікалі пасля смерці блізкіх сваякоў нябожчыка. Але магчыма, што калісьці ў глыбіні зямлі яшчэ будуць знойдзены па-сапраўднаму старыя беларускія каменныя надмагіллі ці звычайныя ў той час масіўныя каменныя надмагіллі-крыжы з адпаведнымі надпісамі, што стане для нашага горада маленькай археалагічнай сенсацыяй.

# Старажытныя рыма-каталіцкія могілкі

Пачну з кароткай гісторыі лідскага фарнага касцёла.

Пачатак каталіцтва ў Лідзе адносіцца да часоў княжання Альгерда. Адзін з літоўскіх вяльможаў Гаштольд, прыняўшы рыма-каталіцкую веру, узяў пад сваё заступніцтва манахаў ордэна св. Францішка і пабудаваў для іх манастыр у Вільні[33]. У 1366 г. тры францішканцы прыбылі ў ВКЛ з Польшчы, каб распаўсюджваць тут хрысціянскую веру, і пасяліліся ў Лідзе. Праз тры гады місіянераў забілі паганцы. Але новыя браты-францішканцы прыйшлі ў Ліду. Над магілай сваіх папярэднікаў яны пабудавалі капліцу, пры якой і пасяліліся. Лідскім старастам тады быў хрысціянін Даўгерд. У 1376 г. колькасць місіянераў павялічылася да 9 манахаў. Такім чынам, з 1360-х г. у Лідзе існавала францішканская місія мэтай якой была прапаведзь хрысціянства сярод паганцаў. Горад згадваецца ў фундушавым дакуменце 1397 года нададзеным францішканцам[34].

У 1387 годзе Ягайла заклаў у Лідзе адзін з першых касцёлаў у ВКЛ. Ён перадаў касцёлу вёску, якая зараз называецца Плябанцы і даход з нейкай іншай воласці, так сама Ягайла надаў зямлю «на 6 сох», 3 пляцы, лугі і корчмы, дзесяціну з усёй каралеўскай маёмасці ў Лідскім павеце (гэты фундуш быў пацверджаны 7 ліпеня 1616 г. каралём Жыгімонтам III)[35]. Касцёл знаходзіўся на падзамчы і згарэў у 1392 г. пры нападзе крыжакоў. У 1397 г. быў пабудаваны

[33] Шымялевіч Міхал. Збор твораў. С. 27.

[34] Pyzel K. Kościół parafialny p.w. Podwyższenia krzyża św. w Lidzie // Kościoły i klasztory rzymskokatolickie dawnego województwa wileńskiego. Kraków, 2008. T. 2., cz. III. S. 93–98.

[35] Kurczewski Jan. Biskupstwo Wilenskie. Wilno, 1912. S. 208.

трэці па ліку касцёл (з улікам першай капліцы). Яго асвяціў віленскі біскуп Андрэй, які зноў адкрыў пры касцёле францішканскую місію, бо ранейшыя місіянеры гэтага ордэна хутчэй за ўсё былі забітыя або выгнаныя падчас нападу крыжакоў на Ліду ў 1394 г. Гэты касцёл згарэў у 1406 г. У 1414 г. ён быў узноўлены як парафіяльны і асвечаны пад назвай «Найсвяцейшай Дзевы Марыі Панны, Усіх Святых».

Фрагмент прывілею касцёлу, дадзены Ягайлам, сярод іншых дакументаў бярог лідскі пробашч і даў яго перапісаць Тэадору Нарбуту. У дадатку да пятага тома сваёй «Старажытнай гісторыі літоўскага народа» Нарбут змясціў тэкст гэтага прывілею[36], а таксама спіс пробашчаў Лідскага касцёла.

У Метрыцы ВКЛ Лідскі касцёл і цвінтар згадваецца ў 1516 г. з-за таго, што намеснік Лідскага дзяржаўцы Юрыя Ільініча не аддаў арыштаванага слугу гетмана Канстанціна Астрожскага калі «тотъ нятецъ самъ прибегъ на цвинтаръ и въ костелъ Лидски' на кони звязанъ, и ноги подъ конь окованы»[37]. Як бачым, згадваецца касцёл разам з цвінтаром.

Пад час спусташальнай вайны 1654–1663 г.г. горад некалькі разоў цалкам знішчаны і таму пасля заканчэння вайны быў адбудаваны новы, па-падліках, ужо 5-ты ці 6-ты (бо не вядома, ці прастаяў 240 гадоў касцёл 1414 г.) драўляны касцёл. Таму ў прывілею гораду ад 19.04.1670 г., пацверджанага каралём Міхалам Вішнявецкім, з'яўляецца згадка пра пабудову касцёла на падзамчы.

У тэксце візітацыі касцёлаў Віленскай дыяцэзіі ў 1674 г. біскупам-суфраганам Мікалаем Слупскім пра Лідскі касцёл зроблены наступны запіс: «Касцёл новазбудаваны, драўляны, пабудаваны коштам мясцовага дэкана – ксяндза Ігната

---

36 Narbutt T. Cokolwiek z historyi miasta Lidy. S. 3–5.
37 Руская историческая библиотека. Т. 20. Петербург, 1903. С. 920–922.

Рэберта, асвечаны пад час знаходжання візітатара»[38]. З дрэва гэтага касцёла потым будзе пабудавана ўніяцкая царква Ўваскрасення Гасподняга на Зарэччы.

Цікавай з'яўляецца інфармацыя Тэадора Нарбута, пра тое, што ксёндз Міхаіл Зянкевіч, які быў лідскім пробашчам у 1747 г., а потым стаў віленскім біскупам, пабудаваў гэты перадапошні фарны касцёл там, «дзе зараз пляц перад Домам Скарбовай касы»[39]. Тэадор Нарбут верагодна ведаў і размаўляў з асобамі, якія сваімі вачамі бачылі той стары драўляны касцёл, і таму няма прычын сумнявацца ў гэтай інфармацыі. Растлумачу, што месца, на якім стаяў гэты драўляны касцёл, знаходзіцца ў некалькіх дзесятках метраў у напрамку на паўднёвы захад ад сучаснага помніка Гэдыміну. Зразумела, што яшчэ да моманту пабудовы сучаснага мураванага фарнага касцёла, падчас існавання ўсіх папярэдніх драўляных фарных касцёлаў, вакол іх заўсёды былі могілкі. Але падчас шматлікіх земляных работ на поўнач ад замка, каля сучаснага помніка Гэдыміну, не знаходзілі чалавечых парэштказў. Адзінае тлумачэнне гэтага, пры тым, што касцельны пляц папярэдняга фарнага касцёла нейкі час уключаў у сябе не толькі сучасны касцельны пляц (на якім шмат чалавечых парэшкаў), але і тэрыторыю падзамча, аднак нябожчыкаў заўсёды хавалі прыкладна на тэрыторыі сучаснага пляца мураванага фарнага касцёла. Гэта значыць, што ўсе папярэднія драўляныя касцёлы стаялі недзе недалёка ад сучаснага фарнага касцёла, і толькі драўляны касцёл, пабудаваны каля 1670 г., стаяў бліжэй да замка.

У другой палове XVIII ст. у Лідзе, верагодна па праекту віленскага архітэктара Глаўбіца, ў стылі барока з цэглы

[38] Kurczewski Jan. Stan kosciolow parafialnych w djecezji wilenskiej po najaciu nieprzyjacielskiem 1655–1661 r. // Litwa i Rus. Luty, 1912. T.1. Zeszut II. S. 122.
[39] Narbutt T. Cokolwiek z historyi miasta Lidy. S. 1.

быў пабудаваны фарны касцёл Узвіжання Святога Крыжа, які дзейнічае да нашага часу[40]. Пад прэзбітэрыюмам[41] новага касцёла, у яго скляпеннях былі падрыхтаваны месцы для пахаванняў больш заможных парафіянаў.

Тэадора Манчунская – дачка нашага знакамітага гісторыка Тэадора Нарбута, згадвала цікавы эпізод з юнацтва свайго бацькі ў Лідзе: «Ліда запомнілася яму як наша павятовае мястэчка – [...] гэты горад займаў сваё месца ў гісторыі нашай сям'і, бо там стаіць касцёл фундацыі Нарбутаў[42]. Калі бацька быў малады, ён прыходзіў у госці да ксяндза-апата Нарбута[43]. Ксёндз любіў паразмаўляць, а людзі шмат казалі пра яго грошы [...]. Засталася ў маёй памяці гісторыя, якую бацька расказваў пра Ліду: "Пасля смерці ксяндза-апата, усе казалі, што ён недзе закапаў бочкі з золатам, і таму яго маладыя пляменнікі, між імі і я, шукалі бочкі па схованках". Тэадор спыніўся на думцы, што клад можа быць схаваны ў склепе пад касцёлам. Быў парушаны апошні прытулак памерлых, і адзін з нябожчыкаў, пругкі і лёгкі, скочыў Тэадору на грудзі. "У мяне перахапіла дух", – казаў бацька, але потым, агледзеўшыся, ён зразумеў, што "высахшы, як трэска нябожчык, вельмі лёгкі і цвёрды, паўстаў перада мной, як струна, калі я наступіў на яго стапу". Аказалася, што тутэйшае паветра і сухая зямля ўтрымлівае ўсе целы нябожчыкаў у падоб-

---

40 Кулагін А. М. Каталіцкія храмы на Беларусі: энцыклапедычны даведнік. Мінск, 2000. С. 86; Rouba N. Przewodnik po Litwie i Bialej Rusi. Wilna, 1909. S.107–109.

41 Прэзбітэрый ці прэзбітэрыюм – («месца для выбраных», ад старагрэчаскага «сход святароў») частка каталіцкага храма між асноўным аб'ёмам і алтарнай апсідай, прызначаная для царкоўнага кліра.

42 Маецца на ўвазе касцёл кармелітаў.

43 Даніэль Казімір Нарбут (?1738 – 1807) з 1783 па 1801 г. быў лідскім дэканам і пробашчам, у 1801 г. гэту пасаду заняў кс. Вінцэнты Нарбут. Бацька Даніэля Казіміра Нарбута – Казімір Нарбут быў прадзедам Тэдора Нарбута, а дзед Тэадора Ігнацы – родным братам Даніэля Казіміра Нарбута, такім чынам Тэадор быў яго ўнучатым пляменнікам.

ным стане. Гэтым здарэннем закончыліся пошукі. Золата не знайшлі, ... але страху нацярпеліся. Дух апата вартаваў сваё золата і не жадаў, каб нехта з сваякоў яго знайшоў»[44].

У 1846 г. парэшткі памерлых з гэтага склепа былі перапахаваны ў зямлю[45], на старых гарадскіх могілках.

Касцёл агароджвала мураваная сцяна, знутры якой знаходзіліся могілкі для простых парафіян[46]. У візітацыі 1777 г. пра гэтыя могілкі пісалі так: «Могілкі каля касцёла цалкам агароджаны мурам, прасторныя. Ад вуліцы агароджа пабудавана за кошт ягамосцяў фундатараў, астатнія муры – коштам ксяндза-пробашча. Пабудова мура цалкам не закончаная, не дабудавана палова стаі[47]. На заканчэнне агароджы ўжо назапашана цэгла, і вясной будоўля можа быць закончана. Брама з могілак на вуліцу крытая бляхай, пабудаваная ягамосцямі фундатарамі. Дзверы ў браме на жалезных завесах, ушчыльненне дзвярэй упала, бо было без жалезных цвікоў. У браме двое малых дзвярэй на завесах, з клямкамі і зашчапкамі. Ад бабінца[48] праз браму ажно да вуліцы намаганнямі ... пробашча дарога забрукавана»[49].

На гэтых могілках у 1794 г. былі пахаваныя паўстанцы Тадэвуша Касцюшкі – пра гэта меўся запіс у метрычных актах Лідскага касцёла за 1794 г.: «Усе забітыя падчас аблогі

---

44 ДГАЛ. Ф. 1135. Воп. 11. Спр. 19. Арк. 22 – 23.

45 Інвентарны вопіс Лідскага рымска-каталіцкага касцёла і бенефіцыі // Лідскі летапісец. 2002. № 2(18). С. 9.

46 Pyzel K. Kosciol parafialny p.w. Podwyzszenia krzyza Sw. w Lidzie // Koscioly i klasztory rzymskokatolickie dawnego wojewodztwa wilenskiego. Krakow, 2008. T. 2., cz. III. S. 103.

47 Стая (staja, staje) – мера даўжыні, найчасцей каля 200 м.

48 Бабінец – пярэдняя частка культавага збудавання, прызначаная для жанчын, з’яўляўся часткаю асноўнага аб’ёму пад хорамі. Часам бабінцам называлі прыбудову да храма з боку галоўнага фасада.

49 Opis i inwentarz kosciola farnego w Lidze z r. 1777 // Koscioly i klasztory rzymskokatolickie dawnego wojewodztwa wilenskiego. Krakow, 2008. T. 2., cz. III. S. 126.

рускімі войскамі г. Ліды пахаваны ў горадзе ў межах касцельнай агароджы»[50].

Пры канцы XIX ст. у сваіх успамінах Ян Сегень пісаў: «З правага боку вул. Віленскай, як раз насупраць гатэля, стаіць парафіяльны касцёл, могілкі і пладовы сад...»[51].

Другія рыма-каталіцкія могілкі існавалі каля кляштара і касцёла кармелітаў. Мураваныя кляштар і касцёл пры ім знаходзіліся ў цэнтры горада на адлеглясці ў 108 крокаў ад фарнага касцёла, на супрацьлеглым баку вуліцы. На невялікіх могілках, якія межавалі з кляштарным дзядзінцам, стаяла званіца. У 1829 г. была пабудаваная новая званіца, якая стаяла на чатырох дубовых слупах і мела тры званы[52].

Зараз прыкладна там, дзе стаяў карміліцкі кляштар, знаходзіцца будынак музычнага каледжа, а на тым месцы, дзе быў касцёл кармелітаў, праходзіць паўднёвая частка (паласа) праезджай вуліцы Ленінскай. У гэтым месцы, пры пракладцы камунікацый, неаднаразова знаходзілі парэшткі людзей, што не дзіва, бо мы добра ведаем, што як і належала ў той час, вакол касцёла кармелітаў меліся могілкі.

Захаваліся тастаменты тых, хто жадаў быць тут пахаваным. Напрыклад, 20.09.1804 г. лідскім ротмістрам Каралем Янушам Жамойцелем у судзе быў прадстаўлены тастамент Эліяша Хруля, напісаны ў 1712 г. У тастаменце Эліяш Хруль прасіў «... пахаваць яго ў лідскіх кармелітаў, для гэтага даю 500 злотых, на імшу даю 5 талераў»[53]. Эліяш

---

50 Шымялевіч Міхал. Збор твораў. С. 30. (зноска № 62.)

51 Ян Сегень. Успаміны пра Ліду канца XIX стагоддзя // Лідскі летапісец. 2001. № 12. С. 17.

52 Pyzel Konrad. Kosciol p.w. Najsw. Marii Panny i Sw. Alberta oraz klasztor karmelitow trzewiczkowych w Lidzie // Koscioly i klasztory rzymskokatolickie dawnego wojewodztwa wilenskiego. Krakow, 2008. T. 2., cz. III. S. 172–173.

53 НГАБ. Ф. 1722. Воп. 1. Спр. 19. (Актовая книга Лидского гродского суда 1803–1802 гг.) С. 765–766.

Хруль – прамы продак аўтаркі гэтай кнігі Галіны Лаўрэш з Хрулёў.

Таксама вядома, што лідскі маршалак Міхал Александровіч «спачывае ў Лідзе, каля касцёла ксяндзоў-кармелітаў у склепе, які вымураваў для сябе». Міхал Ян Александровіч герба Косы быў ўладальнікам Касцянёва, згодна з Урускім «муж шляхетны і праведны, не было ў павеце такіх праблем, якімі бы ён не займаўся». Калі шведы наклалі на павет кантрыбуцыю і з-за ваеннага спусташэння землеўладальнікі не маглі яе выплаціць, ён заплаціў кантрыбуцыю гатоўкай, якую дастаў з сваёй шкатулкі, гэта пры тым, што і яго маёмасць была знішчана[54].

У 1908 г. кармеліцкі касцёл быў разабраны, хоць касцельныя муры ўсё яшчэ стаялі да ўзроўню даха. Цэгла выкарыстоўвалася для будаўніцтва казарм Паўночнага вайсковага гарадка. У тым жа 1908 г. кляштар занялі вайскоўцы. Пад час нямецкай акупацыі ў будынку былога кляштара месціўся жаўнерскі клуб, а з 1927 г. тут размясцілася староства Лідскага павета[55].

Ужо ў 1929 г. пры рэканструкцыі электроўні і будаўніцтве новых размеркавальных электрычных сетак, лідскі пробашч забараніў будаваць новы трансфарматарны пункт і весці земляныя работы на месцы былых кармеліцкіх могілак. Прэса паведамляла: «Пробашч Лідскай парафіі кс.-дэкан Баярунец напісаў пану ваяводзе пратэст супраць планаў будоўлі трансфарматарнага пункта на пляцы, дзе раней месціўся касцёл кармелітаў і могілкі каля касцёла – каля сучаснага будынка Лідскага староства»[56]. Як бачна з фотаздымкаў канца 1930-х гг., улады прыслухаліся да мер-

[54] Herbarz polski Kaspra Niesieckiego. T. 2. 1839. S. 23.
[55] Pyzel Konrad. Kosciol p.w. Najsw. Marii Panny i Sw. Alberta oraz klasztor karmelitow trzewiczkowych w Lidzie // Koscioly i klasztory rzymskokatolickie dawnego wojewodztwa wilenskiego. Krakow, 2008. T. 2., cz. III. S. 173.
[56] Życie Nowogródzkie. №282(639), 15 października 1929.

каванняў ксяндза, бо той самы трансфарматарны пункт 6/0,4 кВ быў пабудаваны на вуліцы Сувальскай насупраць староства (прыкладна, праз вуліцу ад сённяшняга помніка Скарыну).

На пачатку верасня 1937 г. падчас установкі фундамента пад кіёск Таварыства падтрымкі супрацьпаветранай абароны (LOPP) на плошчы Збаўцы былі знойдзены падмуркі былога касцёла кармелітаў[57]. Пры канцы верасня «Кур'ер Віленскі» пісаў: «Зноў натрапілі на сляды могілак у цэнтры горада. Нядаўна пры пракладцы каналізацыі на вуліцы 3-га Мая каля гмаха староства (былога будынка кляштара) знойдзены косткі людзей. Зараз зноў пры капанні равоў і ўкладцы трубаў для тэлеграфных кабеляў да новага будынка пошты ў некалькіх месцах па вуліцы Сувальскай знойдзены людскія косткі. З гэтага вынікае, што ў самым цэнтры горада, на перакрыжаванні вуліц 3-га Мая і Сувальскай існавалі старыя могілкі»[58]. Гэта былі могілкі кляштара кармелітаў.

Пасля 1945 г. тут неаднаразова вяліся земляная работы пры пракладцы і рамонтах падземных камунікацый і таксама часта знаходзіліся парэшткі людзей.

Пры дабудове да сучаснага музычнага каледжа памяшкання спартыўнай залы былі ўскрыты магутныя лёхі былога кляштара са скляпеністай столлю – старая Ліда чарговы раз нагадала пра сябе[59] і ёсць надзея, што падмуркі цікавейшага лідскага гмаха XVIII ст. захаваліся.

Каардынаты касцёла кармелітаў – 53°53'24.7"N 25°18'08.2"E

Каардынаты кляштара кармелітаў – 53°53'23.0"N 25°18'06.9"E

---

57 Słowo. № 247(4811), 7 września 1937.

58 Kurjer Wilenski. № 269(4230), 30 września 1937.

59 Гл: Лаўрэш Л. Л. Шпацыры па старой Лідзе. Гродна, 2020. С. 92–97.

# Яўрэйскія могілкі

Яўрэі пасяліліся ў Лідзе ў XVI стагоддзі.

Кароль Стэфан Баторы ў 1579 г. выдаў лідскім яўрэям прывілей на права пабудовы новай сінагогі і рамонт старой, аднак з умовай, каб новая сінагога не была вышэйшай за касцёл і цэрквы.

Упершыню лідскі кагал згадваецца ў 1623 г., у гэты год ён быў падпарадкаваны гродзенскаму. Да таго ж часу належыць і перапіска паміж лідскім кагалам і суседнімі яўрэйскімі супольнасцямі.

Зразумела, што як толькі ў горадзе з'явілася яўрэйскае насельніцтва, дык акрамя сінагогі, з'явіліся і яўрэйскія могілкі. Прэса ў сакавіку 2009 г. пісала пра цікавыя знаходкі на былых лідскіх яўрэйскіх могілках, якія дазваляюць датаваць гэты аб'ект канцом XVI ст. «Падчас пракладкі кабея сувязі ў горадзе Ліда, рабочыя знайшлі яўрэйскую магілу з помнікам 1872 г. Яўрэйскія могілкі знаходзяцца ў цэнтры Ліды, але былі разбураны савецкай уладай, каб зрабіць жылыя дамы. Сёння надмагіллі і парэшткі часта знаходзяцца падчас будаўніцтва. Некалькі гадоў таму былі выяўлены два надмагіллі, датаваныя 1605 г. Яны былі дададзены да існага мемарыяла Халакосту. Рабін Іцхак Кофман з Гродна разам з чальцамі яўрэйскай грамады перапахавалі парэшткі, знойдзеныя нядаўна ...»[60].

---

[60] «While laying communication cables in the city of Lida, workers discovered what was later determined to be a Jewish grave dating back to 1872....A Jewish cemetery was once located in the center of Lida, but in the [1950s] it was destroyed by the Soviet government to make room for housing. Today, gravestones and human remains are frequently uncovered during construction projects. Several years ago, two headstones dating from the year 1605 were discovered, and were subsequently added to an existing Holocaust memorial. Rabbi Yitzchak Kofman of nearby Grodno together with members of Jewish community reburied the recently discovered remains ... The original gravestone, which was discovered on Saturday, will remain where it was found to serve as a memorial to the Jewish cemetery that once existed there.» [March 2009] Гл: http://www.iajgsjewishcemeteryproject.org/belarus/lida.html

На плане горада 1842 г. гэтыя могілкі займаюць каля двух гектараў і бачна што планавалася пашырэнне тэрыторыі. Тут меліся надмагіллі рознай вышыні, сустракаліся таксама і наземныя вялікія цагляныя пахавальні з трохвугольным дахам і плітамі з эпітафіяй, якія прымацоўваліся да сцяны. Сёння нам цяжка цалкам уявіць сабе, як выглядалі яўрэйскія могілкі ў Лідзе, бо захавалася толькі некалькі здымкаў з выявамі мацэваў (мацэва – назоў яўрэйскага надмагілля). Але, думаю, што ўсе ж будзе цікава, нават у самым агульным выглядзе, даведацца пра некаторыя асаблівасці.

Згодна з яўрэйскай традыцыяй могілкі павінны знаходзіцца па-за межамі паселішча. Таму, калі яўрэйская абшчына купляла зямлю для могілак, дык звычайна гэта былі самыя танныя пляцы. Адпаведна, калі паселішча разрасталася, могілкі аказваліся на яго ўскраінах.

Некалькі слоў пра сімволіку, якую можна было ўбачыць на мацэвах.

Першае, што чакаеш убачыць на яўрэйскіх надмагільных помніках – гэта зорка Давіда. Але на мацэвах яна з'яўляецца ўжо дастаткова позна, недзе ў канцы XIX ст., пасля з'яўлення сіяніcцкага руху і станаўленнем палітычнай яўрэйскай нацыі.

Вельмі распаўсюджанай сімволікай мацэваў з'яўляліся ільвы. Гэта сімволіка была папулярнай, бо яшчэ са Старога Запавету (ці з Танаха) вядома, што Іерусалімскі храм упрыгожваўся ільвамі, быкамі і херувімамі. Таму гэтыя выявы ахвотна выкарыстоўвалі ў афармленні сінагог, а пазней і надмагілляў. Звычайна, калі на мацэве мелася выява ільва, гэта казала пра тое, што тут пахаваны чалавек, які меў імя, падобнае да яўрэйскіх варыянтаў слова леў – Лейба, Ар'е ці Іегуда.

Таксама можна было пабачыць і надмагіллі з аленямі, якія адпавядалі частаму сярод яўрэяў імю Гірш, ці інакш Цві. Выява птушкі на надмагіллі адпавядала пахаванню жанчыны, пры гэтым яна магла мець імя Фейга, а птушка голуб адпавядала імя Ёне. Іншы жаночы атрыбут – сямісвечнік. Гэта звязана з традыцыяй, па якой гаспадыня запальвала свечкі на захадзе сонца ў пятніцу, калі рыхталася сустракаць шабат.

На мацэвах асоб з саслоўя коэнаў (ці коганаў), якія вялі сваю генеалогію ад Абрагама, былі святарамі і мелі высокі сацыяльны статус, можна было ўбачыць выявы дзвюх рук з па-асабліваму складзенымі пальцамі (па два) – знакам рытуальнага блаславення.  На мацэвах левітаў – нашчадкаў роду Леві, якія традыцыйна дапамагалі пры богаслужэнні, напрыклад, падносілі коэну збан з вадой для рытуальнага абмывання рук, можна было ўбачыць выяву збана.

На мацэвах можна было сустрэць сімвал зламанай галіны або зламанай кроны дрэва.  Зразумела, што гэта выява страты, трагедыі завяршэння жыцця, а ў выпадку са зламанай галінай – смерці блізкага ў сям'і. Надмагіллі ў форме камля дрэва з абсечанымі сукамі добра вядомы і на хрысціянскіх могілках і цікава, што яны былі папулярнымі і ў яўрэяў.

Ну і некалькі слоў пра надпісы на мацэвах.

Найбольш характэрнай адзнакай большасці мацэў трэба лічыць дзве літары яўрэйскага алфавіту, «пэ» і «нун» (נ פ), якія абазначаюць «тут пахаваны».  Ад мацэвы да мацэвы паўтараліся адны і тыя ж фразы, і адхіленні ў тэкстах сустракаліся параўнальна рэдка. Спачатку ішла названая ўжо формула з двух літар, часам замест гэтых літар быў надпіс – «тут магіла». Далей – стандартная характарыстыка нябожчыка. Напрыклад, у жанчын – «жанчына сціплая, гаспадарлівая», далей падавалася імя і пазначала-

ся: «дачка такога та». Потым ішла дата смерці па яўрэйскім летазлічэнні. Нарэшце, усё завяршалася абавязковай фразай: «Няхай будзе душа яго (яе) завязана ў вузел жыцця». Часцей за ўсё гэта фраза пісалася толькі першымі літарамі адпаведных слоў.

На Дзяды 2023 г. аўтары кнігі з найвялікшай цікавасцю разглядалі сімволіку нагробкаў на яўрэйскай частцы могілак на Павонзках, што ў Варшаве.

Яўрэйскі пахавальны абрад цалкам адрозніваўся ад хрысціянскага. Нябожчыка зашывалі ў белы саван, пасля чаго цела, акружанае свечкамі, ляжала на падлозе. Вакол нябожчыка, таксама на падлозе, сядзелі сваякі. У дзень пахавання, чалавек з пахавальнага таварыства ішоў па вуліцах горада і манатоннымі воклічамі запрашаў гараджан да ўдзелу ў пахаванні. Цела апускалася на насілкі, і чацвёра мужчын неслі насілкі да могілак. Жанчыны пры гэтым енчылі, крычалі і галасілі. Нябожчыка хавалі не ў труне, а ў адмысловай агароджы, збітай з дошак. Каб нябожчыку было лягчэй падняцца падчас з'яўлення месіі, на цела клалі чарапкі і хваёвыя галінкі. Пасля пахавання памінак не было, але блізкія сваякі сядзелі 7 дзён на падлозе, не галіліся, не мыліся, а сын або іншы малодшы мужчына чытаў кадэш (памінальную малітву)[61].

Трэба адзначыць традыцыйны яўрэйскі прынцып «магілы непарушныя». Гэта значыць, што парэшткі памерлых павінны назаўсёды застацца ў тым месцы, дзе былі пахаваны. Адзін з самых страшных яўрэйскіх праклёнаў гучыць так: «Няхай зямля выкіне твае косткі!». Хрысціянскае ж разуменне дазваляе парушаць існыя пахаванні пасля пэўнага часу. Хрысціянскія могілкі, якія не

[61] Мирон Мордухович. Местечко Желудок // Желудок: память о еврейском местечке. Москва, 2013. С. 275.

выкарыстоўваецца на працягу доўгага часу, могуць быць ліквідаваны. Згодна з прынцыпам юдаізму кожнае надмагілле і ўсе могілкі недатыкальныя да таго часу, пакуль жыве памяць пра могілкі. Выключэннем можа быць выпадак, калі эксгумацыя робіцца для пераносу парэшткаў на Святую Зямлю альбо ў сямейную магілу, для пераносу парэшткаў з неяўрэйскіх могілак ці ў выпадку, калі могілкам пагражае прафанацыя альбо падмыў вадой.

Вось як апісаў яўрэйскія могілкі і дарогу да іх з боку тагачаснай вуліцы Пастаўскай (зараз гэта ўсходняя частка вуліцы 8-га Сакавіка і паўночная частка вуліцы Фрунзе) лідзянін Юзаф Кардаш: «У глыбіні, за крамай, знаходзіліся гараж і вежа пажарнай стражы. Шкада было гэтых бедных механікаў, якія адказвалі за тэхнічны стан пажарнай тэхнікі ... і бясконца рамантавалі старога спрацаванага «Шэўрале». Адсюль управа адыходзіла вуліца Пастаўская. На рагу Пастаўскай і Сувальскай стаяў дастаткова вялікі мураваны будынак – яўрэйскі шпіталь, пабудаваны ў 1898 г. Згарэў ён 23 чэрвеня 1941 г. ... Крочым па вуліцы Пастаўскай. З правага боку мелася брама на яўрэйскія могілкі. Ад паловы вуліцы Пастаўскай у левы бок адыходзіла вуліца Халодная. Перад вайной тут стаяла малая крама яўрэя Шмуйлы, дзе можна было купіць усе: хлеб, булку, селядцы, запалкі, мыла, газу, змазку для воза і г. д. Насупраць крамы ... была бачна вялікая брама тартака і млына»[62].

Лідскія яўрэйскія могілкі пачалі разбурацца з 1941 года. Былы жыхар Ліды І. Рубіновіч успамінаў: «Адразу пасля акупацыі горада Ліды немцамі пачалася ліквідацыя яўрэйскіх могілак. Сяляне пачалі пасвіць тут сваіх кароў, а потым пачалося разбурэнне надмагілляў. Іх вывозілі для гаспадарчых мэтаў. Так працягвалася і пасля вайны

[62] Kordasz Józef. Lida Prawdziwa. Olsztyn. 1997. S. 45.

... У сярэдзіне 1950-х гадоў гарадскі савет забараніў некалькім яўрэйскім сем'ям, якія жылі ў Лідзе, хаваць сваіх нябожчыкаў на гэтых старых могілках. У якасці альтэрнатывы яны маглі хаваць сваіх нябожчыкаў у горадзе Іўе. У 1960-х гадах у Лідзе пачалася хуткая ліквідацыя яўрэйскіх могілак. Першай была разбурана частка бліжэйшая да берага Лідзейкі. Тут, на беразе штучнага возера, былі пабудаваныя розныя канструкцыі і памяшканні для лодак, катэраў і персаналу... Пасля гэтага была разбураная частка магілах, якія межавалі з былой вуліцай Пастаўскай, тут зламалі магільныя пліты, якія ўсё яшчэ заставаліся. Усё гэта было зроблена, нягледзячы на пратэсты яўрэяў, якія да гэтага часу жылі ў горадзе. Многія чалавечыя косці былі раскіданыя па паверхні зямлі. Яўрэі сабралі іх у мяшкі і закапалі на частцы могілак, якая яшчэ захоўвалася ў той час. Пры канцы студзеня 1966 года толькі ў цэнтры могілак засталіся некалькі надмагілляў – яны былі знішчаны пазней. Такім чынам, апошнія сляды, якія сведчылі пра існаванне вялікай і квітнеючай яўрэйскай супольнасці ў горадзе Ліда былі разбураны і знішчаны»[63].

Да 1960-х гадоў яўрэйскія могілкі месціліся каля сучаснай вуліцы Фрунзе.

Лідзянка Ларыса Канчэўская ўспаміналa: «Возера ў канцы вуліцы Міцкевіча «стварылі» ў 1962 годзе. Паставілі плаціну і загаварылі пра «Лідскае мора». Падзея была не шараговая! Горад быў поўны азёраў, а купацца ўсур'ёз няма дзе. І вось, адбылося! З першымі цёплымі днямі народ накіраваўся на пляж, які быў завалены ... магільнымі плітамі яўрэйскіх могілак, што знаходзіліся здаўна на беразе Лідзейкі і ёю ж затопленыя... Вельмі проста загаралі на замшэлых плітах з экзатычнымі старажытнымі піс-

[63] Rubinovitch I. Liquidation of the Jewish cemetery // Sefer Lida. Tel Aviv, 1970. P. 384.

мёнамі. І гэта цягнулася даволі доўга: гадоў пяць, калі не даўжэй. Атэізм і вайна надоўга зрабілі людзей неадчувальнымі да сакральных рэчаў быцця, і таму яны не задумваліся аб рознага роду блюзнерствах»[64].

Зараз на заходняй тэрыторыі яўрэйскіх могілак пабудаваны жылыя дамы, усходняя частка знаходзіцца на дне вадасховішча. Але яшчэ не так даўно, па вуліцы Свярдлова, тратуар якой вымашчаны каменем, можна было ўбачыць надмагіллі з надпісамі на іўрыце.




*Яўрэйскі пахавальны абрад у Лідзе, каля 1916 г.*

[64] Канчэўская Ларыса. Маленькая аповесць пра любоў // Ад Лідскіх муроў. 2015. № 8. С. 269.






*Лідскія яўрэйскія могілкі, каля 1916 г.*




*Пахаванне паважанага яўрэя. Рынкавая плошча Ліды, каля 1916 г.*



*Лідскія яўрэйскія могілкі, малюнак 1917 г.*

# Вайсковыя могілкі

У 1916 г. немцы заснавалі адмысловыя ваенныя могілкі недалёка ад Паўночнага вайсковага гарадка (зараз – каля СШ № 6). Могілкі былі агароджаныя невысокім мурам. Па правым баку знаходзіліся магілы нямецкіх і аўстрыйскіх жаўнераў, па левым – расійскіх, парэшткі якіх сабралі па палях пасля заканчэння баёў вакол Ліды. На магілах расійскіх жаўнераў меліся надпісы: «Невядомы жаўнер расійскай арміі» ці проста «Невядомы». Цікава, што асобна былі пахаваны чэхі – жаўнеры аўстра-венгерскай арміі і палякі – жаўнеры нямецкай арміі. У канцы могілак з паўднёвага боку недалёка ад выязной брамы знаходзіўся прыгожы помнік часоў Першай сусветнай вайны. Помнік быў у форме піраміды, якая, як пісаў у 1936 г. Аляксандр Снежка, «.. пабудавана з пэўным мастацкім густам з вялікіх груба абчасаных камянёў. Ля падножжа піраміды ляжыць паміраючы жаўнер[65], адліты з жалеза, пад ім выразаны надпіс "Fur das Vaterland"»[66] («За Бацькаўшчыну»).

У 1919–1920 гг. на гэтых жа могілках былі пахаваны салдаты польскай арміі: Сувальскага пяхотнага палка, 4-га і 11-га ўланскіх палкоў (1919 г.), 1-й дывізіі легіёнаў (1920 г.). На магілах былі пастаўлены цэментныя крыжы з надпісамі: «Невядомы жаўнер Воиска Польскага» без даты нараджэння і смерці. У адным з вуглоў могілак стаяў адзінокі цэментны крыж з надпісам: «Невядомы салдат бальшавіцкай арміі». Хавалі польскіх жаўнераў тут і ў міжваенны час[67].

[65] Гэты жаўнер быў падобны на рыцара, гл. у дадатках «Легенда пра рыцара».
[66] Aleksander Śnieżko. Lidzki cmentarz wojenny // Ziemia Lidzka. 1936. №8.
[67] Kuwalek Robert. Nieistniejancy Nieistniejący cmentarz wojskowy w Lidzie. // Ziemia Lidzka. 1994. №15.

У 1924 г. тут была пабудавана невялікая капліца ў закапанскім стылі. У капліцу на набажэнствы, якія праводзіў капелан 77 палка ксёндз Шабельскі, прыходзілі не толькі польскія вайскоўцы, але і жыхары бліжніх раёнаў горада. Праіснавала капліца нядоўга. Яна прыйшла ў заняпад і была разбурана. На жаль, інфармацыі пра яе не шмат, але вядома, што ў лютым 1925 г. старшы капелан, ксёндз Юзаф Бяляўскі праз газету «Слова» падзякаваў усім, хто 31 студзеня прычыніўся да папаўнення касы будаўніцтва гэтай капліцы, а перад усім «гурток непрацуючых гаспадынь ... пані Шукевіч, Здановіч (старасціна), Сестранцэвіч (інжынярова), Рашкоўскую, Фэглер (прафесарова), Юрагу, Зямкову (капітанова), Мярвінскую (інжынярова), панну Ядвігу Шкоп, пані Гарлінскую (капітанова), Рашкевіч (інжынярова), Скавінскую, Грэб, Чаславу Мейлун, Баркоўскую, дзякуючы якім была арганізавана імпрэза, якая прынесла ў скарбонку будаўніцтва капліцы 634 зл. і 6 гр.»[68].

25 мая 1924 г. Ліду наведаў прэзідэнт Польшчы Станіслаў Вайцяхоўскі. «У 9 гадзін раніцы цягнік прэзідэнта спыніўся ў Лідзе. На ўпрыгожаным пероне высокага госця сустракалі старшыня грамадскага камітэта і прадстаўнік Звязу землеўласнікаў князь Людвік Чацвярцінскі, прадстаўнікі гараджан разам з каталіцкім, праваслаўным і яўрэйскім духавенствам. Пасля сустрэчы на вакзале прэзідэнт у суправаджэнні коннага экскорта паехаў у горад. Прэзідэнт прыняў шэраг дэлегацый і наведаў казармы 77 палка пяхоты, дзе прыняў удзел у ганаровым адкрыцці помніка загінуўшым жаўнерам 77 палка. Помнік у выглядзе калоны быў пабудаваны па праекце падпалкоўніка Сестраневіча». У спісе загінуўшых былі прозвішчы 12 афіцэраў: капітана Аляксандра Хацэя, паручнікаў Мар’яна

[68] Słowo. № 37 (751), 14 lutego 1925.

Лясковіча, Цэзары Халецкага, 7 падпаручнікаў, 2 харунжых і 174 жаўнераў дзесяці пяхотных, трох кулямётных, штабной і тэхнічнай ротаў[69].

У 1920-х гг. могілкі былі павялічаны, і тут, у асобнай агароджанай зоне хавалі памерлых жаўнераў 77-га пяхотнага палка і цывільных асобаў, якія жылі на Кашарах (Казармах. – Л. Л.). У 1939–1941 гг. на могілках былі пахаваны некалькі салдатаў Чырвонай Арміі. У 1941–1944 гг. могілкі зноў сталі месцам пахаванняў нямецкіх салдат, якія загінулі пад Лідай ці памерлых у шпіталях[70].

У 2015 г. мы атрымалі па электроннай пошце цікавыя ўспаміны старажыла нашага горада Яна Рацько (1927 г. н.) з Чанстахова, запісаныя ягонай ўнучкай. Ян Рацько да 25 верасня 1959 г. жыў у Лідзе па вуліцы Крупаўскай, 78. З-за каштоўнасці інфармацыі падаем вялікі ўрывак з ягонага тэксту:

«Вайсковыя могілкі знаходзіліся каля нашага дома, памятаю, як яны выглядалі да вайны і да 1959 г., калі я выехаў у Польшчу. Гэтымі ўспамінамі хачу падзяліцца з людзьмі, лідзянамі, якія, можа быць, гэтага не памятаюць.

Дык вось, як вядома старым лідзянам, могілкі тыя знаходзіліся паміж старой жвіроўняй і казармамі – з аднаго боку, з другога боку была вуліца Рыдз-Сміглага, хоць могілкі і не даходзілі да вуліцы. Іншыя бакі могілак абмяжоўваліся вуліцамі Кашаровай і ксяндза Скарупкі.

Да прыходу ў Ліду бальшавікоў у верасні 1939 г. могілкі выконвалі сваю ролю. Тут былі пахаваны жаўнеры Першай сусветнай і польска-бальшавіцкай вайны. Тут жа меліся магілы немцаў, аўстрыйцаў, чэхаў, палякаў, рускіх, у пазнейшыя часы тут хавалі сем’і польскіх афіцэраў і жаўнераў,

---

[69] Słowo. № 119 (536), 27 maja 1924.

[70] Kuwalek Robert. Nieistniejancy Nieistniejący cmentarz wojskowy w Lidzie // Ziemia Lidzka. 1994. №15.

якія служылі ў 77 палку і жылі ў казармах. Да 19 верасня імі апекавалася польскае войска. За саветамі могілкамі ніхто не цікавіўся. 27 чэрвеня 1941 г. Ліду занялі немцы і ўзялі апеку над могілкамі. Яны ўпарадкавалі магілы, аднавілі жалезную браму, паправілі агароджу. Могілкі былі даведзены да ладу, і ўсталяваўся парадак. Кожны год, пакуль у Лідзе стаяла нямецкае войска, нямецкі аддзел прыходзіў сюды, каб выказаць пашану сваім палеглым. Гэта было ў кастрычніку ці ў лістападзе, дакладна не памятаю, але гэта было нейкае вайсковае свята.

Калі 20 ліпеня 1944 г. у Ліду увайшла Савецкая Армія, каля могілак усю зіму стаяла супрацьпаветраная артылерыйская батарэя. Каб перазімаваць, жаўнеры капалі бульбу. Зіма таго года была надта суровай. Калі скончыліся дровы, жаўнеры пачалі шукаць палівa, каб было чым абагрэць зямлянкі. На могілках стаяла каплічка ў закапанскім стылі, у якой раней адпраўляліся жалобныя імшы пры пахаваннях, а ў маі – маёвае набажэнства. Савецкія жаўнеры не задумваючыся, пачалі разбіраць гэту каплічку на паліва. Так знікла капліца на могілках. Магілы засталіся непарушанымі. Тут стаяў помнік – піраміда з рымскім жаўнерам. Такі стан рэчаў пратрымаўся да 1949 г. Раней шмат людзей добраахвотна ці пад прымусам выехалі ў Германію. Некаторыя пасля вайны вярталіся ў родны край. Сярод іх быў і нейкі Шымялевіч, жыхар вуліцы Кашаровай. Адной ноччу 1949 г. ён разбіў фігуру жаўнера і здаў на металалом. Сама піраміда стаяла да майго выезду ў 1959 г. У 1966 г. могілкі зраўнялі з зямлёй. На зямлі, якая непасрэдна прылягала да могілак, пабудавалі школу № 6, а там дзе былі магілы паўстала спартыўная пляцоўка і памяшканні школьных майстэрняў. Пра эксгумацыі ці перанос каменных крыжоў пры гэтым, я нічога не чуў.

І яшчэ трохі ўспамінаў датычных могілак: калі немцы ўпарадкавалі могілкі, яны адгарадзілі частку, на якой знаходзіліся магілы польскіх жаўнераў і членаў сямей вайскоўцаў, якія жылі ў казармах, калючым дротам.

Другая такая ж інфармацыя: на супрацьлеглым баку могілак, ад вуліцы кс. Скарупкі знаходзіўся вайсковы шпіталь. У часе ІІ-й Сусветнай вайны ў гэты шпіталь прывозілі параненых нямецкіх жаўнераў з фронту і тых, якія паміралі, хавалі каля агароджы могілак. Пры канцы 1943 г., калі стала зразумела, што Ліду ім прыйдзецца пакінуць, немцы пачалі выкопваць парэшткі пахаваных жаўнераў і вывозіць у Германію. Аднак вывезці ўсе парэшткі яны не паспелі. Уцякаючы з горада, немцы пакінулі некалькі трун у доле і нават не паспелі зноў засыпаць іх зямлёю. Пасля ўцёкаў немцаў, ніхто не засыпаў таго долу, і пах раскладаўшыхся целаў нейкі час даваўся ў знакі ваколічным жыхарам»[71].

Аддзел Народнага саюзу Германіі па нагляду за вайсковымі магіламі разам з жаўнерамі беларускага пошукавага батальёна ў 2006 і 2015 гг. эксгумавалі парэшткі нямецкіх жаўнераў Першай і Другой сусветных войнаў і перазахавалі іх на зборных нямецкіх вайсковых могілках каля горада Бяроза[72].

[71] З архіва аўтара.
[72] Лідская газета. 2015. 22 кастрычніка.



*Піраміда з скульптурай загінуўшага жаўнера.*



*Лідскія вайсковыя могілкі, каля 1916 г.*



*Лідскія вайсковыя могілкі, магіла Іагана Вальтара з Хокенхайма, каля 1917 г.*



*Дзеці каля піраміды на вайсковых могілках, 1930-я гг.*



*Пахаванне нямецкага жаўнера на вайсковых могілках у Лідзе, каля 1916 г.*

# Старыя праваслаўныя могілкі

Недзе з канца XVIII – да сярэдзіны XIX ст. старыя гарадскія могілкі па сучаснаму праспекту Перамогі (так званыя «каталіцкія») былі агульнымі, на іх хавалі хрысціян без падзелу на абрады ці канфесіі, бо ранейшых могілак каля цэркваў і касцёлаў ужо не было.

З ліста мітрапаліта Сямашкі да обер-пракурора Сінода ад 13 студзеня 1848 г. даведваемся, што да скасавання ўніі, нябожчыкаў-уніятаў можна было хаваць на рыма-каталіцкіх могілках, і наадварот, нябожчыкаў – рыма-каталікаў пры неабходнасці ці мэтазгоднасці, можна было хаваць на ўніяцкіх могілках. Што не дзіўна, бо адрозненне паміж абодвума галінамі каталікоў было толькі ў абрадах – заходні (рымскі) і ўсходні (грэцкі) абрады[73]. «Гэта часткова працягваецца і ... [зараз] ... . Віленская [рыма-каталіцкая] кансісторыя ў чэрвені мінулага года загадала без усялякіх спрэчак хаваць праваслаўных нябожчыкаў на рыма-каталіцкіх могілках ... покуль не адчыняцца праваслаўныя могілкі. Таму я лічыў бы карысным каб мясцовым цывільным начальнікам было загадана неадкладна ўладкаваць праваслаўныя могілкі там, дзе іх яшчэ няма»[74]. Як бачым, Сямашка прыспешваў адкрыццё асобных праваслаўных могілак і менавіта тады наш народ падзялілі нават і пасля смерці.

Міхал Шымялевіч пісаў, што праваслаўныя могілкі ў Лідзе з'явіліся каля 1865 г.[75], з чаго бачна, што могілкі з'явіліся раней, чым царква на іх, якая дарэчы будавалася, як капліца на могілках.

[73] Нагадаю, што да 80 % беларусаў належала да грэка-каталіцкай (уніяцкай) канфесіі, а на Лідчыне ўсе 100 %.
[74] Записки Иосифа Митрополита Литовского. Т. 2. Санктпетербург, 1883. С. 416–417.
[75] Szymielewicz Michał. W cmentarnej ciszy // Ziemia Lidzka. 1937. № 11.

Свята-Георгіеўская царква пабудаваная з дрэва ў 1875 г. на сродкі Антона Васнеўскага[76]. Прэса паведамляла: «25 кастрычніка, Лідскім дабрачынным асвечана новапабудаваная драўляная царква ў імя Вялікапакутніка Георгія на Лідскіх могілках. Царква каштуе 1878 руб. 62 кап., якія ахвяраваў аднадворац Антоні Васнеўскі.

Перад асвячэннем могілкавай царквы зроблены наступныя ахвяраванні:

- ад жонкі генерал-маёра Маўраса, Кацярыны Маўрас – 30 рублёў;

- ад судовага следчага Наўродскага-Апашанскага ядвабны ўбор на прастол, ядвабнае малінавае пакрывала на прастол, палатняныя сурвэткі на прастол, убор для ахвярнікаў і столік, разам на суму 60 рублёў;

- ад міравога пасрэдніка Фларыяна Лаўрыновіча абраз Іверскай Божай Маці ў кіёце і пазалочаным акладзе з меднай пазалочанай лампадкай, усё – 30 рублёў;

- ад судовага прыстава Сцепуржынскага лампадка за 8 руб;

- ад дзяцей нябожчыка Васнеўскага – будаўніка гэтай царквы, абраз Віленскіх пакутнікаў з лампадкай коштам 10 руб[77] (абраз прысутнічае ў царкве і сёння. – Л. Л.)».

Аднадворац – шляхціц які не змог пацвердзіць свае шляхецкае паходжанне. Гэта ўскосна пацвярджаецца іншай публікацыяй у «Літоўскіх Епархіяльных ведамасцях». «На праваслаўных могілках знаходзіцца невялікая, але вельмі прыгожая драўляная царква, пабудаваная ў 1875 г. за грошы, ахвяраваныя адным лідскім гараджанінам рыма-каталікам»[78]. Дадам, што ў 1842 г. Васнеўскія

[76] Литовские епархиальные ведомости (далей, ЛЕВ). 1887. № 43. С. 370.
[77] ЛЕВ. 1875. № 47. С. 391.
[78] ЛЕВ. 1887. № 43. С. 370.

валодалі маёмасцю ў Кір'янаўцах (Лідская парафія) і ў ваколіцы Ваўчкі (Жалудоцкая парафія)[79].

Рускі афіцэр Іван Любарскі, які да 1863 г. служыў у Лідзе, у сваіх белетрызаваных мемуарах некалькі разоў піша пра мясцовага чалавека, ардынатара вайсковага шпіталя ў Лідзе, доктара Гілярыя Васнеўскага, які максімальна лаяльна ставіўся да ўлады[80]. Успаміны Любарскага напісаны праз 30 гадоў пасля падзей, якія яны апісваюць, і таму аўтар мог памыліцца ў імені доктара. Таму, магчыма, што менавіта доктар Васнеўскі фундаваў гэтую царкву. Але, гэта толькі версія.

3–4 мая 1914 г. літоўскі архіепіскап Ціхан (будучы патрыярх Ціхан) наведаў горад Ліду. На другі дзень пасля службы ў царкве, «уладыка адправіўся ў царкву на могілках, агледзеў яе і здзейсніў кароткі малітваслоў на магіле нядаўна памёршай жонкі протаіерэя Каяловіча»[81].

Жыхар г. Ліды ў 1923 г. паведамляў у беларускай газеце «Новае Жыццё»: «Праваслаўных парахвіян Лідскае царквы налічваецца да 4000 чалавек, якія ... прымушаны сілай рэчаў маліцца ў невялічкай цэркаўцы-каплічцы на могілках, якая знаходзіцца ад цэнтра места, пры выезьде з Ліды, і ў ранейшыя часы была толькі месцам адпявання нябожчыкаў. Царква гэтая ніколі ў сьвяточныя дні, а асабліва ў такія сьвяты, як Каляды, Вялікдзень, ня можа змясціць і дзесятай часткі ўсіх, якія хочуць памаліцца»[82].

Мемуарыстка Яўгенія Ярмант пісала, што ў Лідзе ў 1930-я гг. была «маленькая праваслаўная царква на мо-

[79] Malewski Czesław. Rodziny szlacheckie na Litwie w XIX wieku. Powiaty lidzki, oszmiański i wileński. Warszawa, 2016. S. 213.
[80] Любарский И. В. В мятежном крае. (Из воспоминаний) // Исторический вестник. Март, 1895. С. 833; 834; 838.
[81] Первое обозрение Высокопреосвященным Тихоном Литовской епархии // Вестник Виленского православного Свято-Духовского братства. 1914. № 13. С. 293.
[82] Новае Жыццё. № 2, 10 сакавіка 1923.

гілках. У гэтую царкву з нашага дома трэба было ісці праз усю Сувальскую вуліцу. На могілкі ўваходзілі праз вялікія драўляныя вароты з разьбой блакітнага колеру. Ад варот, якія падчас службы былі адкрытымі, шырокая алея сярод высокіх дрэў на могілках вяла да самога храма. Уздоўж галоўнай алеі стаялі лаўкі, абапіраючыся на старыя металічныя магільныя агароджы. Старажытныя, шэрыя помнікі выглядалі велічна. Я не баялася гэтых магіл. Наадварот, любіла гуляць па алеі сярод іх.

Адразу за царквой знаходзіліся магілы бацькоў маёй мамы. Мама неяк прывяла нас сюды і патлумачыла хто ляжыць пад гэтым велізарным драўляным крыжам. Пазней мы заўсёды, калі прыходзілі ў царкву, ішлі да гэтых сціплых магіл. Царква была занадта малая, каб у нядзелю змясціць усіх вернікаў. Усярэдзіне было цесна, усе стаялі прыціснуўшыся адзін да аднаго, у кожнага было сваё звычайнае месца. Служба цягнулася да бясконцасці, таму некаторыя спецыяльна прыходзілі пазней і прабіраліся наперад. Тыя, хто стаяў наперадзе, наадварот прагнулі глынуць свежага паветра. Так што перакартоўка і таўкучка працягваліся бесперапынна. [..]

Наша царква была драўлянай, з двума купаламі-цыбулінамі, пафарбаваная ў блакітны колер. З-за яе невялікіх памераў хор размяшчаўся з правага боку ад царскіх варот. Як вядома, служба ў царкве праходзіць выключна ў суправаджэнні хору. У харыстаў быў асобны ўваход на клірас праз вузкія дзверы. Гэтыя дзверы, клірас і харысты былі для мяне чымсьці незвычайным і недасягальным. Я адчувала іх нейкую святасць.

Я звычайна стаяла каля кліраса, услухоўваючыся ў асобныя галасы, і адчувала праўдзівую асалоду. Ва ўрачыстыя хвіліны, калі стоячы на каленях, глядзела на свет у высокім акне купала, а мелодыя падымалася ўсё вышэй і

вышэй, я адчувала, што мая душа ўзносіцца разам з ёй. Моцныя галасы пеўчых дасягалі кожнага кутка скляпення, кружыліся там і чароўным дажджом абсыпаліся на галовы людзей, якія сталі на каленях – і на маю таксама. [..]

Зімы тады была марозныя. Халадней за ўсё станавілася на Вадохрышча, г. з. 6 студзеня па старым Юліянскім календары, або па так званым старым стылі. У той дзень з царквы ў бок Лідзейкі адпраўляўся хрэсны ход. Натоўп рухаўся павольна, з харугвамі над галовамі. Бацюшка Багаткевіч, акружаны вернікамі, ішоў пад балдахінам. Высока над галавой ён абедзвюма рукамі трымаў крыж. Памятаю яго чырвоныя ад марозу далоні і здзіўленне – як ён мог вытрымліваць такі мароз. Дарога была доўгай. З царквы ішлі праз усю Сувальскай вуліцу, затым па Замкавай у наш бок міма замкавых руін выходзілі на вуліцу Гражыны да алтара, пабудаванага перад другім мостам над ракой. Мама казала, што бацюшка засцерагае рукі ад марозу, шаруючы іх спіртам. Але я ўсё роўна дзівілася і вельмі яго шкадавала. Пазней ён прыходзіў да нас на Каляды»[83].

Ярмант яшчэ пісала, што «бацюшка Багаткевіч... быў вядомы сваёй любоўю да гарачыльных напояў, што мабыць, часткова тлумачылася становішчам ўдаўца. Аднак бацюшку паважалі "як чалавечнага святара"»[84].

Вялікая колькасць надмагілляў была знесена пры будаўніцтве завода электравырабаў. Тыя, што засталіся планавалася знішчыць для будаўніцтва дарогі, для чаго ў 1980-х гг. быў таемна прывезены атрад навагрудскіх камсамольцаў, якія ўначы пазбівалі на зямлю каменныя крыжы з надмагіллямі. Уцалела толькі частка гэтага гістарычнага некропаля[85].

---

[83] Ярмонт Е. В тени замка Гедемина. Лида, 1995. С. 54–55, 56, 59.
[84] Там жа. С. 32.
[85] http://www.eparhia.by/statja/v-pamjat-kreshchenija-rusi-lidskii-pravoslavnyi-nekropol.html

У верасні 2009 г., праз 90 гадоў пасля смерці, камісія ў складзе 6-ці святароў знайшла месца пахавання Іосіфа Каяловіча. На той час месца пахавання святара было страчана. Было вядома, што ён пахаваны ў сямейным склепе недалёка ад алтарнай часткі Свята-Георгіеўскай царквы. І, насамрэч, на поўнач, каля храма, меўся сямейны склеп Каяловічаў, які выглядаў наступным чынам: на паверхні зямлі бетоннымі борцікамі быў агароджаны ўчастак зямлі памерам 4 х 10 метраў. Унутры агароджы меліся два мармуровыя помнікі, а ўся паверхня выкладзена керамічнай пліткай. Адзін помнік быў Андрыяну Каяловічу (21.02.1861 – 29.03.1882, сын протаіерея), другі – Ізабэлі Маліцкай, якая памерла 25.12.1904 на 76-м годзе жыцця (верагодна цешча протаіерэя). Паміж помнікамі было месца на яшчэ адну магілу, таксама вольнае месца мелася ўправа ад магілы Маліцкай. Па ўспамінах, Каяловіча пахавалі тайна, паміж магіламі сына і Маліцкай.

Таму ў верасні 2009 г. была знята керамічная плітка і на глыбіні 25 см знойдзена трохслойная цагляная кладка залітая зверху бетонам. Пад кладкай знайшлі цаглянае скляпенне і ўваход у склеп. У склепе стаяла вялікая цынкавая труна з чатырма ручкамі і бронзавым ўкрыжаваннем на верхнім вечку. Труну ўскрылі і знайшлі там шкілет чалавека апранутага ў вопратку. «Чэрап цёмна-карычневага колеру, адзенне, прадметы, кісці рук у асноўным чорнага колеру». Так была знойдзена верагодная магіла жонкі протаіерэя Лізаветы Каяловіч.

Потым ускрылі вольнае месца каля магілы Ізабелі Маліцкай і таксама знайшлі цагляны склеп, у якім ляжалі чалавечыя парэшткі ў сатлелым святарскім убранні. Труна цалкам струхнела і былі бачны толькі кавалкі дрэва[86]. Так былі знойдзены парэшткі былога лідскага дабрачыннага.

[86] Прыватны архіў аўтара.

Перад наступам немцаў у канцы лета 1915 г. протаіерэй Каяловіч эвакуіраваўся з Ліды ў Петраград і жыў тут па адрасе: Кабінетная вул., д. 9, кватэра прафесара Тэхналагічнага інстытута Б. М. Каяловіча[87], пляменніка святара і сына гісторыка М. Каяловіча. Протаіерэй Каяловіч, як і іншыя былыя гаспадары нашага краю, збег з Расіі ад бальшавікоў і вярнуўся на радзіму ў канцы 1918 г. Але да гэтага часу на радзіме ўсё памянялася, і былыя гаспадары цалкам страцілі свой уплыў. Гэтыя людзі працяглы тэрмін, як маглі сціскалі спружыну людскіх пачуццяў. Вайна абвастрыла норавы і шмат хто з іх, у тым ліку і Каяловіч, заканамерна патрапілі пад удар адваротнага ходу спружыны гісторыі. Але гэта гісторыя вядомая, і я не буду зноў пісаць пра яе[88].

З 1919 па 1990-я гг. царква на могілках была адзінай у горадзе.

У 1990-я – пачатку 2000-х гг. царква была цалкам перабудаваная і стала мураванай. Падчас гэтай перабудовы старая драўляная царква знікла. Новая царква пабудаваная з выкарыстаннем ужо беларускай сімволікі. Так, усе вітражы выкананы ў выглядзе выявы крыжа Ефрасінні Полацкай. У 2014 г. на сцяне царквы-помніка ўстаноўлены падзячны медальён гетману найвышэйшаму Вялікага Княства Літоўскага князю Канстанціну Астрожскаму.

У 1994 г. з-пад сцяны царквы забралі парэшткі генерала Кіпрыяна Кандратовіча[89] і перанеслі іх у Воранава. Думаю, прыйдзе час, калі трэба будзе зноў выканаць апошнюю волю генерала Кандратовіча і яго сям'і – вярнуць парэшткі да царквы ў Лідзе.

[87] ЛЕВ. 1916. № 3. С. 11.

[88] Гл: Лаўрэш Л. Л. Шэпт пажоўклых старонак. Лідчына ў люстэрку прэсы. 1900–1939 гг. Гродна, 2017. С. 109.

[89] Гл: Лаўрэш Л. Л. Генерал, які дайшоў да Беларусі. Жыццяпіс Кіпрыяна Кандратовіча. Гродна, 2018.

Магілу і помнік Марыі Навіцкай – заснавальніцы Лідскай прыватнай жаночай гімназіі ўдалося захаваць. Марыя Навіцкая, у дзявоцтве Снітко, нарадзілася 3 чэрвеня 1865 г. Атрымала адукацыю ў Віленскай Марыінскай вышэйшай жаночай вучэльні. У Лідзе жыла з 22 лістапада 1899 г. Памерла 26 лістапада 1908 г. ад разрыву сэрца, не дажыўшы каля двух гадоў да канчатковага здзяйснення сваёй мары – адкрыцця ў Лідзе жаночай прыватнай гімназіі[90].

Таксама на гэтых могілках пахаваны ўрач Рэнерт, беларускія грамадска-палітычныя дзеячы Юльян Саковіч, Леанід Маракоў і іншыя.

Думаем, трэба сказаць некалькі слоў пра братоў Рэнертаў. У свой час да нас звярнулася нявестка ўнука Роберта Рэнерта – Данута Рэнерт з просьбай даць хоць якую-небудзь інфармацыю пра двух братоў – лідскіх Рэнертаў, і сама трошкі паведаміла тое, што ведала пра іх.

З 12 лютага 1891 г. гарадскім лекарам быў доктар медыцыны, надворны дарадца (у 1898 г.) Эдмунд Фёдаравіч Рэнерт (04.07.1862 – 05.07.1934). У 1879 г. ён скончыў Віленскую шасцікласную прагімназію, а ў 1881 г. – 1-ю Віленскую гімназію са срэбным медалём. Выпускнік Юр'еўскага універсітэта (зараз – Тартускага), лютэранскага веравызнання. Працаваў у клінічнай лабараторыі прафесара Ф. І. Пастэрнацкага ў Санкт-Пецярбурзе. Абараніў дысертацыю «Аб параўнальным уплыве газаванага і простага малака на кішачныя закісанні здаровага чалавека (пры чыста малочнай дыеце)»[91]. Быў лекарам лідскіх гарадскога і яўрэйскага шпіталяў[92] да 1915 г.

[90] Гл: Лаўрэш Л. Л. Інстынкт пазнання. Нарысы з гісторыі адукацыі ў горадзе Ліда. Гродна, 2023. С. 71–79.

[91] Реннерт Э. Ф. О сравнительном влиянии газированного и простого молока на кишечные брожения здорового человека (при чисто молочной диете): Дис. на степ. д-ра мед. Э.Ф. Реннерта / Из Клин. лаб. проф. Ф.И. Пастернацкого. Санкт-Петербург: т-во Печатня С.П. Яковлева, 1895.

[92] Памятная книжка Виленской губернии на 1899 г. Вильна, 1898. С. 246.

З 24 ліпеня 1898 г. лідскім павятовым ветэрынарам «без чыну» стаў Роберт Вільгельм Робертавіч Рэнерт, які таксама закончыў Юр'еўскі ўніверсітэт і таксама быў лютэранскага веравызнання[93].

Абодва Рэнерты – родныя браты, але чамусьці імя па бацьку старэйшага з іх пісалася на рускі манер, а малодшага – аўтэнтычна, як і належыць этнічнаму немцу.

Пра Эдмунда Рэнерта вядома няшмат. У 1920–30 гг. ён жыў у доме па адрасе: Віленская (Сувальская), 83. Вядома, што ў 1919 г. арандаваў жытло ў нейкага яўрэя каля Свята-Міхайлаўскага сабора, а пасля інцыдэнту з дабрачынным Іосіфам Каяловічам, згадваецца як «праваслаўны доктар», які аказаў святару медычную дапамогу[94]. Пахаваны на праваслаўных могілках. Магіла і помнік захаваліся да нашага часу.

Гісторыя гэтых цікавых могілак у комплексе яшчэ не даследавалася. І трэба выказаць падзяку святарам Свята-Георгіеўскага храма за ўсталяванне дошак, на якіх выбіты прозвішчы ўсіх асобаў пра якіх нешта вядома, пахаваных на гэтых могілках. Гэты спіс быў надрукаваны ў часопісе «Лідскі летапісец»[95] і друкуецца ў гэтай кнізе.

---

93 Там жа.

94 Архіў аўтара.

95 Гл: Лаўрэш Леанід. Лідскія цэрквы да 1939 г. // Лідскі Летапісец. 2014. №4(68). С. 63–79.




*Праваслаўныя могілкі, малюнак 1917 г.*

# Слабадскія могілкі

Лідскі Слабадскі касцёл быў пабудаваны ў 1933 г.[96] Аднак, яшчэ да Першай Сусветнай вайны, Віленскі губернатар зацвердзіў дазвол Лідскага магістрата ад 15 снежня 1909 г. аб выдзяленні 3 дзесяцін гарадской тэрыторыі на будаўніцтва «другога каталіцкага касцёла»[97] менавіта на Слабодцы.

На пасяджэнні Гарадской рады пры канцы мая 1933 г. была ўхвалена пастанова аб выдзяленні Лідскаму аддзелу «Звязу настаўнікаў» і яўрэйскаму культурна-асветнаму таварыству «Тарбут» пляцаў для будаўніцтва дома «Звязу настаўнікаў» і 7-мі гадовай яўрэйскай агульнаадукацыйнай школы. Таксама на гэтым пасяджэнні былі выдзелены 9 гектараў зямлі на Слабодцы для будаўніцтва касцёла, школы і паліцэйскага пастарунка, а таксама абшар пад плошчу, сад і сквер агульнага карыстання. Тады ж Рада вырашыла звярнуцца да Міністэрства ўнутраных спраў з просьбай зацвердзіць гарадскі герб 1590 г. з ільвом і ключамі на тарчы[98].

З выдатнага артыкула Уладзіслава Абрамовіча ў перадваеннай газеце «Лідская Зямля» мы ведаем, што ў 1920–30-я гг. Слабада стала важным раёнам горада і, дзякуючы намаганням ксяндза-вікарыя Станіслава Мажэйкі, тут паўстаў касцёл. У 1936 г. Гарадская рада даравала Слабадской парафіі два гектара гарадской зямлі для заснавання могілак. Падчас геадэзічных работ і работ па агароджванні будучых могілак, адзін з работнікаў пацікавіўся меркаваннем другога пра тое, хто з іх першы ляжа на но-

[96] Kościoły i klasztory rzymskokatolickie dawnego województwa wileńskiego. Kraków, 2008. T. 2., cz. III. S. 129.
[97] Kuryer Wilenski. № 101, 6 (19) maja 1911.
[98] Słowo. №139(3277), 23 maja 1933.

вых могілках. Так здарылася, што той, хто пытаўся, і стаў самым першым нябожчыкам на гэтых могілках. Весткі пра гэта імгненна разышліся па парафіі і вернікі зрабілі яму ўрачыстае пахаванне[99]. Магіла землямера не захавалася да нашага часу, але пачуць гэту гісторыю ад старых лідзян можна яшчэ і сёння. Самая старая магіла, якую мы знайшлі на гэтых могілках – з 1936 г., на бетонным помніку напісана: «Антаніна Шурмей, жыла 36 гадоў, памерла 7.XII.1936 г., каханай мамусі ад дзяцей».

Міхал Шымялевіч пісаў, што парафіяльныя рыма-каталіцкія могілкі на Слабадзе заснаваныя на зямлі, якая мела гістарычную назву «Перхураўскі клін»[100].

Ад пачатку могілкі мелі радыяльна-праменёвую пабудову. На старой частцы могілак яна праслежваецца і зараз. Галоўная брама нагадвае герб Калюмны.

На Слабадскіх могілках знаходзіцца пахаванне 9 каталіцкіх святароў, якія былі расстраляны немцамі на заходняй ускраіне Паўночнага гарадка 10 сакавіка 1943 года. На гранях саркафага імёны пакутнікаў: Дабравольскі Стэфан, 44 гады, пробашч з Беліцы; Бароўскі Альфонс, 51 год, пробашч з Лацка; Цыбульскі Францішак, 58 гадоў, пробашч з Трабаў; Ажароўскі Ежы, 31 год, пробашч з Ліпнішак; Стжасьнеўскі Вінцэнт, 34 гады, пробашч з Юрацішак; Лабан Вінцэнт, 45 гадоў, пробашч лідскі; Мрачкоўскі Люцыян, 34 гады, вікары лідскі; Снягоцкі Стэфан, 29 гадоў, вікарый фарнага касцёла; Аўгустыновіч Аляксандр, 53 гады, пробашч з Няцечы. У красавіку 1943 г. сяляне вёскі Дайнава ноччу выкапалі святароў і перапахавалі ў агародзе сям'і Ухто. У 1960 г. парэшткі расстраляных былі ўрачыста перапахаваны на могілках Слабадской парафіі.

---

[99] Władysław Abramowicz. Słobódka – przedmieście Lidy // Ziemia Lidzka. 2002. № 6(53).
[100] Szymielewicz Michał. Nasze drzewa. Sosna // Ziemia Lidzka. 1938. .№1.

Так сталася, што гэтыя могілкі з’яўляюцца апошнім прытулкам ўсёй нашай сям’і. Магіла Лаўрэшаў[101] – таты, мамы і брата аднаго з аўтара гэтай кнігі, мае каардынаты 53°51’59.7”N 25°15’58.2”E, магіла Хрулёў[102] – мамы, таты і сястры аўтаркі кнігі, мае каардынаты 53°52’04.7”N 25°15’45.2”E і калі далей усе будзе так, як і павінна быць, магіла аўтараў гэтай кнігі (каля магілы дзеда і бабулі аўтаркі) будзе мець каардынаты 53°52’03.1”N 25°15’43.7”E.

[101] Радавод Лаўрэшаў гл. у кнізе: Марозава С. В. Людзі культуры Гродзеншчыны: Леанід Лаўрэш. Гродна, 2023.
[102] Гл: Лаўрэш Леанід. Лідскія Хрулі герба «Праўдзіч» // Герольд Litherland. 2022, №23. С. 145–150.

# Старыя гарадскія (каталіцкія) могілкі

Лідскі гісторык Міхал Шымялевіч у 1937 г. напісаў выдатнейшы артыкул пра лідскія старыя гарадскія могілкі[103] і большасць артыкулаў на гэтую тэму іншых аўтараў – толькі пераказ, часта з памылкамі, базавага артыкула лепшага гісторыка Ліды. Гэтая частка нашай кнігі таксама выкарыстоўвае матэрыял Шымялевіча але і дадае многа новага. Думаю, каб час дазволіў яму, Шымялевіч напісаў бы і кнігу пра лідскія могілкі – шмат каго з вечных насельнікаў горада мёртвых ён ведаў асабіста, а пра іншых мог напісаць цікавыя аповеды, грунтуючыся на сваім унікальным прыватным архіве, які быў назаўжды страчаны. Але гісторыя не пакінула яму часу. Дадамо, што адным з аўтараў гэтай кнігі артыкул Міхала Шымялевіча пра могілкі быў перакладзены і выдадзены у прэстыжным мінскім альманаху «Асоба і Час» выпуск № 6 за 2015 г.[104] а потым стаў часткай збору твораў гэтага лепшага гісторыка Лідчыны XX ст.[105]

З пачатку XVII ст. на поўдзень ад горада Ліды, на замкавай зямлі і зямлі шляхецкага засценка Кузьмішкі паноў Вісмантаў рос прыгожы бор. Па распараджэнні губернскіх уладаў у 1797 г. частка гэтага бору, якая знаходзілася на замкавай зямлі, была выдзелена пад парафіяльныя могілкі. Другая частка бору на зямлі шляхты праіснавала да 1892 г., калі дрэвы спілавалі, бо трэба было адбудоўвацца пасля вялікага пажару Ліды. Потым для будаўніцтва даходных

---

103 Szymielewicz Michał. W cmentarnej ciszy // Ziemia Lidzka. 1937. № 11.

104 Шымялевіч Міхал. У цішы могілак ... // АСОБА І ЧАС. Беларускі біяграфічны альманах. Выпуск 6. Мінск, 2015. С. 146–155.

105 Шымялевіч Міхал. Збор твораў / укл. Л. Лаўрэш. Гродна, 2019.

дамоў спілавалі і прыгожы бор, які рос непасрэдна на парафіяльных могілках. Пры канцы XIX ст. Міхал Шымялевіч лічыў гадавыя кольцы вялікіх пнёў, якія пазаставаліся на месцы гэтых сосен і налічыў па 240 кольцаў. Гэта былі пні дыяметрам ў паўтара метры[106].

Ад пачатку старыя гарадскія могілкі не мелі дакладна акрэсленых межаў. Аднак каля 1840 г. на сродкі пані Клары Якавіцкай, як і належала па закону, могілкі былі акапаны ровам і агароджаны невысокім валам. Ксёндз-рэктар лідскага піярскага калегіума Юзафат Вайшвіла, аўтар цікавых успамінаў, пісаў: «Могілкі зараз займаюць абшар у 3 морга і аточаны акопам абкладзеным камянямі … і ровам шырынёй у 3 локця. Гэта агароджа добра выглядае. Брама вымуравана з цэглы. На агароджу могілак сабрана 500 рублёў срэбрам. Работы выканалі нашы землякопы і муляры, кіравалі і наглядалі за імі пробашч Хлявінскі і бургамістр Андрушкевіч»[107].

Роў і вал, аднак, не баранілі могілкі ні ад быдла, якое пасвілася побач, ні ад непажаданых асобаў. У 1886 г. на сродкі пані Лясковіч была выбудаваная брама на могілкі – чатыры мураваныя слупы з драўлянымі варотамі. У аповедзе Міхала Шымялевіча «З таго свету» (гл. у дадатках) дачка старога Вісманта Броня ў ноч прыходзіць на старыя могілкі, яна «навобмацак спусцілася ў роў, залезла на муры і слізганула па мокрых і халодных камянях муроў на могілкі»[108].

Каля 1900 г. распачалася і праз некалькі гадоў закончылася будоўля новай мураванай агароджы могілак. У памяць пра пабудову мураванай агароджы ўлева ад уваходу з унутранага боку была ўмураваная каменная дошка з надпісам:

---

106 Szymielewicz Michał. Nasze drzewa. Sosna // Ziemia Lidzka. 1938. № 1.

107 Wspomnienie domku Pijarów Lidzkich. Napisał ks. Jozafat Wojszwiłło, ostatni rektor Pijarów lidzkich // Biblioteka Zakładu Narodowego im. Ossolińskich we Wrocławiu., sygn. 3667/III. S. 30.

108 Szymielewicz Michał. Z tamtego świata // Ziemia Lidzka. 1937. №11. S. 125–127.

«Агароджана ў 1903 г. коштам парафіян, стараннем ксяндза-дэкана Юзафа Сянкевіча, М. Пацэвіча, Я. Падгайнага, каменем Стэфана Макрэцкага. За якіх Здровась Марыя»[109]. Згаданы Стэфан Макрэцкі – уладальнік маёнтка Вінькаўцы праз пэўны час, як генерал зброі Войска Польскага, быў прэм'ер-міністрам Сярэдняй Літвы – дзяржаўнага ўтварэння на тэрыторыі Віленшчыны і Гродзеншчыны ў 1920–1922 гг.[110]

На гэтых жа могілках справа ад галоўнага ўваходу знаходзіцца магіла маці Стэфана Макрэцкага – Камілы. На помніку надпіс: «...Каміла з Машэўскіх Макрэцкая, народжаная ў 1832 г. Памерла 2 мая 1865 г., мела 33 гады. Вечны адпачынак рач ёй даць Пане». Каміла Макрэцкая да 33 гадоў нарадзіла 8 дзяцей і памерла пры родах апошняга сына Зыгмунта, паўтарыўшы лёс многіх жанчын таго часу.

А злева ад уваходу, блізка ад капліцы знаходзяцца магілы Стэфанавых дзеда Вінцэнта Машэўскага і бабкі Гэмыліі з Нарбутаў Машэўскай. На помніку на магіле дзеда напісана: «... парэшткі Вінцэнта Машэўскага, жыў 75 гадоў, памёр у 1876 г.». На помніку на магіле бабкі: «... Гэмылія з Нарбутаў Машэўская, народжаная ў 1806 г. Памерла 26 лютага 1893 г.». Помнікі Машэўскіх добра захаваліся[111].

---

109 У наш час, пры апошняй рэканструкцыі могілак валанцёрамі, гэта гістарычная дошка была перанесеная на вонкавы бок муроў каля галоўнай брамы.

110 Адной з мэтай стварэння Сярэдняй Літвы Юзафам Пілсудскім была схіліць летувісаў да перамоў пра тэрыторыі. Калі 17 жніўня 1921 г. памерла яго першая жонка Марыя Пілсудская з Каплеўскіх, згодна з выказаным пажаданнем, яе трэба было пахаваць ў Вільні на могілках Росы, побач з дачкой і маці. Аднак Вільня ў той час фармальна з'яўлялася сталіцай г. з. Сярэдняй Літвы і Пілсудскі, як кіраўнік дзяржавы, не мог туды прыехаць як звычайны грамадзянін, да таго ж, гэта выклікала бы пратэсты з боку Летувы. Таму, насамрэч, з жонкай ён развітаўся у Лідзе, якая была апошняй станцыяй перад Сярэдняй Літвой.

111 Суднік Станіслаў. Лідская памяць пра генерала Стэфана Макрэцкага // Лідскі летапісец. 2012. №2(58). С. 6.

## Буткевічы

Першым памыліўся Міхал Шымялевіч, напісаўшы, што жонка маршалка Лідскага павета Стэфана Буткевіча (19.02.1815–30.03.1896) пахавана разам з ім. Зараз, калі на могілках праведзена вялікая праца па аднаўленні, была знойдзена магіла жонкі Буткевіча – Эміліі Буткевіч з Адамовічаў (1813–1879). Насамрэч, яна пахавана асобна ад мужа, сярод Адамовічаў. Агульны помнік сям'і Адамовічаў знаходзіцца на поўнач ад капліцы. На помніку Эміліі Буткевіч маецца толькі прысвячэнне ад сына: «Найлепшай маці. Удзячны сын». Мужа, як быццам, у яе і не было, хоць ён і пераважыў жонку амаль што на 20 гадоў.

У 1885 г. Стэфан Буткевіч, былы маршалак Лідскага павета пабудаваў новую, ашаляваную і крытую гонтам званіцу, якая стаяла тут жа, недалёка ад ўваходу на могілкі і менавіта каля сваёй званіцы ён і быў пахаваны. Званіца мела два званы: адзін вагай у пуд, другі – 30 фунтаў (12 кг)[112]. У 1927 г. званіца ўжо была ў вельмі дрэнным стане[113]. Гэты аб'ект добра бачны на нямецкім малюнку 1917 г.

Ведаючы гэту інфармацыю, сонечным красавіцкім ранкам адзін з аўтараў выправіўся на старыя могілкі, каб расшукаць магілу маршалка. Уважліва ўзіраючыся ў надмагіллі, тры разы па мокрай траве абышоў тую частку могілак, дзе маглі быць магілы Буткевічаў і нічога не знайшоў. Вырашыўшы, што магіла маршалка знішчана, накіраваўся да выхаду і кінуўшы позірк на апошняе, часткова паламанае надмагілле, убачыў, што знайшоў менавіта тое, што шукаў – магілу Стэфана Буткевіча. Зараз помнік лідскаму маршалку зноў устаноўлены вертыкальна.

112 Szymielewicz Michał. W cmentarnej ciszy // Ziemia Lidzka. 1937. № 11. S. 118.

113 Korzeniowska Anna, Mączewska Katarzyna. Kaplica cmentarna p.w. Św. Barbary w Lidzie // Koscioly i klasztory rzymskokatolickie dawnego wojewodztwa wilenskiego. Krakow, 2008. T. 2., cz. III. S. 176.

А зараз мы раскажам тое, што ведаем пра гэтага чалавека.

Стэфан Буткевіч, сын Дамініка і Эміліі з Шукевічаў, меў жонку Эмілію з Адамовічаў. Валодаў маёнткам Косаўшчына з фальваркам Качанова і вёскамі Косаўшчына, Болтуці, Цвермы, Татарцы, Навіцкія, Былінская – усяго 1363 дзесяціны і 150 душ. Пасля смерці маці ўспадкаваў маёнтак Мінойты з вёскай (570 дзесяцін, 52 душы)[114].

Адукацыю атрымаў у Шчучынскай павятовай вучэльні. У 1853 г. тытулярны дарадца Буткевіч запісаны сярод «попечителей сельских запасных магазинов»[115].

Службовыя абавязкі маршалка шляхты выконваў з 12 кастрычніка 1855 г. Амаль што адразу быў узнагароджаны медалём у памяць вайны 1853–56 гг., а потым ордэнам св. Станіслава 3 ст. і знакам за 15 гадоў службы[116]. На сваёй пасадзе ён заставаўся да 1875 г. – роўна 20 гадоў.

Маршалак Лідскага павета Буткевіч згадваецца ў мемуарах рускага афіцэра І. В. Любарскага[117] – палкавога доктара, полк якога стаяў у Лідзе перад паўстаннем 1863 г. Мясцовая інтэлігенцыя шукала паразумення з рускімі афіцэрамі. «У той час польскія абшарнікі і службоўцы не толькі не чужыліся рускіх людзей, але імкнуліся зблізіцца з імі і ўсталяваць добрыя адносіны; таму запрашалі рускіх у свае сямействы і аказвалі ім самую вялікую ўвагу. Я, напрыклад, зусім яшчэ юны і халасты чалавек, быў проста збянтэжаны тым, што да мяне першым прыехаў з візітам прадвадзіцель дваранства (маршалак) – асоба, якая карысталася вялікай вагой у мясцовым грамадстве. Сталася

114 Malewski Czeslaw. Rody szlacheckie na Litwe w XIX wieku. Powiat lidzkim. Wilno, 2005. S. 92.

115 Памятная Виленской губернии на 1853 г. Вильна, 1853. С. 59.

116 Адрес-календарь Виленского генерал-губернаторства на 1868 год. С.-Петербург, 1868. С. 90.

117 Любарскі Іван Васільевіч (1832–1901), закончыў медыцынскі факультэт Харкаўскага універсітэта, ваенны лекар, гісторык, журналіст.

так, што для збліжэння з афіцэрамі шляхта падрыхтоўвала раскошны баль, і з гэтай мэтай заводзіліся знаёмствы нават з тымі з вайскоўцаў, хто па недахопе сродкаў трымаўся ўбаку ад павятовага грамадства»[118].

Мемуарыст цікава расказвае пра настрой гараджан перад паўстаннем. Паступова рэвалюцыйнае ўзбуджэнне ў горадзе ўзрастала: «Па меры таго, як яно больш і больш набірала моц, рускае значэнне ў краі паступова змяншалася. Выходзіла так, як быццам бы гаспадарамі становішча былі яны, а часовымі гасцямі, прышэльцамі ці, мабыць нават паразітамі на чужым целе з'яўляліся мы». Гледзячы на Італію, якая тады заваявала свабоду, чакаючы падтрымкі Францыі, усе ўжо амаль што верылі ў хуткае незалежнае існаванне. Любарскі, у гэты час вайсковы палкавы лекар і добры хірург, даслоўна запісаў сваю размову з лідскім прадвадзіцелем дваранства Буткевічам (сябе Любарскі тут называе ў трэцяй асобе «доктарам»):

- Скажыце, каханы кансільяжу (ласкавы доктар), спадзяюся, Вы застанецеся ў нас, калі Літва адыдзе ад Расіі?

- Як гэта адыдзе ад Расіі? – спытаў збянтэжаны доктар, – я штосьці не ясна сабе ўяўляю.

- Вельмі проста; адлучыліся ж ад Аўстрыі Ламбардыя і Венецыя і ўвайшлі ў склад Італьянскай дзяржавы. Чаму ж мы не можам утварыць незалежнай дзяржавы ў межах сваёй народнасці? Зараз да таго ідзе ўся еўрапейская палітыка.

- Але Расія – не Аўстрыя, – заўважыў доктар, зачэплены за жывое, – і паменшыць яе будзе цяжэй, чым разнамасную імперыю Габсбургаў!

- Вядома, – спахапіўся маршалак, – я і кажу гэта. Але могуць быць розныя палітычныя кампрамісы для аб'яднання народнасцяў. Відаць, час такі надышоў. Ды не пра гэта ўласна гаворка. Я толькі хацеў сказаць, што Вы, ла-

---

[118] Любарский И. В. В мятежном крае. (Из воспоминаний) // Исторический вестник. 1895. Т. 59. № 3. С. 818.

скавы доктар, карыстаецеся такім заслужаным даверам у нашым грамадстве, што пажадана, каб Вы засталіся ў нас, якія б ні адбыліся палітычныя змены.

- Вельмі удзячны за ўвагу, але, прызнаюся, я б не застаўся.

- Чаму ж? – здзівіўся суразмоўца, – для адукаванага чалавека жыць у краіне з ліберальнымі ўстановамі, якой будзе наша незалежная дзяржава, і працаваць у культурным грамадстве павінна быць прывабна.

- Ды хоць бы таму, што я, як праваслаўны, быў бы не зусім свой паміж вамі, і польскай мовы добра не ведаю, а быць абмежаваным у выказванні сваіх думак непрыемна.

- Э, глупства! Варта Вам ажаніцца з кімсьці з нашых прыгажунь і адрозненне ў веравызнанні згладзіцца, а мовай Вы авалодаеце. Я ведаў афіцэра, які прыбыў у Вільню з глыбіні Расіі і не разумеў аніводнага слова, а праз некалькі гадоў пісаў у альбомы такія выдатныя вершы, што, чэснае слова, пад імі і сам Вікенці Поль падпісаўся б[119].

Прадвадзіцель дваранства (маршалак шляхты) Стэфан Буткевіч не прымаў удзелу ў паўстанні, аднак вядома, што ён ратаваў паўстанцаў. Як мінімум аднаму з іх, свайму сваяку Балтазару Калясінскаму, ён дапамог сустрэцца з ваенным начальнікам Лідскага павета Алхазавым і, верагодна, праз добры хабар, зняць з Калясінскга частку абвінавачванняў[120].

Але ў гісторыі горада Стэфан Буткевіч застанецца як чалавек, які 1870-я гг. прапанаваў генерал-губернатару разабраць наш замак Гэдыміна на будаўнічыя матэрыялы.

У запісцы віленскаму генерал-губернатару А. Л. Патапаву ў сакавіку 1868 г., Буткевіч пісаў, што заробку ад казны

[119] Там жа. С. 827–828.
[120] Kowalewska Zofia. Dzieje powstania lidzkiego: wspomnienie o Ludwiku Narbucie. Wilno, 1934. S. 23.

ён не атрымліваў і выкананне сваіх службовых абавязкаў каштавала яму двух маёнткаў, якія ён прадаў, каб пакрыць расходы на гэтай пасадзе прадвадзіцеля дваранства[121].

Пасля адстаўкі з пасады маршалка, надворны дарадца[122] Буткевіч амаль што да канца жыцця абіраўся галосным (дэпутатам) Лідскай гарадской думы[123]. Менавіта з галосным Лідскай гарадской думы Стэфанам Буткевічам быў асабіста знаёмы Францішак Багушэвіч, паэт згадваў яго ў сваіх газетных артыкулах[124].

Да агульнагарадскога пажару 1891 г. Буткевічы валодалі ў цэнтры горада прыгожым домам. Ян Сегень успамінаў: «Насупраць плошчы, каля рынку па левым баку вуліцы быў пляц з драўляным і вельмі прыгожым домам з вялікім падворкам у кветках і ружах. На тым падворку меўся і сапраўдны жывы, нават ненавязаны воўк – пострах для ўсіх дзяцей, асабліва яўрэйскіх. Быў гэта дом пана Буткевіча, маршалка ...»[125].

Да 1913 г. Гарадская ўправа арандавала будынак, які стаяў у раёне горада «Ферма», пад палкавую царкву ў сына былога маршалка Эміля Сцяпанавіча Буткевіча. У 1918 г. у Лідзе ўзнікла польская «Народная Рада», якую ўзначаліў Эміль Буткевіч. У сувязі з узростам і дрэнным здароўем ён у хуткім часе адмовіўся ад гэтай пасады[126].

---

121 Тамара Байрашаускайте. Институт предводителей дворянства в западных губерниях Российской империи во второй половине XIX в. – начале XX в. (Виленская и Ковенская губернии) // Беларускі гістарычны зборнік. 2014. №41. С. 71.

122 Надворны дарадца – цывільны чын VII класа ў «Табелі аб рангах» у Расіі. Адпавядаў чынам падпалкоўніка ў арміі ці капітана II рангу флота. Афіцыйны зварот: «Ваша высокаблагароддзе».

123 Памятная Виленской губернии на 1887 г. Вильна, 1886. С. 225.

124 Содаль Уладзімір. Францішак Багушэвіч на Лідчыне // Лідскі летапісец. 2005. № 3(31). С. 10.

125 Сегень Ян. Успаміны пра Ліду канца XIX стагоддзя // Лідскі летапісец. 2001. № 12. С. 17.

126 Дзічканец Юзэф. Самаабарона лідскай зямлі. Ліда, 2010. С. 41.

Брат Вацлава Іваноўскага Тадас Іванаўскас пісаў пра сына лідскага маршалка Эміля Буткевіча: «Памятаю адно здарэнне, якое адбылося, калі цар Мікалай II ехаў па поўдзень і планаваў выйсці з цягніка на станцыі Зэльва, недалёка ад Наваградка. Сярод тых, хто сустракаў цара, знаходзіўся таксама наш сусед Эміль Буткевіч (бацька Мсціслава Буткевіча, які ў 1920 г. браў удзел у акцыі генерала Жалігоўскага). Гэта быў вельмі высокі чалавек з цёмным колерам скуры і мангольскімі рысамі твару, што ў нашых краях было незвычайным і прыцягвала ўвагу. Вярнуўшыся з сустрэчы з царом ён праз тыдзень наведаў Лябёдку і падзяліўся навінамі. Адбылася такая размова Буткевіча з маёй маці.

- Добры дзень! – крыкнуў госць. – З самім царом размаўляў.

- Аб чым размаўлялі? – запытала маці.

- Было гэтак: на пероне станцыі нас паставілі ў шэраг, і ён хутка з’явіўся – сам цар. Нічога не кажучы, абышоў нашу групу, але каля мяне затрымаўся, націснуў мне пальцам на бруха і спытаў: «Мясцовы?». Я адказаў: «Дакладна так, Ваша Вялікасць!». Цар са здзіўленнем прамармытаў: “Гм-мм”»[127].

Можа такі «ўсходні» выгляд сына маршалка лідскай шляхты быў вынікам нявернасці яго жонкі і менавіта гэта прывяло да разрыву яе з мужам? Вядома, што ў Лідзе працяглы час гарнізонам стаялі чарнявыя данскія казакі, і той жа Ян Сегень паведамляў, што, «з той нагоды [у нас] шмат засталося казацкай натуры»[128]. Але такая версія можа быць добрай для рамана а не для гістарычнага даследавання і таму пойдзем далей.

Унук маршалка, Мсціслаў Буткевіч – палкоўнік, камандзір 13-га палка віленскіх уланаў, у 1930-я гг. валодаў

[127] Tadas Ivanauskas, Aš apsisprendžiu, Vilnius: Vyturys, 1994. P. 99.

[128] Сегень Ян. Успаміны пра Ліду канца XIX стагоддзя // Лідскі летапісец. 2001. № 12. С. 17.

фальваркам Бярозаўка, які знаходзіўся на адлегласці 3 км ад маёнтка Стрэліца. Таксама меў ён і маёнтак Качанова, што пад Лідай.

## Каэтан Дэрашкевіч

І раней было вядома, што на старых лідскіх гарадскіх могілках пахаваны Каэтан Дэрашкевіч – адзін з кіраўнікоў паўстання 1863 г. на Лідчыне. І вось, пасля трох гадоў аднаўлення лідскіх могілак, здаецца, нашы валанцёры, знайшлі пахаванне гэтага заслужанага чалавека.

Адным з кіраўнікоў і духоўным бацькам паўстання на Лідчыне быў Бальтазар Калясінскі (1818–1888). Гэтага унікальнага чалавека, які заслугоўвае грунтоўнай манаграфіі, мы ўжо згадвалі вышэй. Бальтазар Калясінскі атрымаў адукацыю ў Віленскім шляхецкім пансіёне і амаль што адразу пасля заканчэння вучобы, малады чыноўнік быў арыштаваны па справе замежнага эмісара Яна Рэра. Калясінскага доўга трымалі ў турме, ніякіх доказаў яго віны знойдзена не было, і тады ў 1848 годзе Галоўнакамандуючы дзейнай арміі (на нашай тэрыторыі дзейнічала ваеннае становішча) зацвердзіў вырак, згодна з якім Бальтазар «прызнаны вінаватым разам з лекарам Аніцэтам Рэнігерам у слуханні зламысных настаўленняў супраць урада, у куплі, чытанні забароненых твораў, у знаёмстве з эмісарамі якія прыехалі з-за мяжы, у прыняцці аднаго з іх у сябе на кватэры і ў жаданні садзейнічаць паўстанню, калі б яно ўспыхнула ў заходніх губернях, – пазбаўлены чыноў і дваранскай годнасці»[129]. Менавіта такой была фармулёўка выраку, вынесенага Калясінскаму без суда.

Трэба заўважыць, што Аніцэт Рэнігер, з якім Калясінскі ішоў па адной справе, захапляўся беларускай культурай, разам са сваімі братамі пісаў па-беларуску і збіраў беларускі

[129] Большаков Леонид. Быль о Тарасе. Кн. 1. Москва – Оренбург, 1993. С. 171.

фальклор. Чацвёра з шасці братоў Рэнігераў, у тым ліку і Аніцэт, пакінулі свае запісы на беларускай мове ў «Альбоме» Арцёма Вярыгі-Дарэўскага. Браты Рэнігеры сябравалі і ліставаліся з Адамам Кіркорам, Вінцэнтам Дунінам-Марцінкевічам і Янам Карловічам, Тэадорам Нарбутам. Таму ня дзіва, што ў пятым лінейным батальёне Асобнага Арэнбургскага корпуса, куды Бальтазар Калясінскі быў сасланы, ён стаў блізкім сябрам Тараса Шаўчэнкі, якога таксама пакаралі «салдатчынай». Пра сапраўднае сяброўства лідзяніна і геніяльнага украінскага паэта нам расказвае іх ліставанне і ўспаміны агульных сяброў.

У арэнбургскіх стэпах Калясінскі паказаў сябе мужным жаўнерам і атрымаў афіцэрскі чын, пасля чаго да 1857 г. працягваў службу чыноўнікам. Пасля «адлігі» на пачатку царавання Аляксандра II, вярнуўся на радзіму, дзе ўжо пачынаўся рэвалюцыйны рух. Практычна адразу на Лідчыне, яго разам з Юльянам Лясковічам абралі міравым пасрэднікам.

Бальтазар Калясінскі надзвычай энергічна ўзяўся за скасаванне страшнага расійскага прыгону, які трымаў у стане «белых» рабоў большасць насельніцтва імперыі. Ён разам са сваім стрыечным братам Станіславам Калясінскім быў рухавіком падрыхтоўкі паўстання на Лідчыне. Як міравы пасрэднік, Бальтазар Калясінскі карыстаўся павагай сялян і меў на іх вялікі ўплыў. Быў арыштаваны яшчэ да пачатку паўстання, але доказаў супраць яго не знайшлі і выпусцілі з турмы. Улетку 1863 г. па загаду Мураўёва Бальтазар Калясінскі быў зноў арыштаваны і без суда, «по распоряжению Главного Начальника Северо-Западного края», г. з. самога Мураўёва, 5 сакавіка 1864 г. высланы пад нагляд паліцыі ў Кастрамскую губерню, а яго маёмасць секвестраваная. У Расіі жыў у горадзе Калагрыў.

Праз шмат гадоў ссылкі Бальтазар Калясінскі атрымаў права вярнуцца з умовай пражывання ў Варшаве. Едучы праз Пскоў, ён выпадкова сустрэўся з пскоўскім віцэ-губернатарам Аляксеем Жамчужнікавым, з якім пасябраваў яшчэ ў арэнбургскіх стэпах, дзе Жамчужнікаў пачынаў кар'еру чыноўніка. Той дапамог старому знаёмаму застацца ў Вільні. Цікава, што Аляксей Жамчужнікаў – вядомы і па-сапраўднаму таленавіты пісьменнік і паэт, адзін са стваральнікаў Казьмы Пруткова. Нездарма з Бальтазарам Калясінскім сябравалі Тарас Шаўчэнка і Аляксей Жамчужнікаў – лідзянін быў высокаадукаваным чалавекам і цікавым сябрам творчых людзей. А можа і сам нешта пісаў, але пры яго бурным жыцці друкавацца не мог.

Пасля арышту Бальтазара Калясінскага яго месца ў паўстанні заняў брат Станіслаў.

Пасля такога доўгага ўступу, вяртаемся Каэтана Дэрашкевіча, магілу якога знайшлі валанцёры (каардынаты помніка: 53°52'51.9"N 25°18'17.8"E). Дэрашкевіч быў памочнікам і бліжэйшым паплечнікам братоў Калясінскіх. Пра яго мы ведаем з кнігі даследчыцы гісторыі паўстання Зоф'і Кавалеўскай «Гісторыя Лідскага паўстання. Успаміны пра Людвіка Нарбута» (Вільна. 1934.)

Дэрашкевіч выконваў вялікую арганізацыйную працу: збіраў і накіроўваў людзей у лідскі атрад Людвіка Нарбута, купляў і прывозіў на Лідчыну зброю, збіраў грошы, вёў агітацыю сярод насельніцтва. З кнігі Зоф'і Кавалеўскай даведваемся, што Каэтан Дэрашкевіч памёр праз некалькі гадоў пасля паўстання і «пакінуў пасля сабе памяць як пра чалавека годнага, сумленнага і з пачуццём гонару. Пазней Станіслаў Калясінскі паставіў на яго магіле ў Лідзе невялікі надмагільны камень з надпісам: «Каэтану

Дэрашкевічу, вахмістру народнага войска»[130], у 1930-я гг. гэты помнік яшчэ стаяў.

І вось, здаецца, валанцёры знайшлі магільны камень Дэрашкевіча. Чаму здаецца? Бо стары камень вельмі пацярпеў ад часу і немагчыма на 100% гарантаваць, што надпіс на ім расшыфраваны цалкам дакладна. Але на карысць гэтага кажа і тое, што недалёка ад гэтага надмагільнага каменя знаходзяцца некалькі сямейных пахаванняў Калясінскіх, і таму ў любым выпадку, Каэтан Дэрашкевіч знайшоў свой апошні прытулак недзе недалёка.

Для культуры і гісторыі неабходны моцныя падмуркі, бо на пустым месцы вырастае толькі пустацвет. І нас бязмерна радуе, што наша лідская зямля пачынае адчыняць свае таямніцы тым, хто яе па сапраўднаму любіць і жыве дзеля яе.

## Валерыя Цехановіч

Недалёка ад галоўнага ўваходу на могілкі знаходзіцца магіла Валерыі Цехановіч – удзельніцы паўстання 1863 г. Валерыя Цехановіч з Цыбульскіх (1841–1933) нарадзілася 28 красавіка 1841 г. у Мінску. Была дачкой суддзі. Закончыла мінскую гімназію, паглыблена вывучала музыку з хатнімі настаўнікамі. Перад 1863 г. разам з іншымі мінчанкамі ўдзельнічала ў патрыятычных маніфестацыях. За ігру на аргане і спевы патрыятычнай песні была збіта казакамі.

Выйшла замуж за Гіраніма Канстанты Цехановіча (1844–1898), які нарадзіўся ў Мураванай Ашмянцы, і мела з ім дзевяцёра дзяцей: Людвіку-Марыю, Вацлава-Міхала, Люцыяна-Пятра, Багуслава, Валяр’яна, Ядвігу, Юзафа, Станіслава, Антона-Стэфана. Адзін з яе сыноў – Люцыян

[130] Kowalewska Zofia. Dzieje powstania lidzkiego: wspomnienie o Ludwiku Narbucie. Wilno, 1934. S. 42.

быў выкладчыкам Маскоўскага ўніверсітэта, расстраляны ў 1937 г.

Перад выбухам паўстання 1863 г., маладыя сужэнцы пераязджаюць у Плоцк, галава сям'і працуе ў скарбовай управе. Гіранім і Валерыя Цехановічы прынялі чынны ўдзел у паўстанні 1863 г. Гіранім ваяваў у паўстанцкім атрадзе, а Валерыя хавала параненых, збірала прыпасы і падтрымлівала сувязь з паўстанцамі.

У другой палове жыцця Гіраніма спаралізавала, і да канца жыцця ён не мог самастойна рухацца. Пасля смерці мужа, каля 1900 г., Валерыя пераехала з Пултуск, а потым у Насельск, дзе жыла да пачатку 1920-х гг. Потым пераехала да сваёй дачкі Станіславы ў Гродна. Няшчасны выпадак ў гродзенскім касцёле прывёў да калецтва Валерыі, яна перастала хадзіць і да канца жыцця была прыкутая да ложка ці інваліднага вазка. Як ветэран паўстання атрымлівала пенсію ў 110 злотых.

З Лідай Валерыю Цехановіч лучаць два апошнія гады жыцця. Сюды яна пераехала да свайго сына Антона, начальніка ўправы скарбовага кантролю. У Антона Цехановіча ў Лідзе, у 1930 г. нарадзіўся адзіны сын – Лех Цехановіч, інжынер-магістр хіміі, аўтар некалькіх кніг і шматлікіх публікацый па прафесіі. Ён таксама быў сталым аўтарам «Лідскай Зямлі», дзе надрукаваў шэраг базавых артыкулаў з гісторыі Лідчыны. Лех Цехановіч ласкава дапамагаў аднаму з аўтараў з рэдагаваннем яго першай кнігі і ўнёс у яе шэраг найкаштоўнейшых заўваг.

Валерыя Цехановіч памерла ў Лідзе 23 студзеня 1933 г. ва ўзросце 93 гады. Труна з целам паўстанкі была перанесеная з дома, дзе яна жыла (вул. Лідская, 38; дом з нябожчыкам зваўся «дом жалобы») у фарны касцёл 24 студзеня ў 18-00. Жалобнае набажэнства і пахаванне адбылося 25 студзеня

ў 10-00[131]. «Наваградскі Кур'ер» пісаў: «Вялікая колькасць людзей на пахаванні ветэрана паўстання 1863 г. 25 студзеня ў Лідзе адбылося пахаванне Валерыі Цехановіч (з Цыбульскіх), якая памерла 23 студзеня, у гадавіну паўстання. С. п.[132] Цехановіч нарадзілася ў Менску 1 снежня 1840 г. і ва ўзросце 23 гады ўзяла ўдзел у паўстанні»[133].

## Яманты

Недалёка ад Валерыі Цехановіч знаходзіцца помнік Казіміра, Генрыка і Уладзіслава Ямантаў. Казімір Ямант – бацька вядомага мастака Браніслава Яманта і банкіра Ўладзіслава Яманта. У лістападзе 1932 г. газета «Слова» паведаміла, пра смерць шматгадовага кіраўніка лідскага аддзела Віленскага прыватнага банка Уладзіслава Яманта: «... 21 лістапада памёр пасля нядоўгай хваробы»[134].

## Лютаране Эстка і Неўман

Пакуль у 1865 г. не былі адкрыты асобныя могілкі для праваслаўных, на старых гарадскіх могілках хавалі нябожчыкаў усіх хрысціянскіх вызнанняў. Недалёка ад галоўнага уваходу на могілкі знайшоў вечны спакой харунжы Лідскага павета, евангелік з Дакудава Ксаверы Эстка (1787–1855). Яго помнік захаваўся, на ім надпіс: «Браты! Тут пахаваны ваш бліжні, каторы імкнуўся, каб на яго магіле плакалі».

У тастаменце Марыі Радзівіл (жонкі вялікага гетмана ВКЛ і Віленскага ваяводы Януша Радзівіла) падпісанага ёй 29 лістапада 1659 г. у Любчы, сярод шматлікіх іншых асоб фігуруе і Генрык Эстка, слуга евангеліста князя Багуслава Радзівіла, канюшага ВКЛ[135]. Часта сустракаем мы Эсткаў і ў

131 Kurjer Wilenski. №19(2560), 24 stycznia 1933.
132 Святой Памяці.
133 Kurier Nowogródzki. №27(444), 28 stycznia 1933.
134 Słowo. №295(3101), 22 listopada 1932.
135 Акты Виленской археографической комиссии. Т. 12. Вильно, 1883. С. 585–592.

іншых гістарычных дакументах. Вось якія карані мелі пратэстанты Эсткі і іх канфесія на Лідчыне. Не дзіва, што Ксаверы Эстка паходзіць з Дакудава, якое не адно стагоддзе называлася «пратэстанцкім мястэчкам».

Недалёка ад магілы Ксаверыя Эсткі спачывае евангелік-лютаранін Фрыдэрык Неўман, падпалкоўнік (1813–1869). На ягоным надмагіллі, работы віленскага разьбяра Вяржбоўскага, выразана вялікая кніга з надпісам на ёй: «Пане! Скажы яму: “Ідзі да мяне!”, мне скажы, Пане: “Не плач!”. Смуткуючая жонка паставіла гэты помнік»[136].

## Андрушкевічы

Магілы роду Андрушкевічаў знаходзяцца справа ад галоўнага ўваходу на могілкі. Ян Марколін Андрушкевіч (1823–1868) займаў пасаду бургамістра нашага горада. Помнікі сям’і бургамістра горада парушаны, але вядома, дзе яны знаходзіліся. Мемуарыст Мірон Браніслаў Нарбут пісаў пра бургамістра Яна Андрушкевіча (ці «Ивана Степановича Андрушкевича»[137]): «чалавек праўдзівы, энергічны і разважлівы»[138]. Пра ролю бургамістра ў выкараненні п’янства, якое ахапіла наш край пасля паразы паўстання 1831 г., апавядаў той жа Мірон-Браніслаў Нарбут. Ён пісаў, што калі пасяліўся ў Лідзе ў 1846 г. «п’янства ўжо амаль не было, аднак шулерства існавала», але сітуацыя асабліва памянялася калі бургамістрам горада стаў Ян Андрушкевіч, а пробашчам і дэканам лідскім у 1846 г. – былы філамат і сябар Адама Міцкевіча, ксёндз Дзіянісі Хлявінскі[139].

Андрушкевічы валодалі на Лідчыне вялікай нерухомасцю[140] і Ян Марколін нарадзіўся ў адным з бацькоўскіх маёнткаў. У 1845–1852 гг. ён быў начальнікам спачатку 2-га, а потым

[136] Szymielewicz Michał. W cmentarnej ciszy // Ziemia Lidzka. 1937. № 11. S. 118.
[137] Памятная книжка Виленской губернии на 1850. Вильно, 1850. С. 82.
[138] Narbutt M. Lida i Lidziane // Ziemia Lidzka. 1997. № 26–27.
[139] Гл. пра яго: Лаўрэш Леанід. Лідскі дэкан – філамат, ксёндз Дзіянісі Хлявінскі // Лідскі Летапісец. 2018. № 3(83). С. 7–10.
[140] Malewski Czeslaw. Rody szlacheckie na Litwe w XIX wieku. Powiat lidzkim. Wilno, 2005. S. 75.

4-га аддзела паліцыі ў Адэсе. Даслужыўся да чыну «тытулярны дарадца».

Пасля вяртання ў Ліду стаў бургамістрам горада, ажаніўся з Марцянай з Яселаў і меў з ёй 9 дзяцей. У пасаг за жонку атрымаў цукерню ў Лідзе. Гэта цукерня ў 1860-я гг. стала цэнтрам грамадскага жыцця ў горадзе і шматразова згадвалася ў розных мемуарах. З мемуараў Яна Сегеня мы ведаем, што «па правым баку вуліцы Віленскай ... стаіць парафіяльны касцёл, могілкі і фруктовы сад, за ім пляцы і дамы п. Андрушкевіча ...»[141], як бачым, цукерня знаходзілася недалёка ад фарнага касцёла, каля месца, дзе ў той час ад вуліцы Віленскай пачыналася вуліца Каменская (зараз вуліцы Савецкая і Ленінская).

Рускі афіцэр Любарскі, які служыў у Лідзе перад паўстаннем 1863 г., пісаў пра лідскую цукерню Андрушкевіча: «Па-за сямейнымі дамамі, грамадскае жыццё, па ўсталяваным звычаі ..., канцэнтравалася ў цукерні (кандытарскай), якая служыла прыцягальным цэнтрам для ўсёй лідскай інтэлігенцыі. Тут можна было не толькі напіцца гарбаты ці кавы, але і падсілкавацца гарэлкай з закускамі, а ў суседнім памяшканні, якое злучалася з цукерняй ўнутранымі дзвярыма, адпускаліся «гаспадарчыя абеды». Клуба ў гэтым горадзе не было, але кандытарская цалкам яго замяняла, тым больш, што тут да паслуг гасцей былі два більярды, некалькі шахматных дошак і ў бакавым пакоі нават карты. Аматары чытання знаходзілі тут некалькі польскіх газет і адну французскую; рускай не было ні адной, хоць афіцэры былі пастаяннымі гасцямі кандытарскай. Грамадзяне як халастыя, так і сямейныя, лічылі сваім абавязкам штодня пабываць тут; чыноўнікі забягалі ў гэтае месца, ідучы на службу, каб выпіць гарбаты і прачытаць тэлеграмы, а са службы – перакуліць чарку гарэлкі. Калі трэба было па-

141 Сегень Януш. Успаміны пра Ліду канца XIX стагоддзя // Лідскі летапісец. 2001. №12. С. 17.

бачыцца з некім, дык ісці на кватэру было не варта; значна прасцей было сустрэць неабходнага чалавека ў кандытарскай, асабліва ў вячэрнія гадзіны. Тут абмяркоўваліся ўсе навіны, і адбываліся бясконцыя і гарачыя спрэчкі з нагоды падзей ... у Італіі»[142].

Пра сустрэчы ў цукерні з мясцовай інтэлігенцыяй: «Нашы шчырыя сябры і добразычліўцы спакваля імкнуліся ўносіць ідэі ў розум афіцэраў, прадстаўляючы становішча ў такім выглядзе, што нашы народы – натуральныя браты, але што ўрад над абодвума – нямецкі або, ... знаходзіцца пад уплывам немцаў, іх мэта – душыць славян, ... не даваць ім грамадзянскай свабоды і не дапускаць ніякага ў іх разумовага развіцця». Вылучаўся сярод лідзян адзін з камандзіраў будучага паўстання – Баляслаў Колышка[143]: «Асабліва гарачым прапагандыстам падобных ідэй паміж афіцэрствам выступаў у цукерні Колышка, той самы, які пасля (у 1863 годзе) камандаваў ... спачатку самастойна, а потым разам з Сераkoўскім і разам з ім быў узяты ў палон пасля паразы паўстання. Колышка быў малады чалавек гадоў 25-ці, невялікага росту, мажны, з круглым і румяным тварам. Якая была яго прафесія ў Лідзе, я не цікавіўся; здаецца, ён ... быў сынам забяспечанага памешчыка[144]. Гэта быў

142 Любарский И.В. В мятежном крае. (Из воспоминаний) // Исторический вестник. 1895. Т. 59. № 3. С. 819–820.

143 Баляслаў Вікенцевіч Колышка (7.081837–9.06.1863) нарадзіўся ў фальварку Карманішкі (паводле Чэслава Малеўскага – у ваколіцы Гуды) Лідскага павету. З 1860 вучыўся ў Маскоўскім універсітэце, адзін з кіраўнікоў рэвалюцыйнага студэнцтва, прапагандаваў ідэі рэвалюцыйнага саюзу народаў у барацьбе з самадзяржаўем, у 1861 вёў агітацыю ў Лідзе, потым удзельнічаў у студэнцкіх хваляваннях, сутыкненнях студэнтаў з паліцыяй. Ратуючыся ад пакарання, выехаў за мяжу, наведваў ваенную школу эмігрантаў у Італіі. У сакавіку 1863 г. сфармаваў паўстанцкі аддзел у Ковенскім павеце, меў некалькі паспяховых сутычак з царскімі войскамі. Пасля разгрому паўстанцаў узяты ў палон і павешаны ў Вільні на плошчы Лукішкі.

144 Паходзіў з небагатай шляхты.

гарачы ... патрыёт, цытаваў цэлыя маналогі з Міцкевіча ... . Ён увесь час даставаў аднекуль памфлеты Герцана і даваў іх афіцэрам, захоплена адклікаўся пра нібыта незвычайна светлыя і здаровыя меркаванні рэвалюцыйных лісткоў адносна палітычнай будучыні ... і ўвесь час паўтараў: «Прашу вас, панове, не змешваць палітычных паняццяў. Рускі народ – гэта адно, а рускі ўрад – другое. Гэты апошні – наш агульны непрымірымы вораг. Абавязак кожнага патрыёта сваёй краіны – змагацца з ім, аслабляць яго, каб зрынуць тыранію, інакш Расія ніколі не вызваліцца ад унутраных кайданоў рабства. І ў гэтых адносінах рускія могуць смела разлічваць на нашу братэрскую і энергічную дапамогу»[145].

Іншы рускі афіцэр Мяжэцкі[146], які разам са сваім Нараўскім пяхотным палком у 1861 г. быў пераведзены на Лідчыну, таксама пісаў пра гэту цукерню: «Афіцэрства наша жыло замкнёна, у сваёй палкавой сям'і і з абшарнікамі не збліжалася. Афіцэры ж ... з ліцвінаў і палякаў, якіх было даволі шмат у палку, вядома, знаёміліся з гэтымі землеўладальнікамі... . Таму і нам ... здаралася сустракацца з імі часам у нашых таварышаў, а часцей у адзіным у Лідзе тракціры, ці як тутэйшыя называлі гэтую ўстанову – «цукерні» ... шляхціца пана Андрушкевіча, куды паны заходзілі са сваімі знаёмымі афіцэрамі. Пры гэтых сустрэчах абшарнікі спачатку бывалі стрыманыя ..., але калі віно развязвала языкі, пачыналіся гарачыя запэўніванні ў неабходнасці збліжэння двух ... народаў»[147].

## Лясковічы

На поўнач ад капліцы, калі ісці ад увахода на могілкі, стаяць два помнікі з светлага каменю: Фелікса Лясковi-

[145] Любарский И.В. В мятежном крае. (Из воспоминаний) // Исторический вестник. 1895. Т. 59. № 3. С. 820–821, 822.

[146] Мяжэцкі Мітрафан Парфіравіч, афіцэр, потым судовы следчы.

[147] Межецкий М. П. Воспоминания из беспокойного времени на Литве 1861–1863 годах // Исторический вестник. 1898, Т. 73. № 9, С. 826.

ча, сына Юзафа (памёр 05.06.1876 г., жыў 56 гадоў), суддзі Лідскага павета, і яго дачкі Канстанцыі Лясковіч (памерла 01.02.1879 г.). Фелікс Лясковіч герба Кораб валодаў маёнткамі Кір'янаўцы і Бакуны (у 1844 г. 608 дзесяцін), Малая Бярозаўка (у 1844 г. 221 дзесяціна) і Бердаўка[148]. У Віленскай Памятнай кніжцы за 1850 г. у «Камітэце для нагляду за правільным продажам алкагольных напояў» як «дэпутат» фігуруе калежскі рэгістратар Фелікс Іосіфавіч Лясковіч[149].

Забавай нашых землеўладальнікаў у тыя часы, была гадоўля мядзведзяў. Фелікс Лясковіч ў Кір'янаўцах меў некалькі такіх «хатніх» жывёл, якія стала рабілі розныя штукі і паскудствы. Адзін з гэтых мішак надта любіў ездзіць у фурманцы – абы толькі панская брычка Лясковічаў прыязджала пад ганак Кір'янаўскага двара, мядзведзь адразу ўзлазіў на лаву брычкі, і фурман вазіў яго вакол дома. Неяк да Фелікса на непрацяглы час прыехаў госць, і таму коней не распрагалі. Брычка стаяла каля ганка, фурман драмаў ... калі раптам нехта пачаў моцна трасці яго за плечы. Заспаны вазніца аглянуўся і ўбачыў мядзведзя! Гэта мішка Ляскоўскіх ужо сядзеў у брычцы на панскім месцы і патрабаваў ехаць наперад! Напалоханы фурман імгненна збег з козлаў, а коні пачулі звера і панеслі. Язда была добрая, але кароткая. Брычка разбілася, коні пакалечыліся. Мядзведзь ніякім чынам не пацярпеў, але госць быў моцна незадаволены[150].

Малодшы сын Фелікса – Войцех Альберт Лясковіч, па адной версіі, быў арыштаваныя за нейкія размовы ў мястэчку Беліца. Па другой версіі ён быў арыштаваны за тое, што ў Наваельні папракаў ксяндза за адмову прачытаць Маніфест Народнага ўрада, па-трэцяй (версія Гіпаліта

148 Malewski Czeslaw. Rody szlacheckie na Litwe w XIX wieku. Powiat lidzkim. Wilno, 2005. S. 163.
149 Памятная книжка Виленской губернии на 1850 г. Вильно, 1850. С. 84.
150 Ziemia Lidzka. 1939. № 4–5. S. 151.

Корвін-Мілеўскага), што нейкі шпіён падслухаў як 17-гадовы студэнт віленскі шляхецкага інстытуту, стоячы з паненкай на тратуары, сказаў, што «французы ўжо высадзіліся ў Вержбалова!».

Вось што піша пра яго багаты землеўладальнік і далёкі сваяк Гіпаліт Корвін-Мілеўскі які, як і яго бацька, не быў прыхільнікам паўстання, а быў прыхільнікам, так званай, «арганічнай працы»[151]: «Як сёння памятаю – палявалі мы ў мамінага дзядзькі ў Кір'янаўцах. Пасля вячэры я сціпла сяджу ў кутку. Па гасцёўні ходзіць чубаты юнак, копія Адама Міцкевіча 1825 года і ў сваёй прамове ўсе скасоўвае. Не будзе дваранства, не будзе ўласнасці, не будзе ўрада, не будзе духавенства і г. д. Бацька яму цярпліва: "А што будзе на месцы ўсяго гэтага?". Хлопец адкідвае чупрыну назад, арлінымі вачыма азірае ўсіх, робіць паўзу і кажа: "Будуць людзі ... будзе народ!!!...". Гэта была эпоха "натуральнага розуму" да якога не дакранулася ніводная навука»[152].

У турме Ляскоіч выпадкова апынуўся разам з нейкім Адамам Сасёнкам, які падгаварыў яго да складання фальшывага прызнання і ўключэння ў гэтую паперу як мага большай колькасці асоб. Ён пераконваў, што так справа пойдзе лепш і скончыцца ... жартам. Трэба сказаць, што і сталінскія вязні таксама часта ў сваіх паказаннях зыходзілі з той жа логікі. Яны лічылі, што калі запісаць ў японскія шпіёны ўсіх сваіх знаёмых ці прызнацца, што сам капаў падземны ход у Англію, дык нават крэтын зразумее, што

151 Пад «арганічнай працай» мелася на ўвазе сацыяльная, навуковая, асветніцкая і мастацкая дзейнасць, якая магла складацца з самадапамогі, спрыяння эканамічнаму развіццю края і развіццю простых людзей, стварэнню бібліятэк, шматлікіх перыядычных выданняў і навукова-асветніцкіх таварыстваў. Творцы павінны былі пісаць кнігі, карціны ці музыку а не займацца падпольнай палітычнай дзейнасцю. У выніку, менавіта такая праца павінна была прывесці да мірных і станоўчых зменаў у грамадстве.

152 Korwin-Milewski Hipolit. Siedemdziesiąt lat wspomnień (1855-1925). Poznań, 1930. S. 41.

гэта не можа быць праўдай. Але, гэтак яны толькі дапамагалі «органам» выконваць план і губілі нявінных людзей.

Але вернемся да Лясковіча. Гэты Сасёнка з невядомых прычын агаварыў сябе, бацькоў і сястру ў распаўсюдзе Маніфеста, пастаўках паўстанцам зброі і г. д. Нудзячыся ў вязніцы, ён казаў Лясковічу, што будзе весялей, калі больш знаёмых апынецца разам з імі ў астрозе. Недасведчаны маладзён прыслухаўся да нашэптвання таварыша, а калі выклікалі на допыт, ваенны начальнік павета падпаіў яго віном, і той скампраметаваў сябе і іншых асоб.

Лясковіч на ваенным судзе 6(18) мая 1863 г. сведчыў, што свае першыя паказанні, дадзеныя падчас першапачатковага следства ён пацвярджае, але іншыя, якія кампраметавалі перад уладамі Браніслава Нарбута, міравога пасрэдніка Калясінскага, Вільгельма Грабоўскага і абшарніка Гадычэўскага – абвяргае, бо яны былі вымушаныя гвалтам праз «насільны загад і прымус» палкоўніка Казаналі[153], які казаў, … што «я мушу абавязкова напісаць гэтак, як ён пачаў мне дыктаваць». Альберт Лясковіч не адыгрываў значнай ролі ў паўстанні, з'яўляўся звычайным прыхільнікам і пасля суду быў вызвалены, аднак потым зноў, ужо па загаду толькі што прыехаўшага Мураўёва, арыштаваны і пакараны смерцю «в пример и страх другим»[154].

У рапарце ад 24 мая па старому стылю віленскага каменданта камандуючаму войскамі Віленскай акругі месца страты Альберта Лясковіча і ксяндза з Ваверкі Зямацкага было акрэслена такім чынам: «на базарной площади возле костёла св. Якова».

153 Ці Казаўлі, вайсковы начальнік Ваўкавыскага і магчыма лідскага паветаў, палкоўнік.

154 Кавалеўская Зоф'я. Гісторыя Лідскага паўстання: успаміны пра Людвіка Нарбута // Наша Слова. 2021. 30 чэрвеня 2021.

Маёмасць Войцеха Альберта Лясковіча на падставе распараджэння віленскага губернатара ад 27.06.1863 г. і пастановы Віленскага грамадзянскага праўлення ад 23.07.1863 падлягала секвестру[155].

Войцех Ляскоўскі быў расстраляны 5 чэрвеня 1863 г. разам з ксяндзом з Ваверкі Лідскага павета Раймундам Зямацкім (ксёндз зачытаў з амбона Маніфест паўстанцкага ўрада). Пляменнік Раймунда Зямацкага лекар Юзаф Зямацкі ў 1889 г. пазнаёміўся з жанчынай (па паходжанні віленкай), якая, як нарачоная афіцэра расійскай жандармерыі, прысутнічала на расстрэле ксяндза Зямацкага. Жанчына расказала: «Памятаю, што гэта быў чалавек ужо паважнага веку, добра прыпамінаю яго рысы, меў ужо сівыя валасы, быў вельмі аслаблены хваробай, якую перажыў у турме, не мог ісці пешшу, быў прывезены на дрожках. Пасля вываду яго з падамініканскіх муроў, дзе была турма, нейкі расійскі вайсковец высокага рангу падышоў да яго прасіць дабраславенства. Справа ў тым, што сярод расійцаў існуе забабон, што дабраславенства прыгаворанага на смерць прыносіць шчасце ў будучым жыцці. Ксёндз Зямацкі дабраславіў яго знакам крыжа, а той пацалаваў яму руку. Адразу пасля залпа карабінаў ксёндз павіс бяссільна на вяроўках, якімі быў прывязаны да слупа; бачыла потым, калі цела было адвязана ад слупа і ляжала ўжо на зямлі, сутана на грудзях была моцна заліта крывёю, а некалькі плям крыві аказалася пазней і на сівых валасах. Побач з ксяндзам Зямацкім, за некалькі крокаў, таксама праз расстрэл, быў пакараны смерцю вельмі малады чалавек Лясковіч. Целы іх абодвух адразу пасля экзекуцыі ўкінулі ў магілы, зага-

[155] Матвейчык Д.Ч. Удзельнікі паўстання 1863–1864 гадоў біягр. слоўнік. 2016. С 354.

дзя прыгатаваныя перад слупамі, да якіх былі прывязаны асуджаныя. Целы засыпалі зямлёй, магілы выраўнялі»[156].

Скажу некалькі слоў пра Юльяна – старэйшага сына Фелікса Лясковіча. Да 1863 г. Юльян Лясковіч займаў пасаду міравога пасрэдніка[157]. Пасля паўстання быў сасланы на Урал у горад Кунгур Пермскай губерні. Сасланая ў Кунгур Ядвіга Прабяндоўская ў сваіх мемуарах пісала пра Юльяна Лясковіча як выбітную і інтэлігентную асобу[158].

Вялікі след у гісторыі Лідчыны пакінула дачка Юльяна Лясковіча (унучка Фелікса Лясковіча), Марыя Лясковіч. Раскажу пра гэтую цікавую асобу, грунтуючыся на ўспамінах яе дальняга сваяка Караля Лясковіча.

Рамантычныя пачуцці і глыбокая вера ў пазітыўныя ідэалы «арганічнай працы» сфармавалі індывідуальнасць маладой панны Марыі Лясковіч. У дзяцінстве яна разам з бацькамі вярнулася з глыбіні Расіі – з-пад Пярмі, куды яе бацька Юльян быў сасланы «на пасяленне» як палітычны злачынца. З бацькамі яна жыла ў сваім маёнтку Пяткаўшчына, за 3 км ад мястэчка Жырмуны Лідскага павета. Маёнтак меў дрэнную, пясчаную зямлю з занядбанымі драўлянымі пабудовамі і таму не цікавіў рускую адміністрацыю. Гэта ўратавала гаспадарку ад канфіскацыі. Да таго ж Юльян быў больш асцярожны за свайго брата Альберта-Войцеха, якога расстралялі ў 1863 г. Непасрэднага ўдзелу ў паўстанні Юльян не браў, аднак патрыятычнай дзейнасці не пазбягаў, што і прывяло да ссылкі.

Менавіта тут, у Пяткаўшчыне, Марыя спазнала вялікае каханне. Яна рамантычна закахалася ў кузена, а той, не

[156] Нарковіч Лiлiяна. Раймунд Зямацкі // Лідскі Летапісец. 2013. № 3(63). С. 67.
[157] Памятная книжка Виленскай губернии на 1863 г. Вильно. 1863. С. 120.
[158] Karol Laskowicz: (Kresowy dwór i jego sąsiedzi). Opracowanie na podstawie wspomnień. // Biblioteka Zakładu Narodowego im. Ossolińskich we Wrocławiu, sygn. 15480/II. S. 177.

падазраючы пра глыбіню яе пачуццяў, расказаў пра свой будучы шлюб з паннай Тупальскай. Гэта стала паваротнай кропкай у жыцці Марыі Лясковіч. Яна прысягнула, што да канца жыцця застанецца вернай першаму каханню і не выйдзе замуж, а ўсё жыццё прысвеціць службе народу, менавіта гэтаму вучыў яе бацька. Адразу прыступіла да рэалізацыі сваёй клятвы: арганізавала ў Пяткаўшчыне таемную школу. Не мела патрэбнай кваліфікацыі, але выкладала ў першым класе як магла.

Хутка памёр яе любімы бацька. Гаспадарыць пачаў старэйшы, легкадумны брат Эдмунд. У духоўнай самоце Марыя знайшла апору ў асобе вікарыя жырмунскага касцёла, маладога ксяндза Генрыка Бальцэвіча. Ён таксама натхніў яе ідэяй працаваць для людзей. Досыць часта наведваў Пяткаўшчыну і ахвотна дапамагаў у справе нелегальнага навучання. Высокі, худы і прыстойны, меў розум даследчыка. Гарэў унутраным полымем, патрэбай чыну, быў рэвалюцыянерам у сутане. Яго кніга пра ролю святарства ў свеце, узбудзіла гнеў касцельных уладаў[159]. Да таго ж яна была надрукавана без дазволу касцельнай іерархіі. Суд біскупаў прыгаварыў ксяндза на двух гадоў пакутаў у кляштары. Вікарый не згадзіўся з выракам, зняў сутану і пачаў жыццё звычайнага чалавека.

Вяртанне дахаты было немагчымым, і былы ксёндз пачаў працаваць хатнім настаўнікам. Пра рэвалюцыйнасць ксяндза і Марыі даведаўся спраўнік, і над дзяўчынай павісла пагроза паўторнай высылкі, таму яны вырашылі разам перасяліцца ў Варшаву і пачаць вучыцца на настаўнікаў.

Але Марыя не дазволіла адносінам пайсці далей за сяброўскія. Кватэры знялі ў розных раёнах горада і не спатыкаліся ў сваіх прыватных кватэрах. Бальцэвіч да

---

[159] Гл: Bolcewicz Henryk. W kwestii bywania księży na koncertach publicznych. Warszawa, 1903.

1905 г. стаў сапраўдным педагогам, настаўнікам гісторыі і польскай літаратуры, атрымаў вышэйшую адукацыю і навуковую ступень доктара (PhD)[160]. Першапачатковая адукацыя Марыі была меншай, і яна атрымала толькі права настаўніцы пачатковай школы, аднак лічыла, што так будзе нават лепш для яе мэты жыць для людзей

Абодва былі дзецьмі дзвюх эпох: рамантызму і пазітывізму. Іх «арганічная праца» заўсёды праходзіла «ў нябёсах», і іх жыццё было цалкам прысвечана гэтай працы, але цякло спакойна, манатонна і бедна. Заўсёды меўся нехта, хто патрабаваў дапамогі, і настаўніцкіх заробкаў ледзь хапала для сціплага жыцця.

Калі ў выніку сямейных падзелаў маёнтка Ішчална Марыя атрымала ў 1924 г. участак пад школу, мела яна ўжо 40 гадоў настаўніцкага стажу. І хоць у краі не хапала настаўнікаў, трэба было думаць пра пенсію. Толькі сэрца не пагаджалася з гэтым.

Марыя, якую ў сям'і заўсёды звалі «цёця Марыня», у спадкі ад Важынскіх атрымала права на адну чацвёртую частку маёмасці свайго пляменніка Юльяна. Таму, пры падзеле яна выказала жаданне, каб адмыслова для яе пабудавалі школу для дзяўчат. Жадала атрымаць пляц у 4 га каля Ішчалнянскага тракту і пашкоджаны падчас вайны будынак даўняй коннай пошты. Патрабавала грошы на рамонт і на будаўнікоў, грошы на абсталяванне і дровы для ацяплення ўсіх школьных будынкаў.

Жаданне цёці Марыні было выканана. Калі яна пачала сваю цяжкую справу, мела больш за 60 гадоў на карку і ніякага гаспадарчага досведу. Аднак вера і запал могуць зрушыць горы. Згорбленая, маленькая Марыня, няспрытная ў рухах і падобная на птушку, мела сівыя валасы, грубыя

[160] Яго дысертацыя была надрукаваная, гл: Bolcewicz Henryk. Kant a Hume. Warszawa, 1913.

блізарукія акуляры на носе, на вуснах альбо ўсмешку альбо капрыз – самую моцную зброю ў барацьбе з мужчынамі: бо як было не ўступіць шляхетнай, безабароннай старой. Пры гэтым для сабе яна нічога не патрабавала. Марыя мела дзіўна маладыя рукі – мяккія, пяшчотныя, не для працы, але гэтыя слабыя рукі здолелі 15 гадоў цвёрда трымаць школьныя справы. Ідэалізм і сціпласць цёці Марыні разам з яе ўяўнай бездапаможнасцю складаліся ў зброю, якая крышыла ўсе перашкоды.

Яе школьная праца пачалася, расквітнела і асягнула пэўных вынікаў пры канцы жыцця. Дарога не была лёгкай. Летам 1924 г. сямейная рада Лясковічаў аддала ва ўласнасць цётцы Марыні дзялку з паўднёвага боку гістарычнага тракту. Нанялі дамарослага будаўніка, які падаў спіс неабходных рэчаў. Дрэва для школы было нарыхтавана зімой 1924/25 гг. Пакуль дрэва сохла, увесну было зроблена асушэнне пляцоўкі, і пачаўся рамонт будынкаў. У другой палове 1925 г. дрэва апрацавалі і папілавалі, над школай надбудавалі каркас даху, тое ж зрабілі з адной са стайняў. Усю тэрыторыю школы агарадзілі. Перад восеньскімі дажджамі школу пакрылі дахоўкай, а стайні – этэрнітам. Дадам, што 1925 г. з-за фінансавай рэформы Ўладзіслава Грабскага быў самым цяжкім у эканамічным сэнсе за ўсе 1920-я гг.

У 1926 г. быў закончаны першы этап будоўлі. У школе падрыхтавалі першы паверх і два пакоі на мансардзе, а таксама палову будынка стайні. 1-га верасня 1926 г. школа была асвечана і пачала працу. Напачатку ледзь знайшлося 20 дзяўчынак з ваколічных вёсак і мястэчак, і таму на работу прынялі толькі дзвух настаўніц. Вучобу пачалі са спазненнем. Фінансаванне школы было чыста прыватным, а вольныя грошы ў маёнтку Ішчална меліся не заўсёды.

Першы год быў суцэльнай імправізацыяй, адмысловай праграмы не мелася. Аднак на наступны навучальны год

праграма стабілізавалася. На паддашку былі адрамантаваны пакоі, і цалкам закончаны рамонт галоўнага будынка, закончаны гаспадарчыя пабудовы: шопы для жывога інвентару, стадолы для ўраджаю, піўніцы пад бульбу, лядоўні і вазоўні на вазы і аграрныя машыны.

Школьны будынак меў 200 м² карыснай плошчы і дзяліўся на дзве паловы шырокім калідорам, у які выходзіла 6 дзвярэй – адны на вуліцу, другія на падворак і чатыры ва ўнутраныя памяшканні. Улева ад галоўнага ўвахода месціліся дзве вялікія класы-працоўні: ткацкая і кравецкая. З правага боку ад фронту будынка была канцылярыя і жылы пакой кіраўніцы, а ў бок падворка – кухня і клас, у якім вучаніцы таксама і снедалі. У ткацкім класе стаялі двое вялікіх кроснаў, каб ткаць розныя тканіны. У кравецкім класе меліся два вялікія сталы.

У 1927 г. пабудавалі яшчэ два мансардныя пакоі. Школа атрымала трэці клас, колькасць вучаніц павялічылася да 60. Скончана перабудова другой стайні, пашыраны інтэрнат, і туды перанесена кухня, сталовая і пакой кухаркі.

Грошай не хапала, і павятовы школьны інспектар узяў выкладчыкаў ў свой штат, узаконіў навучальную праграму і ўзяў навучанне пад свой кантроль. Школа атрымала публічныя правы, аднак заставалася прыватнай, і фундатары пакрывалі ўсе астатнія выдаткі.

Праз дачку ўладальніка гуты «Нёман» замовіла аконнае шкло для школы са значнай зніжкай. Акрамя гэтага гута падаравала інтэрнату дзве скрыні розных шкляных вырабаў: шклянкі, вазы для кветак, сподачкі, міскі і місачкі, філіжанкі, падстаўкі, скрынкі для гузікаў і шпілек, падсвечнікі і іншыя неабходныя рэчы. За мінімальную аплату, практычна за «Бог заплаць» два лекары – др. Чыж і др. Конрад вялі лекарскую апеку над усімі вучаніцамі.

На штогадовыя выставы школьных работ прыбывалі суседзі з блізкіх і далёкіх ваколіц. Пасля паказу адбываўся продаж вырабаў. Сурвэты, кілімы, ходнікі, сукні і блюзкі, выробленыя на працягу школьнага года, знаходзілі сваіх пакупнікоў. Вельмі шмат школьных кілімаў і сурвэтак набыў ішчалнянскі двор.

Шчаслівая «цёця Марыня» радавалася, цешылася сваёй школай. Была яна тыповым рамантыкам часоў пасля паўстання 1863 г.

Пасля атрымання школай публічных правоў, пачалі прыязджаць вучаніцы з больш далёкіх краёў. У 1929 г. пляменнік Марыі Юльян выкарыстаў добрую кан'юктуру і прадаў вялікую партыю лесу па добрай цане. Доля Марыі ў здзелцы склала 60 000 злотых. Ніколі яна не мела такіх вялікіх грошай і вырашыла ўкласці іх у школу.

4-х гектарная школьная дзялка была выдзеленая з 26-ці гектарнага поля. Рэшта гэтага 26-ці гектарнага поля была аддадзена ва ўласнасць легатарыю (суспадчынніку) Марыі Важынскай (Важынскія – гаспадары Ішчалны да 1920 г.), яе даўняму аб'ездчыку Леанарду Роўбе. Потым у доме Роўбы, у лепшым пакоі жыў пенсіянер, сябар цёці Марыні, варшаўскі выкладчык і былы ксёндз Бальцэвіч.

Колькасць вучняў вырасла да 75 дзяўчатак. Умовай паступлення ў школу стала пасведчанне аб атрыманні 7-мі гадовай адукацыі. Трохгадовы курс школы ўключаў наступныя спецыяльнасці: кравец бялізны, кравец верхняй вопраткі, ткацтва на ручных варштатах, ручныя работы, дамаводства і г. д. Колькасць педагогаў павялічылася да 8 асоб. Бальцэвіч узяў на сябе выкладанне гісторыі і літаратуры, новая кваліфікаваная кухарка выкладала дамаводства, садоўнік з Ішчалны вучыў практычнаму садаводству і агародніцтву.

У пансіянаце жылі 50 вучаніц, астатнія паходзілі з суседніх вёсак. На былым участку Роўбы ў цяні клёнаў стаялі лаўкі і сталы. Тут улетку была сталовая. Дзяўчаты ў зацішным месцы рэчкі, закрытым ад тракту зеленню, зрабілі пляж. Не ўсе вучаніцы падчас вакацый ехалі дадому, бо не ўсе мелі ў бацькоў прыемную хатнюю атмасферу. Для іх домам стала школа, і замест маці – кіраўніца школы.

Школа знаходзілася ў поўным росквіце, і разам з ёй самыя шчаслівыя гады свайго жыцця праходзілі ў двух ідэалістаў. Нічога, што абодва перасягнулі сёмы дзесятак, нічога, што Бальцэвіч не атрымліваў заробку, а ўсе грошы Марыні ішлі ў касу школы. Нічога, што абцасы абутку кіраўніцы школы былі ўшчэнт зношаны, а падэшвы дзіравыя, бо чарговая, прыгатаваная на пакупку абутку, купюра ў 20 злотых, заўсёды ішла на іншыя патрэбы. Жыццё старых сяброў, як чыстае полымя, гарэла на ахвярным алтары для народа. Ажыццяўляліся галоўныя мары іх жыцця.

Марыя Лясковіч памерла вясной 1939 г. Труна, заваленая кветкамі, стаяла ў яе пакоі, праз адчыненае вакно вечарам быў чутны пошчак салаўя. ... Усім добра вядомая постаць Бальцэвіча скурчылася, згорбілася, і ён сунуўся за трунай адзінокі і асірацелы. Зрок яго быў чужы і пусты.

За трунай ішоў увесь род Лясковічаў[161].

Вось што можна расказаць пра ўнучку пахаванага на лідскіх могілках Фелікса Лясковіча.

## Капліца на могілках

Ксёндз-рэктар лідскага піярскага калегіума Юзафат Вайшвіла пісаў: «Капліцу Узнясення Крыжа на могілках

[161] Karol Laskowicz: (Kresowy dwór i jego sąsiedzi). Opracowanie na podstawie wspomnień. // Biblioteka Zakładu Narodowego im. Ossolińskich we Wrocławiu, sygn. 15480/II. S. 214–222.

з дапамогай парафіян пабудаваў з дрэва кс. Вінцэнт Нарбут, пробашч і дэкан лідскі … на ахвяраванні гараджан»[162].

У 1805 г. ксёндз Вінцэнт Нарбут пабудаваў гэту досыць вялікую драўляную капліцу, якую асвяціў ў гонар св. Барбары, панны і пакутніцы, як патронкі добрай смерці, абраз гэтай святой знаходзіўся ў вялікім алтары. Імяніны Барбары каталіцкі касцёл адзначае 4-га снежня. Гэтая святая таксама лічыцца апекункай людзей, якія рызыкуюць жыццём у сваёй прафесіі: жаўнераў, пажарных і т. п. Пасля скасавання ў Лідзе касцёла кармелітаў, пажару касцёла піяраў і падчас рамонту фары, з дазволу дыяцэзіяльных уладаў, сюды былі часовы перанесеныя парафіяльныя набажэнствы. У 1848 г. капліца была грунтоўна рэстаўравана. У 1905 г. невядомы злачынец падпаліў капліцу, але пажар быў патушаны. У капліцы калісьці меўся стары арган, перанесены сюды з фары. У 1904 г. гэты арган перададзены філіі ў Крупава, дзе ён згарэў разам з касцёлам у 1919 г.[163]

У 1928 г. быў зацверджаны новы праект драўлянай капліцы, але ён не быў рэалізаваны.

У 1929 г. студэнтам архітэктуры К. Раствароўскім распрацаваны яшчэ адзін праект, які атрымаў добрыя водгукі ад спецыялістаў. Вельмі павольнае будаўніцтва муравалай капліцы пачалося ў 1930 г., і толькі ў 1937 г. пабудова была пакрыта дахам. Да 1939 г. работы не былі скончаны. У 2000–2003 гг. быў праведзены грунтоўны рамонт, унутраная атынкоўка, устаўлены вокны, дзверы і інш.[164].

---

162 Wspomnienie domku Pijarów Lidzkich. Napisał ks. Jozafat Wojszwiłło, ostatni rektor Pijarów lidzkich // Biblioteka Zakładu Narodowego im. Ossolińskich we Wrocławiu., sygn. 3667/III. S. 30.

163 Szymielewicz Michał. W cmentarnej ciszy // Ziemia Lidzka. 1937. № 11. S. 117.

164 Korzeniowska Anna, Mączewska Katarzyna. Kaplica cmentarna p.w. Św. Barbary w Lidzie // Koscioly i klasztory rzymskokatolickie dawnego wojewodztwa wilenskiego. Krakow, 2008. T. 2., cz. III. S. 176.

Добра памятаю, што ў сярэдзіне 1970-х гг., калі могілкі былі падобныя на добра засмечаныя джунглі, капліца без вокнаў і дзвярэй таямніча стаяла ў цені дрэў. Унутры пабудовы ляжала шматгадовае смецце, бачны былі сляды вандалізму.

На могілках здаўна меўся драўляны шпіталь, пасля яго зруйнавання жабракі не мелі дзе жыць. Лідскі экс-піяр ксёндз Вайшвіла пісаў: «На могілках стаіць драўляны шпіталь невядома кім і калі пабудаваны, але ўжо рассыпаецца і вельмі стары». Панна Марыя Ле Форт, гувернантка, адпісала для тутэйшых жабракоў 66 рублёў срэбрам. Ксёндз Юзафат Вайшвіла, які дажываў свой век у лідскай парафіяльнай плябаніі, дадаў яшчэ 150 рублёў, і за гэтыя грошы ў 1845 г. пабудавалі новы драўляны шпіталь. У 1856 г. тут жылі 12 жабракоў. Ксёндз Вайшвіла ўспамінаў: «Гувернантка Марыя Лэ Форт ласкава вырашыла запісаць для тутэйшых убогіх 66 руб. срэбрам, якія захоўвала. Яна парадзіла, каб грошы былі ўжыты на пабудову новага для іх памяшкання ... Пачалі работы 13 ліпеня 1845 г., а закончылі 13 верасня. З'явіўся новы, прыгожы і светлы драўляны дом на два пакоя. ... Новы шпіталь на 12 асоб каштаваў 120 руб., 12 рублёў пайшло на дах сакрыстыі касцёла, а рэшты, у памеры 18 рублёў, хапіла на новую гонту для мураванага шпіталя каля касцёла» [165].

Калі шпіталь на могілках струхнеў, пані Лясковіч пабудавала за агароджай могілак новы драўляны шпіталь, які існаваў яшчэ пры канцы 1930-х гг.[166]

## Магілы ксяндзоў

З паўднёвага боку ад капліцы св. Барбары знаходзіліся магілы лідскіх ксяндзоў: Юзафа Сянкевіча, пробашча

165 Wspomnienie domku Pijarów Lidzkich. Napisał ks. Jozafat Wojszwiłło, ostatni rektor Pijarów lidzkich // Biblioteka Zakładu Narodowego im. Ossolińskich we Wrocławiu., sygn. 3667/III. S. 32.
166 Szymielewicz Michał. W cmentarnej ciszy // Ziemia Lidzka. 1937. № 11. S. 117.

і дэкана лідскага († 1905 г.); Альберта Стэцкага, місіянера († 1898 г.); Антонія Кулакоўскага, місіянера († 1904 г.); Станіслава Пацынкі, вікарыя († 1918 г.); Яна Кандрата, вікарыя († 1924 г.). У 1986 г., ратуючы ад варварскага знішчэння, парафіяне перанеслі магілы гэтых ксяндзоў на Слабадскія могілкі. На Слабадскіх могілках усе шараговыя ксяндзы пахаваны пад агульным помнікам, пры гэтым старое надмагілле ксяндза Пацынкі засталося на ранейшых могілках.

Юзаф Сянкевіч, ксёндз-пробашч і дэкан ў Лідзе ў 1889–1905 гг., выкладчык ў Лідскай павятовай школе. Лідзянам у свой час запомнілася як Сянкевіч у выказванні сваёй прыхільнасці да царскага трона перасягнуў нават праваслаўных святароў. Аднойчы лідскі дэкан у святочныя дні аздобіў касцельную браму транспарантам, на якім была намалявана манаграма цара і царыцы з надпісам «Боже царя храни»[167].

Вікарый лідскай фары з верасня 1898 па студзень 1899 г. ксёндз Юзаф Бародзіч успамінаў:

«Калі я прыехаў ў Ліду пробашчам, дэканам і катэхітам быў 60-ці гадовы стары: хворы і худы [кс. Юзаф Сянкевіч]. Не дзіва, што парафія была занядбана. Жывучы ў сталай небяспецы з боку паліцыі і папа, ён ратаваўся ад іх незвычайнай гасціннасцю. А яны злоўжывалі гасціннасцю пробашча гэтак моцна, што пры канцы яго плябанія замяніла ім рэстаран і дом картачнай гульні. Сам гаспадар сядаў за картачны столік разам са сваімі гасцямі, каб адмыслова прайграць ім грошы і такім чынам даць хабар. Таму з'яўляўся кавалерам розных ордэнаў імперыі і нават быў адзначаны манархам крыжам з надпісам "Доброму пастырю за хороший пример".

Відавочна, адразу пасля прыезду ў Ліду, ксёндз-дэкан накіраваў мяне з візітам да паліцэйскага спраўніка

[167] Szymielewicz Michal. Ze starej książki // Ziemia Lidzka. 1937. №12. S.141.

Ляўданскага. Гэты чыноўнік прапанаваў мне прыняць яго пратэкцыю і прачытаў лекцыю пра лаяльнасць і правільныя думкі. Пры гэтым страшыў, што ў адваротным выпадку я буду мець цяжкія наступствы. У канцы падабрэў і ласкава прапанаваў мне быць паслухмяным, бо, пэўна, я ёсць "лепш выхаваным" ксяндзом, чым мой папярэднік, г. з. менш "фанатычным". Пры гэтым не забыўся нагадаць мне, што "рука руку мые", што кожны вікарый павінен плаціць яму па сто рублёў штогод за яго працу па абароне вікарыя перад губернатарам.

Пасля спраўніка прыйшла чарга папа [Каяловіча]. Гэты мне прама сказаў, што трэба падпарадкоўвацца ўладам і быць вольным ад усялякага "фанатызму":

– Тутэйшыя людзі спяць, – сказаў ён. – Няхай спяць, і не трэба іх будзіць!

Афіцэр жандармерыі прыняў мяне з вялікай пачцівасцю і засведчыў, што мне ў Лідзе будзе добра, калі я буду "умець жыць"»[168].

[168] Лаўрэш Леанід. Ксёндз Юзаф Бародзіч і яго успаміны, датычныя Ліды // Лідскій Летапісец. 2020. 1(89). С. 76–80.





*Старая, драўляная капліца*




*Капліца на старых могілках, здымкі Тамары Зенюкевіч, другая палова 1980-х гг.*



*Старыя могілкі са званіцай Буткевіча, малюнак 1917 г.*




*Сялянка купіла труну на Лідскім рынку, 1915 г.*



*Пахаванне 05.04.1938 г. Зыгмунта Стэфановіча з фальварку Малейкаўшчызна (знаходзіўся на поўнач ад сучаснай вёскі Малейкаўшчызна). Працэсія накіроўваецца ад фарнага касцёла да старых гарадскіх могілак.*




*Рэклама пахавальнай фірмы, вуліца Замкавая, 15.*




*Крыж на магіле 40-ка закладнікаў, 1930-я гг.*

## Магілы лідскай шляхты

Яшчэ далей на поўдзень ад капліцы: «... могілкі гусцей запоўнены зраўнаванымі з зямлёй магіламі дробных сельскіх гаспадароў і шляхты: Ёдкаў, Болтуцяў, Таўгінаў, Хрулёў[169], Астравухаў, Падгайных, Бунькоў, Капачэляў, Стрыбуцёў, Клышэйкаў, Ходзькаў, Хутных, Ракаў, Буракоў, Трацякоў, Касякоў, Семакоў, Шостакаў, Латушкаў, Саладухаў, Кісялёў, Сегеняў[170], Брэйваў, Чарнякоў, Майсакоў, Пуйдакоў, Чарнавусаў, Белавусаў і г. д. і г. д.», – пісаў Шымялевіч[171].

## Эрнест Мэдэм і іншыя помнікі з надпісамі на рускай мове

Трохі глыбей, за капліцай пад помнікам (вялікай каменнай глыбай), спачывае барон Эрнест Мэдэм († 1846 г.). Помнік нябожчыку паставілі таварышы па зброі з Галіцкага палка егераў. Пра Мэдэма вядома, што ён быў лідскім земскім спраўнікам, адстаўным маёрам, поўнае яго імя – Эрнест Аляксандравіч барон Мэдэм[172].

У метрычнай кнізе лідскай царквы за 1846 г. запісана: «25/27 лютага (памёр/ пахаваны) Эрнест Аляксандравіч Мэдэм, спраўнік Лідскага земскага суда, маёр. Узрост – 40 гадоў (на помніку пазначаны ўзрост 36 гадоў – Л. Л.), памёр ад гарачкі. Лютэранскага веравызнання. Рэлігійны абрад правялі: Міхайлаўскай лідскай царквы протаіерэй Самсон Брэн з дыяканам Іванам Гузоўскім і панамаром Іванам Вяршынскім. Пахаваны на Лідскіх могілках»[173].

---

[169] Гл: Лаўрэш Леанід. Лідскія Хрулі герба "Праўдзіч" // Герольд Litherland. 2022, №23. С. 145–150.

[170] Гл: Jak piękne są wspomnienia. Opowiadania rodzinne. Opracowane przez Janusza Sehenia. Warszawa, 2024.

[171] Szymielewicz Michał. W cmentarnej ciszy // Ziemia Lidzka. 1937. № 11. S. 119.

[172] Памятная книжка Виленской губернии на 1845 год. Вильна, 1845. С. 105.

[173] ДГАЛ. Ф. 605. Воп. 5. Спр. 158. А. 151.

Заўважым, што ў 1846 г. праваслаўны святар, дабрачынны Брэн гэтыя могілкі называе проста Лідскімі.

Найбліжэйшы пратэстанцкі храм на Лідчыне ў той час меўся ў Бальценіках у маёнтку графа Путкамера, але часта пры гэтым храме месца святара было вакантным. Магчыма менавіта таму і вырашылі не ехаць па лютаўскай дарозе за 45 км да пратэстанцкага храма, і пахавальны абрад правёў праваслаўны святар.

Лідскі спраўнік быў сынам графа Аляксандра Іванавіча (Аляксандра Фрыдрыха) Мэдэма, (1803–1859) – тайнага дарадцы, генеральнага консула ў Егіпце (1838–1841), надзвычайнага і паўнамоцнага амбасадара ў Персіі (1841–1845), пасланніка ў Бразіліі (1848–1854) і ў Вашынгтоне (1854–1855), бацька лідскага Мэдэма пахаваны ў Шанхаі.

Немцы Мэдэмы здаўна вядомыя ў нашых краях, Тэадор Нарбут пісаў пра інфлянцкага магістра Конрада Медэма ў другой палове XIII ст.[174] Графскі і баронскі род лідскага Мэдэма паходзіў з Гесэна. Пры канцы XV ст. яны перасяліліся ў Прыбалтыйскі край. Адна галіна роду Мэдэмаў атрымала графскую годнасць Рымскай імперыі ў 1779 г.

Захаваліся таксама і іншыя помнікі з надпісамі па рускі: Пятра Масіны († 1850 г.), Якуба Масіны (памёр 1860 г.), калежскага асэсара Канстанціна Кучынскага († 17.09.1845), жонкі Канстанціна Дар'і Кучынскай, Роберта Казлова (1938–1943). Міхал Шымялевіч пісаў таксама пра помнік праваслаўнай Марыі Патрэсавай († 1861 г.)[175].

## Зарэцкія

З паўночнага боку капліцы пад мармуровымі плітамі спачывае сям'я ўласнікаў Мелужына і Воранава: «Юзаф

---

174 Narbutt Teador. Dzieje starożytne narodu litewskiego. T. IV. Wilno, 1838. S. 231, 250.

175 Szymielewicz Michał. W cmentarnej ciszy // Ziemia Lidzka. 1937. № 11. S. 117–118.

Зарэцкі, сын Войцеха, герба Варня, генерал-лейтэнант корпуса інжынераў. Нарадзіўся ў Скамарохах 19 снежня 1800 г. Памёр у Пецярбургу 29 студзеня 1869 г.». Каля яго ляжыць верная жонка «Ганна Зарэцкая, g(eboren) v(on) Гравеніц. * 1 ліпеня 1807, † 1 лістапада 1891». Іх сын Мікалай-Юзаф Варня-Зарэцкі, нарадзіўся 11 верасня 1843 г., памёр 12 студзеня 1883 г. Яго жонка: Марыя Зарэцкая. Іх дачка: Ганна Зарэцкая, памерла ў росквіце гадоў (1900 г.)[176].

Пра Юзафа Зарэцкага (Zarzecki) ёсць артыкул у Рускім біяграфічным слоўніку Полаўцава, прыводжу тэкст артыкула па-беларуску:

Зарэцкі (Закржэўскі) Іосіф Альбертавіч (насамрэч, Вайцехавіч. – Л. Л.) – інжынер, генерал-лейтэнант, будаўнік Кранштацкіх фартоў. Нарадзіўся ў 1800 г. Памёр 29 студзеня 1869 г. Атрымаў адукацыю ў Віленскім універсітэце і па заканчэнні фізіка-матэматычнага факультэта (1826) паступіў у інстытут інжынераў шляхоў зносін. У 1829 г., пасля заканчэння курса і іспыту атрымаў чын паручніка інжынераў шляхоў зносін з залічэннем на дзейную службу і камандзіраваны на здымкі (тапаграфічныя. – Л. Л.) каля Ноўгарада. Калі ж (у 1830 г.) была створаная марская будаўнічая частка, дырэктар будаўнічага дэпартамента генерал Карбальер запрасіў яго займацца праектам докаў для Кранштата пад сваім асабістым наглядам. Зарэцкі быў пераведзены ў будаўнічую частку з прыкамандзіраваннем да Кранштацкай інжынернай каманды. І з гэтага часу, на працягу амаль сарака гадоў, прысвяціў сябе будаўнічай дзейнасці. У 1838 г. зрабіў велічэзную працу пры недастатку сродкаў – закончыў будаўніцтва карабельнага Мікалаеўскага дока. За гэты час Зарэцкі атрымаў чыны: штабс-капітана (1834 г.) і капітана (1837 г.), чым і звярнуў на сябе асабістую ўвагу цара, які часта наведваў

[176] Szymielewicz Michał. W cmentarnej ciszy // Ziemia Lidzka. 1937. № 11. S. 118.

будаўнічыя работы. Калі на пачатку 1839 г. была распачата пабудова фрэгатнага дока, Зарэцкі быў прызначаны спецыяльным яго будаўніком і будаўніком Абводнага канала ў Кранштаце. Да гэтых вельмі складаных абавязкаў у 1843–44 гг. былі дададзены новыя абавязкі: 1) будаўніка батарэі «Князь Меншыкаў», для якой па даручэнні гасудара імператара ім быў складзены праект і 2) абавязак па пабудове Купецкай брамы Кранштацкай гавані. Пабудова докаў была цалкам скончана ў 1846 г., але на гэтым будаўнічыя работы не спыніліся. У снежні 1848 г. палкоўніку Зарэцкаму было загадана скласці праект на пабудову батарэі на заходнім фронце Кранштацкага форта. У 1849 г. яму ж даручана перарабіць купал рымска-каталіцкага касцёла. У 1850 г. загадам цара ён прызначаны будаўніком Кранштацкай цвердзі. Адначасова з гэтым Зарэцкі прымаў удзел у работах розных камісій: быў чальцом камісіі пад старшынствам генерала Вільсана па ўстаноўцы водаадліўнай паравой машыны ў доках Кранштацкага басейна; камісіі па арганізацыі першага навучальнага марскога экіпажа ў Кранштаце і камісіі па загарадзі паўночнага фарватару, дзе меў галоўны нагляд за работамі, якія выконваліся па складзеным ім праекце. Падчас Усходняй вайны ён зладзіў пры Лісіным носе гавань для кананерак і прымаў дзейны ўдзел па прывядзенні цвердзі ў абарончы стан. У снежні 1855 г. Зарэцкі быў прызначаны на пасаду чальца агульнай прысутнасці будаўнічага дэпартамента і неўзабаве (з 1 студзеня 1856) атрымаў чын генерал-маёра. У 1860 г. ён быў прызначаны чальцом марскога будаўнічага тэхнічнага камітэта і чальцом агульнай прысутнасці інжынернага дэпартамента ваеннага міністэрства, такім чынам парваў са сваёй ранейшай будаўнічай дзейнасцю і цалкам прысвяціў сваю далейшую службу адміністрацыйным пасадам. З вялікай колькасці складзеных ім праектаў розных

збудаванняў асаблівай увагі заслугоўваюць два: праект Балтыйскага порта і праект Гандлёвага порта для Петраграда на левым беразе Нявы каля Кананерскай выспы. З 1863 г. Зарэцкі быў чальцом тэхнічнага камітэта галоўнай інжынернай управы Ваеннага міністэрства, а з 1867 г. – чальцом будаўнічага аддзялення марскога тэхнічнага камітэта. Чын генерал-лейтэнанта атрымаў 1 студзеня 1864 г.[177]

Застаецца толькі дадаць, што першая ў Расіі марская астранамічная абсерваторыя пабудавана ў 1856 г. у двары Кранштацкага штурманскага вучылішча па праекце і пад кіраўніцтвам лідзяніна Зарэцкага.

## Юзаф Грабавецкі

Каля самай капліцы раней ляжала вялікая гранітная пліта, на якой яшчэ можна прачытаць: «Юзаф Грабавецкі, герба Грымайла, з Падляшша, доктар медыцыны і акушэр, сябар Імператарскага таварыства лекараў у Вільні, калежскі асэсар, нарадзіўся 19 сакавіка 1786 г., памёр 4 снежня 1849 г.

*«Для сям'і быў шчасцем,*
*Для гэтай краіны здароўем,*
*Дабрачынцам жабракоў,*
*Мілоснікам дарагіх праўдаў. »*
*Выразаў у Вільні Гарбацэвіч.*

Аўтарам гэтых радкоў быў згаданы вышэй кс. Юзафат Вайшвіла і фразу «Мілоснікам дарагіх праўдаў» ужыў не выпадкова і не для рыфмы, але для таго, каб дасведчаны чалавек зразумеў, што Юзаф Грабавецкі быў сябрам масонскай ложы «Руплівы Ліцвін» у Вільні. Вайшвіла пісаў: «Адзінай аздобай лідскіх могілак ёсць гранітны помнік Грабавецкага, пабудаваны яго сынам і дачкой. Помнік выдатна зрабіў

[177] Русский биографический словарь: В 25 т. А. А. Половцов. Москва, 1896–1918. Т. 7. С. 231.

слаўны віленскі разьбяр С. Гарбацэвіч. На помніку выразаны надпіс, аўтарам якога з'яўляюся я ...»[178].

Юзаф Грабавецкі нарадзіўся на Падляшшы і быў выпускніком Віленскага ўніверсітэта. Доктарскую навуковую ступень атрымаў у 1817 г.[179] У 1815 г. будучы доктар медыцыны жыў у Свіслачы і адсюль даслаў у Віленскае Імператарскае лекарскае таварыства працу «Historia fistulae ventriculi», а ў 1816 г. быў абраны чальцом таварыства[180]. Грабавецкі з'яўляўся аўтарам шэрагу навуковых артыкулаў па медыцыне[181]. Пасля Свіслачы пераехаў у Шчучын, дзе памёр у 1844 г.[182] На Лідчыне ў 1844 г. Грабавецкі валодаў маёнткам Старадворцы з 5 прыгоннымі[183].

Як раз тут, каля капліцы буйства варвараў у 1980-я гг. было найбольш моцным, і наведвальнік бачыў толькі нагрувашчванні перакручаных, пабітых і перавернутых помнікаў, сярод якіх валанцёры знайшлі і помнік Юзафу Грабавецкаму.

## Шляхта з Вялікай Перапечыцы

Пра магілы роду Рылаў Міхал Шымялевіч пісаў: «Вялікая Перапечыца мае некалькі надмагілляў:

---

178 Wspomnienie domku Pijarów Lidzkich. Napisał ks. Jozafat Wojszwiłło, ostatni rektor Pijarów lidzkich // Biblioteka Zakładu Narodowego im. Ossolińskich we Wrocławiu., sygn. 3667/III. S. 30.

179 Bieliński Józef. Stan nauk lekarskich za czasów Akademii medyko-chirurgicznej wileńskiej. Warszawa, 1888. S. 344.

180 Bieliński Józef. Cesarskie towarzystwo lekarskie wileńskie (1805–1864). Warszawa, 1890. S. 38.

181 Grabowiecki Józef. Historya fistuły żołądkowej. Pam. lekar., II. 212; Grabowiecki Józef. De fluore albo. Dissertatio inaug. Vilnae, typ. Schol. Piart 1111. 1817. 8° 23. – гл.: Jozef Bielinski. Uniwersytet Wilenski. T. II. Krakow. 1899–1900. S.336, 348; У 1824 г. Віленскім імператарскім лекарскім таварыстве прачытаў працу "Observationes de alltltracibus e:c usum carmwn animalium licnitide laborantum". – гл: Bieliński Józef. Cesarskie towarzystwo lekarskie wileńskie (1805–1864). Warszawa, 1890. S. 38.

182 Bieliński Józef. Stan nauk lekarskich za czasów Akademii medyko-chirurgicznej wileńskiej. Warszawa, 1888. S. 344.

183 Czesław Malewski. Wykaz alfabetyczny z 1844 r. majątków pow. Lidzkiego // Ziemia Lidzka. 2004. №2(60).

«С. п. Ксаверы Рыла, Надворны дарадца і жыхар Лідскага павета. Жыў 62 гады, памёр 22 лютага 1836 г. Засмучаныя дочкі просяць аб “Здровась Марыя”».

Яго сын: «С. п. Канстанцін Рыла, карнет гусарскага палка караля Нідэрландаў. Жыў 22 гады, памёр 3 жніўня 1847 г. Сёстры ў смутку просяць аб трох “Здровась Марыя”».

Са спіса лідскіх дваран за 1835 г. бачым, што надворны дарадца Ксаверы Рыла і яго жонка Амелія (з Ромэраў) жылі паасобна, былі шлюбнай парай «ў расстанні». Месца пражывання дачок Альбярціны (на той час 18 гадоў), Стэфаніі (8 гадоў) і сына Канстанціна (7 гадоў) у спісе не пазначана[184]. Вядома, што Ксаверы Рыла меў кароткачасовае дачыненне да паўстання 1831 г. і быў дараваны Гродзенскай губернскай следчай камісіяй[185].

На сёння захавалася толькі чыгунная аснова помніка карнета Канстанціна Рылы.

## Садоўскія

«Каля Рылаў былі магілы іншых абшарнікаў з Вялікай Перапечыцы, магілы дачкі Ксаверыя Рылы з надпісам: “Тут спачываюць парэшткі с. п. Альбертыны з Рылаў Садоўскай, памерла 17 мая 1867 г. ва ўзросце 53 гадоў”. Яе муж: “Тут спачываюць парэшткі с. п. Рафала Садоўскага, стацкага дарадцы і кавалера. Памёр 8 жніўня 1869 г. ва ўзросце 58 гадоў”. Першай яго жонкі, ад якой Садоўскім належала Баяршчына пад Лідай (цяпер Тумялевічаў) “D.O.M. Максімілii з Даўгялаў Садоўскай і дваіх дзяцей Людвікі і Яна, жонкі лідскага павятовага лекара, калежскага асэсара. Пакінула гэты свет 13 лістапада 1845 г. ва ўзросце 27 гадоў”. На надмагіллі верш:

---

[184] Лугаўцова Святлана. Гістарычна-дэмаграфічны партрэт лідскай шляхты ў 30-я гады XIX ст. // Лідскі Летапісец. 2021. № 2(94). С. 16.

[185] Суднік Станіслаў. Лідзяне ў паўстанні 1831 года // Лідскі летапісец. 2006. №2(34). С. 22.

*Не парэшткі памёрлай*
*ляжаць пад гэтым валуном,*
*Шчасце чулай маці пахавана разам.*
*Сэрца мужа прабіта*
*гэтым страшным ударам.*
*Чуцен голас жалю і смутку.*
*Трое дзетак-сіротак пакінула на зямлі,*
*Каб навечна застацца з двума памёрлымі.*

Без надмагілля ляжаць тут сын павятовага лекара Ян Садоўскі (1905 г.), яго жонка з Квяткоўскіх, іх сын Ян Рафал Садоўскі і некалькі іншых чальцоў гэтай сям'і»[186].

Лідзянін Яўстах Шалевіч пісаў у сваіх мемуарах: «Могілкі знаходзяцца ў вярсце ад фарнага касцёла. Тут ёсць некалькі прыгожых помнікаў, але на могілках адбылася гісторыя, якая мне вельмі не падабаецца.

Некалькі дзясяткаў гадоў таму, павятовым доктарам у Лідзе быў Садоўскі. Невядома ад чаго, адначасова ў яго памерлі двое дзяцей. Яго жонка не змагла гэтага перажыць і з роспачы атруцілася. Усіх траіх пахавалі каля самай паўночнай сцяны капліцы і паставілі не надта вялікі помнік, на якім выгравіравалі прыгожы вершык, якога я, на жаль, не памятаю (вершык, гл. вышэй. – Л. Л.).

10 гадоў таму я не знайшоў помніка Садоўскай на сваім месцы і моцна здзівіўся, бо на яго месцы стаяў помнік па доктару Гузе (пра Гузе гл. ніжэй. – Л. Л.). Парэшткі Садоўскай і яе дзяцей былі выкапаны, а помнік аднесены на якія 10 метраў ад капліцы! Зямля пад магілы Садоўскіх калісьці была выкупленая, але нават пасля гэтага іх парэшткі выкапалі і перанеслі ў іншае месца.

Я лічу, што адміністрацыя касцёла зрабіла ўсё гэта вельмі не па-людску. Дэканам у той час быў вядомы ...

[186] Szymielewicz Michał. W cmentarnej ciszy // Ziemia Lidzka. 1937. № 11. S. 118.

кс. Сянкевіч (трохкроп'е стаіць на месцы нядобрай характарыстыкі Сянкевіча. – Л. Л.)»[187].

Зараз захаваўся толькі помнік Рафала Садоўскага і частка помніка Максіміліі з Даўгялаў Садоўскай.

## Іншая шляхта Лідчыны

Тут жа недалёка – магілы вядомага на Лідчыне роду Грымайлаў-Прыбытак. Магіла Паўла Прыбыткі[188] († 1870 г.) засядацеля лідскага павятовага суда, ягонай жонкі Эміліі з Крыдалёў († 1878 г.) і іншых прадстаўнікоў гэтага роду.

Далей будзем блізка да тэксту цытаваць Міхала Шымялевіча, бо практычна нічога з таго, пра што ён пісаў, знайсці ўжо немагчыма, добра што хоць застаўся ягоны артыкул.

Шымялевіч паведамляў, што Курасёўшчына мае на могілках адзінага прадстаўніка: «Ян Тукала (1783–1867), капітан б. (былых) польскіх войск», іншыя ж Тукалы болей палюбілі маёнтак Белае Балота каля Гродна, а Курасёўшчыну пакінулі.

Магілы з Чэхаўцоў: «Тут спачывае с. п. Казімір Мяцеша сын Банькоўскі б. суддзя Лідскага павета, пам. 18 кастрычніка 1871 г., жыў 76 гадоў»[189].

Магілы з Скаўронішкаў: «Тут спачываюць с. п. Пётр Жаба і дачка Памела Нарбут, пам. 18 сакавіка 1872 г. ва ўзросце 47 гадоў».

Магілы з Траццякоўцаў: «Тут адпачываюць парэшткі жыхара Лідскага павета Яна Калясінскага пам. 27 чэрвеня 1874 г. і жонкі Антаніны Калясінскай пам. 13 сакавіка

---

187 Szalewicz Eustachy. Wspomnienia szkolne ze szkoły powiatowej w Lidzie i gimnazjum w Nowogrydku // ДГАЛ. Ф. 1135. Воп. 4. Спр. 172. Арк. 36 адв.

188 «Павел Геранімавіч Прыбытка», Гл: Памятная Виленской губернии на 1845 г. Вильна, 1886. С. 104.

189 Szymielewicz Michał. W cmentarnej ciszy // Ziemia Lidzka. 1937. № 11. S. 118.

1863 г.». «Магілы сям'і Станіслава Калясінскага. Яго сын Станіслаў пам. 7 лютага 1897 г., меў 24 гады».

Верагодна, Станіслаў Калясінскі-сын быў тым самым стрыечным братам згаданага вышэй Бальтазара Калясінскага і менавіта ён паставіў помнік Каэтану Дэрашкевічу.

## Крахельскія

На лідскіх балотах жыве качка, якая мае памеры з невялікага гусака, доўгую шыю, доўгую, вузкую і загнутую пры канцы дзюбу. Характэрная афарбоўка дазваляе лёгка распазнаць гэту птушку. У самца галава і верхняя частка шыі чорныя з металічным бляскам, астатняя частка шыі, бакі і ніз белыя. Вага птушкі дасягае двух кг. Памеры ад 60 да 70 см. Птушка гняздуецца выключна ў Гродзенскай, Брэсцкай і часткова Віцебскай абласцях. Толькі ў нашым рэгіёне гэтая качка называецца «крахля» і таму прозвішча Крахельскі мае тутэйшыя карані.

Сям'я Крахельскіх, якая доўгі час жыла ў Лідзе, пакінула тут некалькі магіл.

«Магілы Крахельскіх. С. п. Тэафіла Крахельская пам. 20.II.1881 г. ва ўзросце 58 гадоў. Найлепшай з маці ад шчыра любячых дзяцей.

Бацькі!
Тут пад гэтым халодным
　　　　　каменем ляжаць вашыя парэшткі
І трох сыноў – падлеткаў, пахаваных разам.
Пяць асобаў зачынены ў панурых скляпеннях.
Які ж сум у нашых душах, які востры боль!
Асіроцелі сыны і дачка без бацькоўскай апекі,
Страцілі бацьку і найлепшую маці,
　　　　　　　　　　сіроты навек!
Мінак, які чытаеш на гэтым смутным помніку,
Злітуйся, як чалавек, і пабожна памаліся:

“О, Божа літасцівы, дай вечнае выратаванне
душам, чые парэшткі пакрывае гэты склеп”.

“С. п. Юзаф Крахельскі, скарбнік і жыхар Лідскага павета. Меў 50 гадоў. Спакой тваёй душы, дарагі бацька!”. С. п. іхнія дзеці Уладзіслаў, Аляксандр і Віктар.

“Тут ляжыць Ружа з Туровічаў Крахельская, жонка скарбніка Лідскага павета. Памерла 19 мая 1837 г., мела 19 гадоў”.

“С. п. Нарцыс Крахельскі, жыхар Лідскага павета. Нарадзіўся 14 кастрычніка 1829 г., памёр 11 снежня 1890 г.”».

Яўстах Шалевіч успамінае, што калі ягоны бацька прывёз яго вучыцца ў Лідскую павятовую вучэльню, у горадзе яны спаткалі «шаноўнага скарбніка Крахельскага, начальніка майго брата, які тады служыў у скарбовай касе.

- Што ты тут робіш?

- Прывёз у школу хлапчука.

- А не баішся Пана Бога? Нашто прывёз гэтую худобу? Як пачне вучыцца – адразу памрэ.

Я адчуў да Крахельскага вялікую непрыязь, і гэтае пачуццё да яго ў мяне доўга не праходзіла. Было гэта ў 1855 г.»[190].

З сынам Крахельскага Уладзіславам Яўстах Шалевіч вучыўся ў адным класе. Адзін з расійцаў-настаўнікаў, калі вучань недакладна адказваў, звычайна казаў: «Попал пальцем в чернильницу!», потым хапаў вучня за руку і ўціскваў яго палец ў чарніліцу. Няшчасным пакутнікам гэтага настаўніка часта быў Уладак Крахельскі, сын скарбніка. Ён ішоў першым у журнале і таму яму заўсёды прыходзілася адказваць урокі, усе  астатнія адказвалі не гэтак часта. Крахельскі не быў добрым вучнем, і яго палец не раз бываў

[190] Гл: Szalewicz Eustachy. Wspomnienia szkolne ze szkoły powiatowej w Lidzie i gimnazjum w Nowogrydku. ДГАЛ. Ф. 1135. Воп. 4. Спр. 172.

у чарніліцы. «Настаўнік круціў яго палец ва ўсе бакі і часам хадзіў з вучнем па класе пад руку.

Неяк на лекцыі Крахельскі сказаў: «В Орлеане памятник орленской древе». Настаўнік тут жа яго запытаў: «Что такое древа?» «Древица» – адказвае Крахельскі.

- А что такое древица?

- Паненка.

- А што такое паненка?

Пасля гэтага вучань замаўчаў …»[191].

Уладзіслаў Крахельскі пераблытаў рускія словы «дева» і «древа» …

З лідскіх Крахельскіх паходзіць Крысціна Крахельская (1914–1944), якая была мадэллю для помніка работы скульптара Людвікі Нітсх «Варшаўская сірэнка». Помнік пастаўлены ў 1939 г. на набярэжнай Віслы. Крысціна Крахельская нарадзілася ў сямейным маёнтку Мазуркі Баранавіцкага павета. У 1932 г. скончыла гімназію імя Рамуальда Траўгута ў Брэсце і тады ж паступіла на Гуманітарны факультэт Варшаўскага ўніверсітэта, дзе вывучала гісторыю, геаграфію і этнаграфію, даследавала беларускі фальклор, выконвала фальклорныя песні на варшаўскім і віленскім радыё.

Крысціна Крахельская была байцом Арміі Краёвай (псеўданім «Данута»). У студзені 1943 г. для байцоў палка АК яна напісала песню «Hej, chłopcy, bagnet na broń!» («Гэй, хлопцы, узняць багнеты!»). Песня набыла вялікую папулярнасць і стала адным з музычных сімвалаў Варшаўскага паўстання 1944 г. Крысціна Крахельская загінула ў першыя дні паўстання (02.08.1944), ратуючы параненых на Мокатаўскім полі. Цяпер гэта цэнтральная частка Варшавы. Малодшы брат Крысціны – лётчык Багдан Крахельскі, ад студзеня 1938 г. ён праходзіў навучанне ў лётнай школе ў Дэнбліне, у 1939 г. быў прыпісаны да лётнага палка ў Лідзе.

---

191 Там жа.

## Лідзяне

Густа «засяляюць» свае могілкі гарадскія жыхары.

Павятовы лекар Раймунд Гузе († 1896 г.)[192], магіла якога, як паведамляў Шалевіч, знаходзіцца на месцы сямейнага пахавання Садоўскіх. Пра Гузе ў «Памятнай кніжцы Віленскай губерні»: «Надворны дарадца Раймунд Станіслаў Рудольфавіч Гузе, адукацыю атрымаў у С.-Пецярбургскай медыка-хірургічнай акадэміі, каталіцкага веравызнання, на пасадзе з 22 ліпеня 1879 г.»[193].

Эмілія з Шостакаў Ляўданская[194], жонка спраўніка Лідскага павета († 1893 г.).

Марцін Галоўня († 1888 г.).

Анна з Малашкевічаў Яцкевіч, жонка бургамістра († 1840 г.).

Яна з Ліпінскіх Зэдлер, жонка аптэкара († 1871 г.)[195].

Аркадзь Маразоўскі, землямер († 1895 г.).

Леан Стабінскі, бургамістр.

Лёг тут «Аляксандр Талочка, калежскі рэгістратар, пам. 7 красавіка 1846 г. ва ўзросце 27 гадоў.

Гадоў жыў няшмат
Спачывай ты, сябар,
Хай гук трубы анёла
Заклікае на суд Найвышэйшы»[196].

---

[192] Szymielewicz Michał. W cmentarnej ciszy // Ziemia Lidzka. 1937. № 11. S. 118–119.

[193] Памятная книжка Виленской губернии на 1887 год. Вильна, 1886. С. 13.

[194] Яе муж, паліцэйскі спраўнік з 1888 да 1900 г. Сцяпан Мацвеевіч Ляўданскі, той самы, які апрацоўваў кс. Барадзічам (гл. вышэй). За сваю службу атрымаў розныя адзнакі і быў узнагароджаны ордэнам Уладзіміра 3-й ст. – Памятная книжка Виленской губернии на 1903 г. Вильно, 1902. ч. 3. С. 58.

[195] Вядома, што ў 1851 г. утрымальнік Лідскай шпітальнай аптэкі Зэдлер з 1 студзеня 1851 г. перадаў у арэнду сваю аптэку правізару П. І. Юрцэвічу, які вывучаў фармацэўтыку ў Маскоўскім універсітэце. У 1871 г. у Лідзе працавала аптэка нашчадкаў правізара Зэдлера ў арэндзе ў асэсара Голуба, кіравалася правізарам Шымкевічам. – Гл: Лаўрэш Л. Л. Шэпт пажоўклых старонак. Лідчына ў люстэрку прэсы. 1900–1939 гг. Гродна, 2017. С. 53.

[196] Szymielewicz Michał. W cmentarnej ciszy // Ziemia Lidzka. 1937. № 11. S. 118–119.

Захаваліся фамільныя помнікі Стасевічаў:

Міхала і яго жонкі Францішкі († 1856 г.);

Яна Стасевіча (сын Міхала і Францішкі), бургамістра († 1901 г.)[197].

Гілярыя (сын Сымона – унук Міхала) († 1856 г.);

Яна (сын Міхала) († 1901 г.);

Сымона (сын Яна – унук Міхала) († 1886 г.).

На пачатку XIX ст. Міхал Стасевіч († 1856 г.) недзе на Гродзеншчыне прадаў свой маёнтак і пасяліўся ў Лідзе, па вуліцы Віленскай (гаспадарка месцілася паміж ракой Лідзеяй, яўрэйскімі могілкамі і чыгункай). Двое яго сыноў – згаданы вышэй бургамістр Ян († 1901 г.) і Сымон († 1886 г.) працавалі на сваёй зямлі. Ян трымаў гаспадарку ў раёне вуліцы Віленскай, а Сымон – на Моргах (прыкладна, гэта сучасны раён вуліцы Касманаўтаў). Сымон меў 4 сына і 2 дачкі, сын Гіляры памёр у дзіцячым узросце.

Праўнучка Міхала і ўнучка бургамістра Яна Стасевіча, прафесар Ірэна Стасевіч-Ясюкова, пісала: «... мой дзядуля – Ян Стасевіч – выбітны і багаты, памёр нягледзячы на намаганні лекараў, у маладым узросце ў Віленскай бальніцы»[198]. У іншай сваёй кнізе ўспамінала: «Дзед – Ян Стасевіч – памёр, пакінуўшы жонку з пяццю дзецьмі. Гадаваць іх было цяжка»[199].

На месцы пахавання Эміліі Вадэйкі меўся толькі земляны ўзгорачак. Яе даўнія суседзі папрасілі валанцёраў ўсталяваць на ім бетонны крыж з надпісам: «Эмілія Вадэйка, памерла каля 1920 года». Сям'я Вадэйкі жыла ў Рулевічах, Эмілія памерла ў лідскім шпіталі. Пакінула ча-

---

[197] Там жа.

[198] Стасевіч-Ясюкова Ірэна. Пра Марыю Стасевіч – маю маці – успаміны // Лідскі летапісец. 2012. №4(60). С. 46.

[199] Стасевіч-Ясюкова Ірэна. Божае Нараджэнне на крэсах ў міжваенным дваццацігоддзі // Лідскі Летапісец. 2017. №2(78). С. 54.

тырох сыноў. Хлопцы мелі выдатны музычны слых, добра гралі на розных інструментах і ўсе значныя падзеі ў ваколіцах не абыходзіліся без іх ўдзелу.

Юзаф Валентыновіч працаваў на чыгунцы. Трагічна загінуў на працы 22 чэрвеня 1938 года ва ўзросце 35 гадоў.

Помнік Вінцэнта Чайкоўскага стаіць на захад ад капліцы. Ён жыў па вуліцы Калініна (тагачасная вуліца Вызвалення). Меў вялікі сад, вырошчваў садавіну на продаж. Быў дбайным гаспадаром. Памёр восенню 1941 г. ва ўзросце 73 года.

Справа ад уваходнай брамы на месцы пахавання, валанцёрамі пастаўлены бетонны крыж з надпісам «Станіслаў Яцкевіч 1844–1957. Знахар» («Stanislaw Jackiewicz 1844–1957. Znachor»). Арыгінальны помнік не захаваўся. Сям'я Яцкевічаў працавала на сваёй гаспадарцы ў ваколіцы Чэхаўцы. Лідзянін Станіслаў Яцкевіч як быццам меў нейкую медычную адукацыю, займаўся знахарствам і актыўна лячыў людзей. У сям'і яго звалі Макаравіч.

Яго жонка Юзэфа з Місюраў. Бетонны крыж на месцы пахавання Юзэфы Яцкевіч з Місюраў († 10.04.1942 г.) стаіць побач.

Помнік Ядвігі Пацэвіч, дачкі знахара, стаіць справа ад цэнтральнай алеі. Ядвіга нарадзілася 15 чэрвеня 1901 г. у сям'і Станіслава і Юзэфы з Місюраў Яцкевічаў у засценку Чэхаўцы. 25 лістапада 1923 г. пабралася шлюбам з паштальёнам Юзафам Пацэвічам, аб чым зроблены запіс у адпаведнай кнізе фарнага касцёла. Памерла ад запалення 6 студзеня 1936 г. у сваім ложку, мела 35 гадоў.

Справа ад уваходу на могілкі захаваўся бетонны нагробак Яна Андрэеўскага. Ён нарадзіўся ў 1877 г. ў сям'і

Мечыслава і Казіміры Андрэеўскіх, ажаніўся з Казімірай Кулікоўскай, памёр у 1940 г.

Ёсць на могілках частка тэрыторыі (на поўдзень і захад ад капліцы), якую «засялялі» падчас і пасля Другой сусветнай вайны ў 1939–1950-х гг. Помнікі тут са звычайнага бетону ў даволі занядбаным стане, што і зразумела: якія гады, такі і матэрыяльны стан насельніцтва. Часта на помніках сустракаецца надпіс: «Загінуў(ла) смерцю трагічнай».

Нагробак Яніны Казакоўскай са Шмігераў (памерла ў сакавіку 1941 г. ва ўзросце 27 гадоў пры нараджэнні трэцяга дзіцяці) знаходзіцца ў паўднёвай, старой частцы могілак. Яе сям'я жыла ў доме побач з могілкамі па сучаснаму праспекту Перамогі (тагачаснай вуліцы Гражыны). Хлопчыка пасля смерці маці выгадавала бабуля Юзэфа Шмігера. Бабуля разам з унукам выехала ў Польшчу ў 1950-я гг. Каля Яніны пахаваныя дзве яе малыя дачкі: трохгадовая Данута († 05.07.1939 г.) і Гэнавэфа († 14.09.1940 г.), жыла 7 гадоў.

Фелікс і Францішак Май, Ян Расолэк. Іх пахаванні абазначаны бетоннымі крыжамі, якія ўсталявалі пры рэнавацыі могілак у 2019 г. Гісторыю гэтых магіл, якія ляжаць на поўдзень ад сцежкі да капліцы, распавяла лідзянка Даніэла Май. Фелікс Май і яго жонка Казімера арандавалі 30 га зямлі ў ксяндза Баярунца. Фелікс у паважным узросце памёр у сваім ложку. Іх сын Францішак маладым хлопцам быў прызваны ў войска і ўдзельнічаў у Другой сусветнай вайне. Быў захоплены ў палон, але здарылася так, што ў 1942 г. эшалон спыніўся на станцыі Ліда. Францішак і яго франтавы сябар Ян Расолэк з Кельцкага ваяводства ад-

важыліся на ўцёкі, аднак спроба аказалася няўдалай і хлопцы загінулі.

На поўдзень ад капліцы знаходзіцца магіла Валенты Лабана (1931–1947). Мясцовыя людзі памятаюць, што хлопец быў выпадкова застрэлены вайскоўцам, які здымаў кватэру ў доме яго бацькоў. Трагедыя здарылася на Вігілію, увечары 24 снежня 1947 г. Валенты меў 16 гадоў.

Побач з ваеннай часткай могілак, пад старымі клёнамі ў радок стаяць чатыры шэрыя бетонныя нагробкі. Падобна, што гэта адна сям'я: родныя брат і дзве сястры. Захаваліся надпісы: Маляўская Станіслава († 28.12.1950 г.), пражала 46 гадоў; Хэлена Крупавес († 02.11.1954 г.), пражыла 55 гадоў; Юзаф Крупавес († 21.01.1949 г.), пражыў 50 гадоў. Надпіс на чацвёртым пахаванні не захаваўся.

Гэта сумная і трагічная гісторыя. Станіслава з сям'і Крупавесаў выйшла замуж за Канстанты Маляўскага, нарадзіла трох дзетак: дачку Генавэфу (1938 г.), сыноў Станіслава (1940 г.) і Уладка (1946 г.). Сям'я жыла ў Малейкаўшчызне. Муж Канстанты быў млынаром, яго паважалі суседзі і ён быў солтысам. Быў скасаваны ў грамадзянскіх правах і на 25 гадоў высланы ў Сібір. Каб выжыць, жонка гандлявала посудам свайго вырабу на рынку ў Лідзе. 28 снежня 1950 г. трагічна загінула пад коламі грузавіка калі ішла гандляваць на рынак. Сірот забрала незамужняя сястра Станіславы Хэлена Крупавес. Часы былі галодныя. У Лідзе цётку Хэлену задушылі на смерць у чарзе па хлеб, гэта здарылася ў лістападзе 1954 г. Малодшаму Уладзю было чатыры гады. Дзетак забрала далёкія сваякі з боку бацькі. Пасля вяртання з Сібіры Канстанты выехаў з дзецьмі ў Польшчу. Уладкаваўся на працу млынаром. Аднак

лёс прызначыў яму трагічную смерць пад транспарцёрам млына.

Падчас рэнавацыі могілак адноўлены нагробак Вацлава Кулікоўскага, гаспадара з ваколіцы Чэхаўцы. Вацлаў нарадзіўся ў 1886 г. У 1913 г. ён ажаніўся з Марыяй Вільбік, а ў 1914 г. быў прызваны ў царскае войска. Пачалася Першая сусветная вайнаю У 1914 г.  у бітве Танненбергам Кулікоўскі патрапіў нямецкі палон і цяжка працаваў у капальні. Пасля заканчэння вайны вярнуўся на дахаты. У сям'і Вацлава і Марыі нарадзіліся тры сына і дачка. Падарванае на вайне здароўе выклікала заўчасную смерць Вацлава ў 1943 г.

## Паўночна-заходняя (новая) частка могілак

У 1937 г. могілкі былі павялічаны ў паўночна-заходні бок да сучасных памераў – 4,1 га. Хаваць людзей пачалі менавіта ў гэтай частцы могілак.

**Граблісы.** Калі летам 2018 г. расчысцілі паўночна-заходнюю частку могілак, стала зразумела, што да 1939 г. тут пахавана шмат дастаткова заможных гараджан.

Арыгінальна выглядае магіла Грабліcаў – каплічка-пахавальня, малы домік з дзвярыма і вокнамі. Пры канцы 1920-х гг. Граблісы жылі па вуліцы Дварцовай каля чыгуначнага вакзала, мелі фірму, якая выраблялa розныя рэчы для будаўніцтва, выраблялa і надмагіллі, рамантавала дахі. У 1938 г. Мікалай Грабліс быў лаўнікам у Лідскай гарадской управе і ўзначальваў Таварыства вайсковых інвалідаў горада Ліды. Ён жа стварыў асобную ад цэнтральнай добраахвотную пажарную каманду на Слабадзе. Пажарны цэнтральнай каманды Абрахам Гельман пісаў: «Невялікая дысгармонія ў сумеснай працы яўрэйскіх і неяўрэйскіх

пажарных у Лідзе была выклікана братамі Граблісамі і некалькімі іншымі членамі, настроенымі антысеміцкі, якія жадалі атрымаць кантроль над таварыствам. Яўрэі не дапусцілі гэтага, і, праз вялікую колькасць часта бурных судовых пасяджэнняў, было прынята рашэнне, якое падзяліла асацыяцыю на дзве каманды: «Група 1» была адказная за тэрыторыю горада да чыгункі, а «Група 2», пад кіраўніцтвам Мікалая Грабліса, адказвала за тэрыторыю Слабодкі па другі бок чыгуначных шляхоў. Гэта была маленькая і менш навучаная група. У гэтай групе амаль што не было яўрэяў. У выпадку моцнага пажару на Слабодцы першую гарадскую групу не адзін раз выклікаў туды бургамістр Задурскі альбо камендант паліцыі»[200].

Зараз міліцыя ў нашым горадзе месціцца па адрасе вуліца Перамогі (раней – Фалькоўскага), 36. Пад адным нумарам аб'яднаны некалькі дамоў, з якіх самы паўднёвы – таксама быў домам Граблісаў.

Сямейных склепаў на могілках раней было дастаткова многа. Некаторыя з іх я памятаю яшчэ з дзяцінства, але захаваўся толькі гэты адзін. Ад астатніх можа засталіся толькі іх падземныя часткі.

Шымялевіч пісаў пра магілу Уладзіміра Біюя, падкамісара паліцыі на пенсіі († 1928 г.) і пра грамаду паліцэйскіх каля яго: Ян Вільканец, паставы, 33 годы, «загінуў ад рук бандытаў 21 мая 1922 г.», Юліян Каўняровіч, «загінуў смерцю храбрых 23 кастрычніка 1922 г.», Юзаф Алесь, «трагічна загінуў» († 1935 г.).

У паўночна-заходняй частцы могілак ляжалі настаўнікі, якіх забрала да вечнага спачынку «белая пані» сухота: зяць Міхала Шымялевіча – Юзаф Вось († 1929 г.),

---

[200] Лаўрэш Л. Л. Шэпт пажоўклых старонак. Лідчына ў люстэрку прэсы. 1900–1939 гг. Гродна, 2017. С. 366, 398, 426.

Ганна Філіпкоўская († 1930 г.), Ядвіга Шкоп († 1931 г.), Францішак Краўчык († 1935 г.), Станіслаў Фэглер, прафесар дзяржаўнай гімназіі ў Лідзе († 1930 г.).

Недалёка ад іх знаходзілася надмагілле Ядзі Шыманскай, няшчаснай ахвяры нёманскага пляжа. У 1937 г. гэтае надмагілле было «ўсё ў кветках»[201]. Пра здарэнне з Ядзяй Шыманскай пісала прэса таго часу: «4 ліпеня 1937 г. падчас Свята мора, якое праходзіла на рацэ Нёман, у рацэ патанула вучаніца 3-га класа Купецкай гімназіі піяраў Ядвіга Шыманская, якая таксама прыехала святкаваць. Дзяўчынка разам з выпускніком Купецкай гімназіі каталася на лодцы па Нёмане, і лодка перакулілася. Цела дзяўчынкі было знойдзена праз некалькі дзён за тры кіламетры ніжэй Сяльца»[202].

Помнік Люцыі Намёт (1894–1928) стаіць каля вайсковай часткі могілак.

Намёты – гаспадары з вёскі Палубнікі, што пад Лідай. Юзаф Намёт меў зямельны надзел 20 га. Пасля Першай сусветнай вайны ажаніўся з лідзянкай Люцыяй Кулеша. У сям'і нарадзілася 4 дзяцей: Люцыян, Юзаф, Станіслава і Вітольд. Люцыя, жонка Юзафа, захварэла на сухоты і памерла маладой. Гадаваць малых дзяцей і займацца гаспадарчымі справамі па дому дапамагала сястра Люцыі Меланія. На пачатку 1930-х гадоў Юзаф ажаніўся з ёй і ўсё жыццё пражыў у Палубніках. Пахаваны на вясковых могілках.

Люцыян, першы сын Юзафа, пасля заканчэння школы ў Лідзе ў 1939 г. паступіў у Духоўную семінарыю ў Вільні. У 1941 г. пасля акупацыі Вільні немцамі семінарыю закрылі, а

201 Szymielewicz Michał. W cmentarnej ciszy // Ziemia Lidzka. 1937. № 11. S. 120.

202 Kurjer Wilenski. № 184 (4147). 7 lipca 1937; Kurjer Wilenski. № 186 (4149). 9 lipca 1937.

клірыкаў вывезлі на прымусовыя працы ў Германію. Пасля заканчэння Другой Сусветнай вайны Люцыян прадоўжыў навучанне ў Каталіцкім універсітэце ў Рыме. З дыпломам магістра кананічнага права і намерам прадаўжэння адукацыі прыехаў у Люблін (Польшча). Пасля атрымання ступені магістра філасофіі служыў у Беластоку і выкладаў у Духоўнай семінарыі, займаў афіцыйную пасаду ў складзе Арцыбіскупскага суду ў Беластоку. Памёр ва ўзросце 82 гады ў Беластоку.

Юзаф, сын Юзафа, быў жаўнерам АК, служыў у аддзеле свайго кузына падпаручніка Уладзіслава Міцкевіча ў Тракелях. Быў паранены некалькі разоў і звольнены са службы з-за кепскага здароўя. Пасля вайны быў вымушаны тэрмінова выехаць у Польшчу. У Ольштыне атрымаў вышэйшую сельскагаспадарчую адукацыю. Увесь час меў праблемы са здароўем. Памёр ва ўзросце 49 гадоў.

Станіслава, дачка Юзафа закончыла школу ў Лідзе, пасля вайны атрымала медычную адукацыю і працавала лекарам у чыгуначным шпіталі ў Свянцянах. На пенсію пайшла з пасады кіраўніка гэтага шпіталя. Памерла ў Вільні ва ўзросце 79 гадоў.

Вітольд, самы малодшы сын Юзафа, застаўся гаспадарыць на бацькоўскай зямлі ў Палубніках. Памёр маладым, пахаваны на могілках у Палубніках.

Відавочцы ўспаміналі, што на пачатку 1960 г. у заходняй частцы могілак, праводзіўся так званы «суботнік» падчас якога вялікую колькасць помнікаў трактарам загарнулі ў дзве вялікія ямы, адну з іх (каардынаты: 53°52’49.7”N 25°18’17.9”E) ускрывалі летам 2019 г. падчас рэнавацыі могілак, тады была знойдзена вялікая колькасць помнікаў і іх фрагментаў, але з-за недахопу сродкаў для аднаўлення яма была засыпана да лепшых часоў. Другая яма не

ўскрывалася, яе прыкладныя каардынаты: 53°52’51.3”N 25°18’15.0”E. Спадзяюся, што гэта інфармацыя калісьці будзе карыснай для лідзян.

З-за таго, што надмагіллі 1920–1930-х гг. у заходняй частцы могілак дрэнна захаваліся, людзі, якія памяталі, што іх крэўныя пахаваны недзе тут, рабілі так званыя кенатафы – сімвалічныя магілы. Часцей за ўсе сімвалічныя помнікі ставіліся каля капліцы – на больш ганаровай частцы.

Адзін з такіх кенатафаў – помнік асобы шведска-дацкага паходжання Артура Гвідавіча Рубома (1870 Вільня – 1936 Ліда). Артур Рубом (Rybom) валодаў маёнткам Хвастовічы Бабруйскага павета, меў чын калежскага сакратара (грамадзянскі чын Расійскай імперыі X класа ў «Табелі аб рангах», адпаведны чыну паручніка ў войску). Рубом згадваецца ў Памятнай кніжцы Мінскай губерні за 1915 г. як «гласный» (член сходу з вырашальным голасам) Бабруйскага павятовага земскага сходу[203]. Яго другая дачка Ксенія пражыла 105 гадоў (07.05.1915 Вільня – 09.04.2020 Парыж), сусветна вядомая балерына, у замужжы Ксенія Трыпалітава.

Пасля 1920 г. Рубомы збеглі ў Польшчу, дзе Артур Рубом, каб пракарміць сям’ю, працаваў у розных гарадах Заходняй Беларусі і Украіны. У 1936 г. віленская газета «Слова» паведаміла пра спачын Артура Рубома ў Лідзе: «Смерць каморніка. У сваёй уласнай кватэры па вуліцы Пілсудскага, ад сардэчнага прыступу раптоўна памёр каморнік Гродзенскага суду 11 акругі ...»[204].

Знакамітая дачка Ксенія ўспамінала: «Мой каханы татачка памёр 8 снежня 1936 года. ... Ліст з гэтай сумнай

[203] Памятная книжка Минской губернии на 1915 г. Минск, 1914. С. 124.
[204] Słowo. № 341(4547), 12 grudnia 1936.

навіной размінуўся з мамай. Покуль яна ехала ў цягніку, тату пахавалі. ... Ліда стала часткай СССР, могілкі патрапілі ў рукі вандалаў, і магіла майго бацькі не захавалася. Але я даведалася пра гэта значна пазней… Нарэшце, я змагла наведаць Беларусь. І вось у верасні 2004 года праз 67 гадоў пасля смерці, на могілках, дзе ён пахаваны, я паставіла помнік са здымкам таты. Я заказала крыж з белага мармуру і прыгожае ўладкаванне магілы. Як быццам гара з плеч звалілася! Як была бы задаволена мама! Мясцовы ксёндз Казімір Казіміравіч адслужыў імшу і асвяціў гэта месца»[205].

Сімвалічная магіла Артура Рубома месціцца справа каля сцежкі, якая вядзе ад галоўнай брамы могілак да капліцы, і ўяўляе сабой звычайны, тыпавы і недарагі бетонны помнік.

Сякая-такая інфармацыя пра лідскія могілкі з'яўлялася ў прэсе 1920–1930 гг.

Самазабойцы часта выбіралі сабе для апошніх рахункаў з жыццём гэтыя могілкі. Так, у сакавіку 1929 г. на могілках у беспрытомным стане была знойдзена Яўгенія Скеміш. Выпадковыя людзі цудам ураталі дзяўчыну і адвезлі ў шпіталь[206].

Пры канцы жніўня 1931 г. у горадзе бура паабрывала драты электрычнасці і сувязі, з-за чаго на лідскай тэлефоннай станцыі ледзь не адбыўся пажар. Таксама моцны дождж дзе-нідзе размыў дарогі і падмыў гарадскія могілкі, што прывяло да таго, што папрасядалі новыя магілы[207].

У ноч з 14 на 15 і з 15 на 16 студзеня 1932 г. адбыліся акты вандалізму на гарадскіх могілках, былі разбіты 16 слупкоў агароджы чатырох магіл (магілы Граблíса, Роў-

---

205 Васильев Александр, Ксения Триполитова. Маленькая балерина. Исповедь русской эмигрантки. Москва, 2010. С. 159–160.
206 Słowo. №62(1972), 15 marca 1929.
207 Słowo. №196(2704), 28 sierpnia 1931.

бы і інш.) і скрадзены жалезны дрот агароджы агульнай даўжынёй каля 40 м[208].

Карэспандэнт газеты «Слова», які прымаў удзел у пахаванні лётчыка Ціхоцкага, паэтычна апісаў старыя Лідскія могілкі: «Лідскія могілкі – гэта тыповы прыгожы лясок каля горада. Вялікія сосны, пахне вясной ... Дзе-нідзе бачны пачцівыя каменныя помнікі працы мясцовага майстра. Нашто чытаць надпісы? Гэты помнік ёсць сам люстэркам шляхетнага мясцовага жыцця яго ўласніка. З пэўнай павагай яго атачаюць большыя ці меншыя драўляныя крыжы, якія тонуць у зараслях буйнага спірэю і язміну ... . Пры самым канцы могілак знаходзяцца магілы ваенных і невядомых: “Магіла 40 невядомых закладнікаў ...”»[209].

Пры канцы лета 1937 г. падчас земляных работ на вуліцы Чырвонай і Сувальскай знайшлі два збуцвелыя чалавечыя шкілеты, парэшткі перахаваны на парафіяльных могілках[210].

У чэрвені 1938 г. паліцыя шукала тых, хто пакраў жалезныя агароджу з магілаў[211].

За некалькі дзесяткаў метраў на поўдзень ад могілак пры вуліцы Гражыны (цяпер праспект Перамогі) у 1920-я знаходзілася неасвечанае месца, дзе хавалі самазабойцаў і асуджаных Лідскім ваенна-палявым судом да расстрэлу. Смяротнікаў вялі пад канвоем праз увесь горад і расстрэльвалі ў пясчаным кар’еры каля могілак, потым хавалі на неасвечанай пляцоўцы. Трохі пазней асуджаных пачалі караць смерцю на тэрыторыі турмы[212]. Гэта месца на поўдзень ад могілак Я. Ярмант апісала гэтак: «Там, дзе

208 Kurier Nowogródzki. №18(104), 23 stycznia 1932.
209 Słowo. №108(1719), 12 maja 1928.
210 Kurjer Wilenski. № 226(4189), 18 sierpnia 1937.
211 Kurjer Wilenski. № 159(4477), 12 czerwca 1938.
212 Naruszewicz W. Wspomnienia lidzianina. Warszawa, 2001. S. 105.

заканчвалася сцяна могілак размяшчалася нейкая адкрытая прастора з ямамі. А адразу ж за ямамі адкрываўся дзіўны і адначасова страшны пейзаж. Там цягнуўся шэраг нейкіх будак-вырадкаў. Збітыя з рознага матэрыялу прычым вельмі неахайна, яны здаваліся толькі надбудовай над часткай памяшкання, якое знаходзіцца пад зямлёй. На мяне яны рабілі жахлівае ўражанне. Дзіўна, што пра іх ніколі не казалі і ніяк не каментавалі іхняе існаванне. Яны проста стаялі і ўспрымаліся як нешта, што само сабой разумеецца. Аднойчы сястра сказала, што ў адной з гэтых будак жыве яе школьная сяброўка»[213].

Па гораду заўсёды хадзілі дзіўныя чуткі пра ваўкалакаў і прывідаў на старых могілках. Уладзіслаў Нарушэвіч запісаў адзін з гэткіх апавядаў:

«У ноч, калі была поўня, з адной з магіл, у якой спачываў серыйны забойца, у поўнач уставаў прывід і наведваўся ў дом, які знаходзіўся каля могілак і дзе жыла сям'я адной з яго ахвяраў. Сістэматычнае наведванне прывіду навяло жах на жыхароў дома, і яны паведамілі пра гэта пробашчу, які паслаў на могілкі свайго вікарыя. Вікарый прачытаў малітвы і акрапіў магілу забойцы святой вадой. Адна гэта не дало ніякага эфекту, калі надыходзіла поўня, прывід і надалей наведваў гэты дом. Жыхары дома былі ўжо на мяжы псіхічнага захворвання. Невядома, як доўга яшчэ доўжыліся б гэтыя наведванні, але знайшоўся нехта, хто перамог прывіда. Гэта быў стары жабрак. Выслухаўшы гісторыю жыхароў дома, ён вычасаў з асіны кол, у бліжэйшую ноч прыйшоў на магілкі і ўбіў кол у магілу гэтак, каб ён працяў труну забойцы. Выплыўшы на хвіліну з хмар месяц асвятліў гэтую сцэну: каля ўбітага ў зямлю кала,

213 Ярмонт Е. В тени замка Гедемина. Лида, 1995. С. 47.

выступіла кроў. Пасля гэтага прывід больш не прыходзіў да людзей».

Таксам Нарушэвіч пісаў і пра чуткі аб сустрэчах уначы на могілках з белымі зданямі. Як быццам, гімназічны настаўнік фізікі растлумачыў, што белыя здані – гэта фосфар які ў бязветраныя ночы выходзіць з старых магіл і ствярае слуп, слуп свяціцца і перамяшчаецца разам з рухам паветра[214].

Да 17 гадоў я жыў за 200-300 метраў ад гэтых старых гарадскіх могілак і ў сярэдзіне 1970-х гг., у зусім іншую эпоху, чуў тыя ж расказы пра белыя здані – слупы фосфару, якія выходзілі са старых магіл і па начах пужалі мінакоў. Гарадскія легенды – вельмі ўстойлівая рэч.

Белетрызаваная легенда пра рыцара на могілках падаецца ў дадатках да гэтай кнігі.

## Трошкі пра выраб нагробкаў

У першай палове XIX ст. у Лідзе працавала майстэрня І. Забароўскага (помнік Іоанны Вольскай з Шацілаў, † 1847 г., жыла 27 гадоў).

Большая частка каменных надмагілляў на лідскіх могілках паходзіла з другой чвэрці XIX ст. Часта яны былі выразаны ў Вільні. Каля 1880 г. у Лідзе па вуліцы Віленскай на ўласным пляцы залажыў майстэрню надмагілляў Баляслаў Хруль. Пасля яго смерці (1889 г.) майстэрняй кіравала ўдава Анэля Хруль з Малеўскіх. Напрыклад, на помніку жонкі аптэкара Яны Зэдлер з Ліпінскіх, († 1871) пазначана, што яго зрабіў Б. Хруль.

Вядома, што ў канцы XIX ст. на Зарэччы (зараз р-н вуліцы Калініна) на пляцы Ступновічаў ляжала вялікая глыба старога граніту даўжынёй 4 м, шырынёй 2 м і вышынёй 1,5 м. На паверхні, якую было бачна з зямлі, былі два кру-

[214] Naruszewicz W. Wspomnienia lidzianina. Warszawa, 2001. S. 104–105.

глыя паглыбленні з гладкім дном – адно дыяметрам 20 см а другое 25 см, глыбінёй каля 2 см. Шымялевіч пісаў, што 1892 г. майстар па вырабе надмагілляў Баляслаў Хруль разбіў гэтую глыбу на часткі і з адной з іх у сваёй майстэрні вычасаў вялікі помнік у выглядзе дуба. Гэтае арыгінальнае надмагілле з адпаведным надпісам было пастаўлена на магіле ксяндза Казіміра Гейдройця ў Забалаці.

Некаторыя надмагіллі на старых могілках паходзяць з майстэрні Воўка-Карачэўскага з Паддубна.

Як паведамлялася вышэй, нагробак евангеліка з Дакудава Ксаверыя Эсткі, які стаіць недалёка ад галоўнага ўваходу на могілкі, зрабіў віленскі разьбяр Вяржбоўскі. Ёсць на могілках і помнікі віленскага разьбяра В. Пянкоўскага (напрыклад, помнік Зузаны і Антонія Вісмантаў, † 1871).

У першай палове XX ст. помнікі рабіў лідскі майстар М. Грабліс (г. Ліда, вул. Дварцовая, 2).

Найлепшы помнік на старых могілках, па меркаванні Шымялевіча, пабудавала маці сыну з надпісам: «Станіславу Хагмаеру, 23 красавіка 1906 г. – 18 верасня 1930 г. Любімаму адзінаму. Памяць ад маці». Таксама лідскаму гісторыку спадабаўся ладны камень прывезены на магілу памерлага лідзяніна, старога кавалера, які пакінуў добрыя спадкі сваім далёкім крэўным. На камені быў выкананы бронзавы барэльеф з партрэтам нябожчыка і надпісам: «Аляксандр Ёдка, памёр у Варшаве 17.XII.1933 г. у 75 гадоў. Прайшоў праз жыццё, робячы дабро. Удзячная радня»[215].

* * *

Апошні раз агульнымі намаганнямі на могілках быў наведзены парадак пры канцы 1940-х гг. Па ініцыятыве каталіцкіх святароў былі высечаны зараснікі, скошана вы-

---

215 Шымялевіч Міхал. Збор твораў. С. 220, 210.

сокая трава, зрэзаны ніжнія галінкі дрэў, прыведзены ў добры стан магілы. Людзі пачалі саджаць на магілах кветкі. Наступны раз за могілкі ўзяліся толькі пры канцы XX ст.

Парафіяне памяталі выпадак, які адбыўся тады падчас тых работ на могілках: « ... Пры канцы 1940-х гадоў, ... у фарным касцёле горада каля замка з'явіўся новы ксёндз.

Аказваецца, адна з грамадзянак горада, нейкая пані Пуйдакова, прыгледзеўшыся да ксяндза, пазнала ў ім лётчыка, з якім яна сустракалася да вайны і з якім у яе ў тыя часы быў невялікі раман.

Новы ксёндз катэгарычна адмаўляў, што меў што-небудзь агульнага з асобай лётчыка. Але жанчына яму не верыла. Яна глядзела на ксяндза падчас набажэнства, падпільноўвала яго падчас пахавання на могілках, выліла на няшчаснага бутэльку парфуму.

У рэшце-рэшт, ксёндз страціў цярпенне. Аднойчы, калі пані Пуйдакова дайшла да сексуальных правакацый і, задраўшы на могілках спадніцу, паказала ксяндзу ... свае ножкі, ён узяўся за розгу і выкрасаў узбуджанай і звар'яцелай ад кахання парафіянцы зад»[216].

## Вайсковая частка могілак

Былы лідзянін Ян Чэслаў Станіслаўскі, маці якога была з сям'і Вісмантаў і ён усё сваё дзяцінства і маладосць пражыў у раёне горада каля старых гарадскіх могілак, якія раней меў назву Вісманты, пісаў:

«Я жыў на Вісмантах (вуліцы Вісманты) і меў маці з сям'і Вісмант, якая таксама ўсё жыццё пражыла тут. Каля 1930 г. маю вуліцу пераназвалі ў вуліцу Гражыны. Пры гэтым наш дом № 35 стаў домам № 65. У дзяцінстве мае падарожжы заводзілі мяне не далей за старыя могілкі, на якіх быў пахаваны дзед Ян, прадзед Рафал і ... брат маёй мамы. ...

[216] Мирковский Бруно. Под прямым углом. Донецк, 2002. С. 173.

Праз нізкі мур (з боку тагачаснай вуліцы Мяніцкага, зараз Розы Люксембург. – Л. Л.) глядзеў я на надмагіллі пад разлеглымі ліставымі дрэвамі, елкамі і соснамі якія былі бачны ў слабым святле вулічных ліхтароў. ... Самай прыгожай часткай могілак лічыліся выгараджаныя нізкім плотам вайсковыя пахаванні. Тут меліся магілы палеглых у паўстанні Касцюшкі 1794 г., у паўстанні 1831 г. і паўстанні 1863 г. Большую частку могілак займалі магілы палеглых у Першай сусветнай вайне 1914–1918 гг. Ад іншых вайсковых магіл былі выдзелены магілы лётчыкаў. Тут былі самыя прыгожыя надмагіллі, і кожную магілу пазначаў самалётны прапелер. ... Пасярод вайсковых могілак узнімаўся высокі гранітны абеліск на версе якога раскрыў крылы белы арол лётчыкаў з белага граніту»[217].

Вядома, што касцюшкоўцы, якія загінулі пры абароне Ліды, былі пахаваны каля фарнага касцёла (гл. вышэй). Пазней парэшткі паўстанцаў Касцюшкі і Каліноўскага былі перазахаваны на новых на той час, могілках на Вісмантах. Калі я правільна разумею генезіс стаўлення ўладаў да падзей, жаўнеры 1831 г. маглі быць пахаваны тут цалкам легальна, здаецца, тады яшчэ імперскія ўлады не ваявалі з мёртвымі, як гэта было пасля 1863 г.

Прыкладна з 1919 г. у заходняй частцы старых могілак з'яўляецца асобны вайсковы квартал.

Пачалася Першая сусветная вайна, і ў 1915 г. тут з'явіліся новым пахаванні – шэраг салідных драўляных крыжоў з надпісамі, выкананымі гатычнымі літарамі:

«Браніслаў Плюціцкі, саніт. Беластоцкі ваенны шпіталь (Bialystoker Kriegs Hospital)».

«Юзаф Зяневіч, 400 Мінскі полк».

---

217 Асабісты архіў аўтара.

«Баляслаў Скажынскі»[218].

Міхал Шымялевіч пісаў:

«Першыя ахвяры польска-бальшавіцкай вайны 1919 г.: каля дзеда Яна Шкопа (†1909 г.) магіла з надпісам: «С. п. Віктар Шкоп валанцёр В. П. загінуў за Бацькаўшчыну ў барацьбе з бальшавікамі каля Лебяды 16 студзеня 1919 г., меў 19 гадоў».

Далей – красавік 1919 г.[219], бой за Ліду, узяцце Ліды, адыход і зноў узяцце 28 верасня 1920 г.

[218] Szymielewicz Michał. W cmentarnej ciszy // Ziemia Lidzka. 1937. № 11. S. 120.

[219] Спіс загінуўшых у 1919 г. пахаваных на вайсковай частцы старых могілках: Aleksanderek Władysław, II pułk legionów, III kompania, legionista; Baran Stefan, II pułk legionów, (?) kompania, legionista; Basałaj Wiktor, strzelec, III komp., pułk suwalski; Białek Józef, II pułk legionów, II kompania, legionista; Biały Antoni, legionista, 4 pułk legionów, 10 kompania; Bieganowski, legionista, 3 pułk legionów, IV kompania; Bonar, legionista, 3 pułk legionów, IV kompania; Bublewski Jan , strzelec, III komp., pułk suwalski; Chomicz Feliks, strzelec, II komp., pułk suwalski; Cybula Józef, II pułk legionów, I kompania, legionista; Czuper Leon, pułk suwalski, II (?) kompania, strzelec; Ćwik Stanisław, legionista, 4 pułk legionów, 10 kompania; Dobrogowski Jerzy, ułan ,7 pułk ułanów, I szwadron; Duda Franciszek, strzelec, III komp., pułk suwalski; Dziuba Władysław, II pułk legionów, II kompania, legionista; Gołygowski Adam, II pułk legionów, III kompania, legionista; Goros Teofil, legionista, 4 pułk legionów, 9 kompania; Gurowski Józef, strzelec, III komp., pułk suwalski; Gzymanow Antoni, II pułk legionów, III kompania, legionista; Hanadunda Józef, strzelec, I komp., pułk suwalski; Kaleta, legionista, 3 pułk legionów, IV kompania; Kędzira Stanisław, II pułk legionów, III kompania, legionista; Kiemiński Józef, pułk suwalski, porucznik; Kłosowski, 3 pułk legionów, IV kompania, kapral; Konopnicki Daniel, kapral, 4 pułk legionów, 10 kompania; Kopeć, legionista, 3 pułk legionów, IV kompania; Kowalski Jan, legionista, 4 pułk legionów, 9 kompania; Kozłowski Stanisław, ułan, 7 pułk ułanów, III szwadron; Kruiczyk Jan, strzelec, III komp., pułk suwalski; Krulik, legionista, 4 pułk legionów, 10 kompania; Kruszewski Stanisław, ułan, 7 pułk ułanów, I szwadron; Kubiak Wawrzyniec, II pułk legionów, II kompania, legionista; Kutera Michał, legionista, 3 pułk legionów, II kompania; Lipczyński Stefan, 7 pułk ułanów, I szwadron, st. ułan; Maciukiewicz Józef, strzelec, II komp., pułk suwalski; Majewski Franciszek, legionista, 4 pułk legionów, 10 kompania; Michałowski Leon, strzelec, pułk suwalski; Mularczyk Władysław, II pułk legionów, IV kompania, legionista; Myszkiewicz Włodzimierz, 7 pułk ułanów, I szwadron, ułan; Nika Jan, II pułk legionów, III kompania, legionista;Nowak Stanisław, II pułk legionów, IV kompania, legionista; Nowicki Bronisław, strzelec, III komp.,

«Генрык Жылінскі, паручнік 1-га Сувальскага палка, загінуў у баях пад Лідай 16 красавіка 1919 г.»

Паручнік Юзаф Гундэрман; паручнік Севярын Шыманюк; паручнік Фелікс Асецкі; паручнік Юзаф Клямпінскі; паручнік М. Шчалкоўскі; паручнік Феліцыян Радкевіч; вахмістр Францішак Марчык; сярж. Ян Уцёрка; шар. Станіслаў Кураш; шар. Мечыслаў Мінтле; ст. шар. Станіслаў Парыж; кан. Ян Ваўковек; ст. шар. Ян Матэрак; ст. шар. Антон Далята; кан. Юзаф Паўляк; шар. Ян Пятрашак; шар. Стэфан Мікалайчык; шар. Юзаф Баравіцкі; шар. Уладзіслаў Алтар;

---

pułk suwalski; Orsiniak Jan, II pułk legionów, IV kompania, legionista; Osika Stanisław, st. żołnierz, 4 pułk legionów, 9 kompania; Ostrowski Jan, legionista, 4 pułk legionów 10 kompania; Pałysiewicz, legionista, 3 pułk legionów, IV kompania; Paniecki Wacław, ułan, 7 pułk ułanów, II szwadron; Patura Piotr, II pułk legionów, III kompania, legionista; Patura, legionista, 3 pułk legionów, IV kompania; Piechota Władysław, st. żołnierz, 4 pułk legionów, 10 kompania; Pikula Kassjan, legionista, 4 pułk legionów, 10 kompania; Piwowański Wincenty, II pułk legionów, II kompania, legionista; Przekop Jan, st. żoln., pułk suwalski; Przepiórka Stefan, II pułk legionów, II kompania, legionista; Pszeniczny Feliks, 4 pułk legionów, 9 kompania, plutonowy; Pycz Bronisław, strzelec, III komp., pułk suwalski; Rodkiewicz Felicjan, pułk suwalski, porucznik; Rodziewicz Bronisław, strzelec, III komp., pułk suwalski; Rozkał Antoni, 7 pułk ułanów, III szwadron, kaprał; Samala Józef, legionista, 4 pułk legionów, 10 kompania; Skarzyński Bolesław, 3 pułk ułanów, (?) szwadron, ułan; Suski Jan, strzelec, III komp., pułk suwalski; Sykul Władysław, legionista, 4 pułk legionów, 10 kompania; Szczęsny Izydor, strzelec, III komp., pułk suwalski; Szmigielski Bolesław, strzelec, III komp., pułk suwalski; Szmigielski Jan, strzelec, pułk suwalski; Sznajder Ferdynand, 3 pułk ułanów, (?) szwadron, ułan; Szymański Seweryn, plutonowy, pułk suwalski; Tomaszewski Zygmunt, strzelec, III komp., pułk suwalski; Trus Tomasz, ułan, 7 pułk ułanów, III szwadron; Tuliszewski Józef, strzelec, III komp., pułk suwalski; Ulik Leon, legionista, 3 pułk legionów, III kompania; Ulisz Serafin, strzelec, III komp., pułk suwalski; Waliński Józef, strzelec, III komp., pułk suwalski; Węgrzynowicz Jan, 3 pułk legionów, I kompania, legionista; Wiejgad Bronisław, pułk suwalski, I komp., st. żołnierz; Wykusz, legionista, 3 pułk legionów, IV kompania; Wyrwicz Roman, 7 pułk ułanów, I szwadron, kaprał; Zalewski Stanisław, pułk suwalski, porucznik; Załuski Stanisław, 4-ty pułk ułanów, 3 szwadron, ułan; Ziołkowski Stanisław, legionista, 3 pułk legionów, IV kompania; Zychowicz Tomasz, legionista, 4 pułk legionów, 10 kompania; Zyliński Henryk, pułk suwalski, porucznik – Гл: Kołyszko A. Kwatera wojskowa parafialnego cmentarza katolickiego w Lidzie // Ziemia Lidzka № 29, styczeń 1998.

шар. Віктар Сэдляк; кан. Павел Рухлік; кан. Ян Ваўрыняк; кан. Уладзіслаў Орпель.

Каля той жа агароджы – супольная магіла ўсіх тых, якія загінулі ў ваколіцах Ліды ў 1919–1920 гг. і парэшткі якіх былі сабраныя ў 1924 г. Супольная магіла з’яднала тут і тых, якіх летам 1920 г. у даліне пры збегу тракту і шашы Ліда – Гродна расстраляў асобны аддзел ЧК пры штабе арміі Тухачэўскага ў Лідзе. Надпіс на гэтай магіле: «40 невядомых закладнікаў з Беластока, Гродна і Ваўкавыска, забітых бальшавікамі ў жніўні – верасні 1920 г.»[220].

«Мой Божа! Ці ж гэты малады, але хцівы да ўлады і славы, інтэлігентны афіцэр Тухачэўскі, якога я бачыў на вуліцах Ліды ў аўтамабілі, пакрытым чырвонай палярынай з залатымі махрамі, калі зацвярджаў выракі асобага аддзела, думаў пра тое, што калісьці і сам ён будзе расстраляны ў патыліцу з браўнінга? Забіты так, як і няшчасных ахвяр забівалі па яго камандзе.

Бо якім судом вы будзеце судзіць, такім і вас асудзяць, ды якою меркай вы будзеце мераць, такою вам адмераць. Мацвей VII, 2», – пісаў Міхал Шымялевіч[221].

Журналіст у рэпартажы з пахавання пілота Ціхоцкага ў 1928 г. пісаў: «Пры самым канцы могілак знаходзяцца магілы ваенных і невядомых: “Магіла 40 невядомых закладнікаў ...”, – цяжка прачытаць працяг, бо гэты помнік засланілі новыя крыжы»[222].

Пакуль удалося расшукаць толькі прозвішчы двух з 40 расстраляных закладнікаў – гэта жонка і дачка брата дэпутата Дзяржаўнай Думы А. А. Азнабішына[223].

[220] Магіла расстраляных закладнікаў з крыжам і памятнай таблічай, знішчана.

[221] Szymielewicz Michał. W cmentarnej ciszy // Ziemia Lidzka. 1937. № 11. S. 120.

[222] Słowo. №108(1719), 12 maja 1928.

[223] Азнабішын А.А. – грамадскі дзеяч, былы гродзенскі віцэ-губернатар. У пачатку 1919 года быў прызначаны сябрам беларускай дэлегацыі ў Парыжы.

Агульная магіла 40 закладнікаў знаходзіцца ў некалькіх метрах на ўсход ад абеліска з арлом, над ёй зараз устаноўлены металічны крыж.

З 1920-х гг. тут пачынаюць хаваць лётчыкаў 11-га знішчальнага і 5-га лётнага палкоў, і могілкі пачынаюць ператварацца ў лётныя. Адметнай рысай помніка менавіта лётчыкам з'яўляецца барэльефная выява арла з нахіленай уніз галавой, арол трымае ў дзюбе вянок.

Потым быў пабудаваны 8-мятровы абеліск, пастаўлены металічны плоцік. У 1920-я гг. вайсковая частка могілак была арыгінальным чынам агароджана. Для гэтага выкарысталі назапашаныя нямецкімі інжынернымі войскамі яшчэ падчас Першай сусветнай вайны сталёвыя шрубападобныя стойкі для калючага дроту, якія ў той час шырока выкарыстоўваліся. Такія сталёвыя стойкі мелі шэраг пераваг перад драўлянымі – яны добра вытрымлівалі артылерыйскі абстрэл, іх можна было ціха і незаўважна для супрацiўніка ўначы ўкручваць у зямлю г. д. Такім вельмі арыгінальным і прыгожым плотам з іх яшчэ нядаўна была агароджана вайсковая частка могілак. Гэту агароджу, якая сама па сабе з'яўлялася гістарычным помнікам, неразумна дэмантавалі падчас правядзення рэканструкцыі ваенных могілак у 2020 г. Дрэнна, калі за добрую справу бяруцца малаадукаваныя людзі.

Абеліск на вайсковай частцы старых гарадскіх могілак – праца маладога ў той час мастака Рафала Яхімовіча (Rafał Jachimowicz), пастаўлены на грошы, сабраныя лідскімі чыгуначнікамі. Газета «Пшэводнік Каталіцкі» сцвярджала, што абеліск быў пастаўлены ў гонар палеглых у 1919 і 1920 гг. пад Лідай польскіх жаўнераў і 40 расстраляных ЧК закладнікаў[224] а таксама загінуўшых у мірны час лётчыкаў 11-га авіяцыйнага палка (5-ты авіяцыйны

[224] Przewodnik Katolicki. № 11, 15 marca 1925.

полк дыслакаваўся ў Лідзе пасля 1927 г.). Улічваючы, што публікацыя ў каталіцкай газеце была надрукавана ў сакавіку 1925 г., помнік работы Рафала Яхімовіча пастаўлены не пазней за 1924 г.

**Рафал Яхімовіч** (польск. Rafal Jachimowicz; літ. Rapolas Jakimavicius; 20 кастрычніка 1893, Вільня – 19 лютага 1961, Вільня) – літоўскі і беларускі мастак і скульптар.

У 1913–1914 гг. Яхімовіч вучыўся ў мастацкай школе І. П. Трутнева, у 1915–1919 гг. займаўся ў студыі скульптуры Антонія Вівульскага, потым у 1919–1922 і 1923–1926 гг. вучыўся на аддзяленні прыгожых мастацтваў Універсітэта Стэфана Баторыя у прафесара Баляслава Балзукевіча. У 1922–1923 гг. Рафал Яхімовіч вучыўся ў Акадэміі мастацтваў у Кракаве (у Канстанты Ляшчкі), удасканальваўся ў Парыжы (1925 г.) і Італіі (1927 г.).

У 1915–1919 гг. выкладаў у Віленскім рамесным вучылішчы. Пасля Другой сусветнай вайны працаваў выкладчыкам у Віленскім мастацкім інстытуце (1944–1961 гг.), з 1947 г. – дацэнт.

З 1916 г. Рафал Яхімовіч актыўна ўдзельнічаў у выставах. Стварыў скульптурныя кампазіцыі «Смерць Ікара» (1919 г.), «Карыятыды» (1922 г.), «Бой з кентаўрам» (1925 г.). Аўтар скульптурных партрэтаў Уладзіслава Сыракомлі (1930 г.), Тадэвуша Урублеўскага (1930 г.), Пятраса Вайчунаса (1931 г.), Вінцаса Крэве (1941 г.), Эўгеніі Таўткайтэ (1960 г.).

У 1930 г. ў віленскім касцёле Святога Мікалая быў усталяваны бронзавы бюст Вялікага князя ВКЛ Вітаўта выкананы Яхімовічам. Прымаў удзел у стварэнні помніка 1200 гвардзейцам ў Калінінградзе (1945 г.). У 1960 г. у Вільні быў усталяваны помнік акцёру і дырыжор Барысасу Даўгувецісу з бюстам работы Яхімовіча.

Рафал Яхімовіч – аўтар некалькіх надмагільных помнікаў на могілках Росы, у тым ліку Тадэвушу Урублеўскаму (1930 г.) Стварыў некалькі статуй для касцёлаў Вільні. У віленскім Кафедральным саборы ўсталяваны бюст Ёнаса Басанавічуса (1943 г.).

Шыльды і помнікі расстраляным закладнікам, паўстанцам Касцюшкі, паўстанцам 1831 і 1863 гг., і інш., відочна, былі знішчаны пасля 1939 г.

Некалькі біяграфій пілотаў, пахаваных ў вайсковым квартале:

**Залескі Адам** (2.08.1886–12.07.1926) нарадзіўся ў Варшаве, скончыў Маскоўскі кадэцкі корпус (1904), Канстанцінаўскую школу артылерыі ў Пецярбургу, тэарэтычныя авіяцыйныя курсы пры Пецярбургскім політэхнічным інстытуце (1913). Школу пілатажу прайшоў у Севастопалі. У гады І-й Сусветнай вайны камандаваў расійскай авіяцыйнай эскадрылляй, а затым дывізіёнам. 15 жніўня 1919 г. у званні палкоўніка ўступіў у польскія Вайскова-паветраныя сілы. Атрымаў пасаду камандуючага палявой авіяцыяй. У ліпені 1920 г. камандуючы авіяцыяй абароны Варшавы. Пасля вайны – камендант Макатоўскага аэрапорта, з сакавіка 1922 г. – намеснік камандзіра 2-га авіяцыйнага палка ў Кракаве. 26 лістапада 1925 г. пераведзены на пасаду намесніка камандзіра 11-га знішчальнага палка ў Лідзе. Пахаваны ў Лідзе[225].

14 ліпеня 1926 г. Кур'ер Віленскі паведаміў: «... палкоўнік Адам Залескі, намеснік камандзіра 11 лётнага палка знішчальнікаў упаў учора з самалётам каля Ліды і забіўся. Загінуўшы меў 12 гадоў лётнага стажу»[226].

[225] Ku czci poległych lotników: księga pamiątkowa: praca zbiorowa. Warszawa, 1933. S. 345.
[226] Kurjer Wileński. №159(601), 14 lipca 1926.

**Чарнецкі Францішак** (загінуў 10.06.27). Сяржант-пілот рэзерву, належаў да 11-га лётнага палка знішчальнікаў. Загінуў падчас палёту. Пахаваны ў Лідзе[227].

**Стэнцал Павел Генрык** (16.10.1899–21.01.1928), нарадзіўся ў Юзафове. У 1917 г. быў мабілізаваны ў нямецкае войска. У 1918 г. трапіў у французскі палон. У лютым 1919 г. уступіў у армію генерала Галера. Закончыў школу падафіцэраў. Вярнуўшыся на радзіму служыў у 8-ай пяхотнай дывізіі (1919-20), пасля чаго ў парку ўзбраення 3-й арміі. Да чэрвеня 1922 г. у шэрагах войск Сярэдняй Літвы. Вучыўся ў лётных школах у Быдгашчы і Грудзёнску. Пасля атрымання дыплома пілота ў верасні 1923 г. накіраваны ў 3-ці авіяцыйны полк. Служыў у званні старшага сяржанта-пілота ў 11 палку знішчальнікаў у Лідзе. Загінуў пад час палёту 21 студзеня 1928 г. Пахаваны ў Лідзе[228].

**Ціхоцкі Аляксандр** (27.01.1900–1.05.1928), нарадзіўся ў Цеханаве ў сям'і Яна і Зоф'і з Сяцінскіх. Скончыў Кадэцкі корпус (1917). Уступіў у белую армію генерала Карнілава, затым Урангеля. Служыў у званні падкапітана. У баях з бальшавікамі быў тры разы паранены. Вярнуўся ў Польшчу, у 1921 г. у званні шарагоўца ўступіў ў польскае войска. Скончыў Вялікапольскую школу падхарунжых пяхоты. Служыў у 86-ым палку пяхоты ў званні падпаручніка і паручніка. Закончыў школу пілотаў у Быдгашчы (1924). У званні паручніка накіраваны ў 11-ты полк знішчальнікаў у Лідзе. Лічыўся адным з лепшых вайсковых лётчыкаў. У 1926 г. разам з палкоўнікам Райскім прымаў удзел у пералёце па балтыйскіх краінах. У 1927 г., прымаў удзел у міжнародных спаборніцтвах ў Цурыху, разам з

---

[227] Ku czci poległych lotników: księga pamiątkowa: praca zbiorowa. Warszawa, 1933. S. 347.

[228] Там жа. S. 349–350.

палкоўнікам Касоўскім і капітанам Арліньскім, заняў II-е месца. Пахаваны ў Лідзе[229].

1 мая 1928 г. каля 19-00 недалёка ад Дакудава разбіўся самалёт 11-га палка знішчальнікаў «Spad-61». На вышыні 2 000 метраў самалёт увайшоў у «штопар», і лётчык, ратуючы сваё жыццё, скокнуў з парашутам. Але купал парашута раскрыўся толькі каля самай зямлі, і пілот-паручнік Ціхоцкі загінуў. Ціхоцкі лічыўся адным з лепшых лётчыкаў у авіяцыі – незадоўга да гібелі ён заняў другое месца на міжнародных авіяцыйных спаборніцтвах у Швейцарыі[230].

Віленскі пісьменнік Юзаф Мацкевіч (які праз нейкі стаў сусветна вядомым) у артыкуле 1938 г. пісаў пра стаўленне да жаўнерскіх магіл: «Здаецца, не ўсе ўсведамляюць маральнае значэнне знешніх праяў рыцарства. Бадай што, самая важная яго праява – гэта ўтрыманне магіл сапернікаў, якія загінулі на вайне. Безумоўна, гэта традыцыя змяшчае ў сабе момант высакароднага абуджэння, мае эстэтычнае і выхаваўчае значэнне цалкам адпаведнае рыцарскім традыцыям».

Мацкевіч паведамляў, што ў 1914 г. у Вільні ў скверыку каля касцёла св. Кацярыны павінен быў з'явіцца помнік загінуўшым у вайну 1812 г. французскім жаўнерам, але гэтаму перашкодзіла Першая сусветная вайна. А ў 1930-я гг. прэзідэнт Польшчы Масціцкі нават забараніў знішчыць помнік у Рудніцкай пушчы рускаму паручніку Арбузаву і яго жаўнерам, якія загінулі ў бітве з паўстанцамі 1863 г.

Потым аўтар напісаў пра захаванне немцамі магіл рускіх жаўнераў пасля Першай сусветнай вайны: «Магілы рускіх, па стаўленню да іх мала чым адрозніваюцца ад магіл іх уласных жаўнераў. Праваслаўныя крыжы і надпісы

[229] Там жа. 1933. S. 351.
[230] Słowo. №101(1712), 3 maja 1928.

на нагробках, на якіх звычайна напісана пра «гераічную смерць», могуць служыць прыкладам такога традыцыйнага стаўлення. Немцы ўшаноўвалі памяць сваіх праціўнікаў як на сваёй, гэтак і на акупаванай тэрыторыі. У якасці прыклада можна прывесці помнікі жаўнерам палтаўскага і чарнігаўскага палкоў, якія загінулі на пачатку вайны (Першай сусветнай. – Л. Л.) у Прусіі пад горадам Арлоў. Дарэчы, на нашай тэрыторыі ёсць шмат нямецкіх могілак, дзе разам з нямецкімі жаўнерамі спачываюць і іх ворагі.

Акрамя каштоўнасцей маральна-хрысціянскіх, традыцыйна-рыцарскіх, шляхетных і эстэтычных, падобныя могілкі маюць яшчэ і гістарычную каштоўнасць. І таму культурны свет трактуе знішчэнне такіх пахаванняў як прыкмету відавочнага варварства»[231].

З сярэдзіны дзевяностых гадоў розныя польскія арганізацыі з Польшчы і Беларусі ўзялі пад апеку старыя могілкі і, адпаведна, вайсковы квартал. Былі рэстаўраваны крыжы і помнікі лётчыкаў у межах квартала. Знойдзена магіла М. Алендра (5 полк).

Восенню 2001 года адноўлены абеліск, які завершаны прыгожай скульптурай, дакладнай копіяй перадваеннай.

* * *

Міхал Шымялевіч скончыў свой артыкул пра старыя лідскія могілкі словамі, якімі і мы жадаем закончыць гэту частку сваёй кнігі: «Не меней як дзесяць тысяч парэшткаў лідзян ляжыць тут, на 4 гектарах[232], і ў ценю сасновага бору

---

[231] J. M. [Józef Mackiewicz] Gest rycerskiej tradycji // Słowo. № 309. 9 listopada 1938.

[232] Дарэчы, самымі вялікімі могілкамі ў свеце з'яўляюцца Вадзі ас-Салам (Даліна свету). Яны размешчаны ў іракскім горадзе Ан-Наджаф. На гэтых могілках хаваюць штодня ужо на працягу 1400 гадоў – мусульмане-шыіты лічаць за гонар быць пахаваным у чаканні Суднага дня побач

не памятаюць ні пра свае няшчасці, ні пра свае радасці. З праху паўсталі і ў прах вярнуліся»[233].

## Магіла ксяндза Адама Фалькоўскага

Казакі на Выгане расстралялі ксяндза Адама Фалькоўскага з мястэчка Ішчална ў 1863 г. за чытанне вернікам маніфеста паўстанцаў. Ён быў арыштаваны 2 сакавіка 1863 г. і расстраляны 24 (13) чэрвеня. Відавочца так апісваў гэту падзею: «Калі яго прывезлі ў Ліду, ахоўваючы як вялікага злачынцу, ксёндз яшчэ не разумеў, што яму можа пагражаць смерць. Упэўніўся толькі тады, калі ў турму ў апошнюю хвіліну прыйшоў мясцовы пробашч ксёндз Свірскі, каб спавядаць Фалькоўскага перад смерцю, ён меў трохі больш за 50 гадоў.

З каменным спакоем ішоў каплан да месца пакарання на Выган за горадам, дзе пасвіліся яўрэйскія козы. Ішоў сам, нягледзячы на значную адлегласць, і толькі раз падкасіліся яго калені. Камандаваў атрадам казакаў Пера-свет-Солтан, Ён прапанаваў вязню сесці на вазок, на якім ехаў сам. Асуджаны адмовіўся. Хацеў, як Хрыстос, данесці свой крыж да канца. Бледнымі вуснамі шаптаў пацеры..., а калі голас яму здраджваў, ламаўся, прадоўжыць малітву дапамагаў ксёндз Свірскі, які суправаджаў Фалькоўскага.

Каля слупа быў ужо выкапаны дол. Тлум з простага народу атачаў месца пакарання. Ксёндз Фалькоўскі штосьці прамовіў каля слупа, але барабаны заглушылі яго словы... Прагучала каманда і выбухнуў залп. Цела, якое яшчэ торгалася, скацілася ў дол. У горадзе зараз жа пачалі біць касцельныя званы, і ва ўсіх касцёлах пачалася жалобная імша. Магілу, насыпаную на месцы пакарання,

---

з зяцем прарока Мухамеда і імамам Алі ібн Абу Талібам. Тут на тэрыторыі 6 кв. км пахавана больш за пяць мільёнаў чалавек.

[233] Szymielewicz Michał. W cmentarnej ciszy // Ziemia Lidzka. 1937. № 11. S. 120.

казакі зраўнялі з зямлёй капытамі коней. Жаўнеры штыкамі разганялі тлум людзей, якія ціснуліся да магілы, каб узяць пясок, прапітаны крывёй расстралянага. Ліда вiравала болем і жахам».

Другі відавочца расказваў: «...каля 6 гадзін раніцы с. п. ксёндз Адам Фалькоўскі ішоў на месца страты засяроджаны і чытаў малітвы з кантычкі. Яго прывялі з лідскай вязніцы да месца, дзе была выкапана яма і ў вялікай бочцы падрыхтавана свежая вапна. ...зачыталі смяротны прыгавор... грымнуў залп з казацкіх карабінаў. ...укінулі цела без труны ў яму і залілі вапнай. Магілу закапалі, эскадрон казакаў на конях зацёр усялякі след магілы. Наш люд ціха назіраў і, стоячы ў розных пунктах, перакрыжаваннем ліній акрэсліў месца магілы, а пасля адходу катаў аблажыў магілу камянямі. Паліцыя шмат разоў раскідвала каменне, але наш добры народ заўсёды пазначаў тое месца чатырохвугольнікам з камянёў...».

Лідскі самавук-вынаходнік Яўстах Шалевіч пісаў на пачатку ХХ ст.: «У 1863 г. пробашчам у Ішчалне быў кс. Фалькоўскі. Ён прачытаў заклік да сялян далучацца да паўстання, за што быў расстраляны ў Лідзе. Месца пакарання выбралі недалёка ад горада, на Выгане, дзе зараз стаіць ветраны млын. Не раз, ідучы гэтым месцам, я думаў пра гэтую магілу нашага шаноўнага кс. Фалькоўскага».

У 1919 г. лідскія чыгуначнікі разам з іншымі лідзянамі задумалі ўшанаваць магілу ксяндза і паставіць помнік: «Чыгуначнік Стэфан Лоўкіс прыняў тую справу блізка да сэрца, зрабіў крыж з жалезных труб і падрыхтаваў цэмент для помніка. ... наступіла хвіліна, калі трэба было адшукаць магілу. Людзі – жывыя ў 1919 г. сведкі падзеі... (расстрэлу і пахавання ксяндза. – Л. Л.) – сталі на тыя самыя месцы, як і ў 1863 г., і на скрыжаванні ліній знайшлі магілу. Пры капанні ямы пад фундамент помніка натрапілі

на камяні, а глыбей – на вапну. Месца гэтае – бясспрэчна магіла расстралянага ксяндза».

Памяць пра 1863 г. жыве і сёння. Помнік на магіле Адама Фалькоўскага, зламаны ў 1939 г. пасля працяглай барацьбы лідзян з нашчадкамі Мураўёва-вешальніка, адноўлены і з’яўляецца адной з галоўных кропак гістарычнай памяці нашага горада.

Каардынаты магільнага каменя ксяндза Фалькоўскага: 53°53’50.6”N 25°17’33.6”E

У 1914 г. у Лідзе ўжо ўсё было гатова да будаўніцтва касцёла на Выгане (тэрыторыя сучаснага гарадскога парку), каля магілы расстралянага ў 1863 г. ксяндза Фалькоўскага. Можна не сумнявацца, калі б не Першая Сусветная вайна, дык касцёл быў бы пабудаваны. Прэса назвала гэты касцёл  «Касцёлам на крыві».

Вельмі непрыхільная да гэтай справы газета «Северо-Западная жизнь» летам 1914 г. пісала: «У Лідзе даўно ўжо ладзіцца пабудова другога, непатрэбнага касцёла. Сродкі на яго збіраюцца ў выглядзе патаемных складак. Кажуць, што ксёндз-дэкан прывёз з Аўстрыі ад езуітаў вялікую суму грошай. Вядомы фанатык банкір Янушкевіч і абшарнік Іваноўскі, які займае вельмі важнае месца ў Пецярбургскім чыноўным свеце, таксама зрабілі вельмі вялікія ўнёскі.

Лідская гарадская грамадская ўправа некалькі месяцаў таму пачала хадайнічаць перад віленскім губернатарам аб надзяленні 3 дзесяцін грамадскай зямлі пад пабудову касцёла, які зараз праектуецца. Пад касцёл адводзіцца занадта шмат зямлі, і [выбраны] самы лепшы ўчастак для гэтай пабудовы: ... на гэтым пляцы, за Віленскай заставай, быў пакараны смерцю мяцежны ксёндз Фалькоўскі

за супрацьурадавую прапаганду сярод народных мас супраць рускага войска».

«Абшарнік Іваноўскі» – гэта Леанард Іваноўскі, уладальнік маёнтка Лябёдка, тайны дарадца (самы вышэйшы чын ў «Табелі аб рангах» Расійскай імперыі) бацька 4 сыноў і 1 дачкі. Другі сын Леанарда – Вацлаў Іваноўскі, адзін з пачынальнікаў беларускага нацыянальнага руху. Дачка Леанарда, Алена Скіндар Іваноўская, першая перакладчыца з беларускай на англійскую мову, вучылася ў Кембрыджы і ў 1914–1924 гг. у чатырох нумарах лонданскага часопіса «Folk-Lore» надрукавала дзесяткі беларускіх народны песняў з перакладамі на англійскую мову. Кожнай публікацыі папярэднічаў вялікі ўводны артыкул, у якім Іваноўская расказвала пра гісторыю і культуру Беларусі. У 1916 г. яна стала, калі не першай, дык адной з першых беларускіх настаўніц на Лідчыне[234].

Цікава, што тагачасная афіцыяльная прэса пацвярджала шматгадовае шанаванне лідзянамі месца расстрэлу ксяндза: «Старажылы Ліды памятаюць гэтую справу. Шмат гадоў на месцы пакарання ксяндза нейчай нябачнай рукой выкладваўся з камянёў крыж. Толькі нядаўна, каб пазбегнуць падазрэння, гэты крыж знік – верагодна таму, што распачалося хадайніцтва аб атрыманні зямлі пад касцёл. Паміж старымі жыве легенда, што тут па начах, патаемна маліліся ксяндзы і іншыя “патрыёты” – тутэйшыя і прыезджыя. Вось якое месца выбралі пад касцёл – ён будзе пабудаваны на костках і крыві пакутніка. З гэтым месцам звязаны яшчэ жывыя ўспаміны … . Сюды пацягнуцца тысячы багамольцаў з багатымі дарамі. Мяркуецца пабудаваць велічны касцёл з усімі неабходнымі пабудовамі і сцяной вакол яго. Гэта будзе сапраўдная цвердзь. Для та-

[234] Гл: Лаўрэш Леанід. Лябёдка Іваноўскіх. Дакументальная аповесць // Новы Замак. 2019. № 8. С. 194–212; 2020. № 9. С. 180–219.

кой вялікай пабудовы патрабуецца 3 дзесяціны зямлі. Лідская гарадская ўправа сярод 12 упаўнаважаных мае 9 католікаў, 2 праваслаўных і 1 яўрэя».

Дадам яшчэ, што па ўказу апошняга рускага цара, Леанард Іваноўскі з'яўляецца ганаровым грамадзянінам нашага горада за дзейсную працу па адкрыцці вельмі неабходнай Лідскай мужчынскай гімназіі[235].

[235] Гл: Лаўрэш Леанід. Леанард Іваноўскі, тайны дарадца і ганаровы грамадзянін Ліды // Лідскі Летапісец. 2020. № 4(92). С. 72–79.

# Іканаграфія нагробкаў

У сучасным жыцці мы рэдка задумваемся аб смерці і ўжо не ведаем пра сімвалічную ролю могілак у жыцці ранейшага грамадства. Мы ўжо не лічым могілкі «пасрэднікамі» паміж жывымі і тымі, хто назаўсёды адышоў у вечнасць, а роля іканаграфічных элементаў на сучасных надмагіллях зводзіцца да самых простых дэкарацый. Аднак яшчэ да сярэдзіны XX ст. у гэтай справе паўсюдна выкарыстоўвалася надзвычай вялікая і ўніверсальная сімволіка, якая ў роўнай меры датычыла розных хрысціянскіх канфесій.

Можна нагадаць наступныя, галоўныя тэмы сімволікі.

Смерць як сон.

Грэцкая багіня ночы Нікс (ці Нікта) мела двух сыноў-блізнятаў – бога смерці Танатаса (яго малявалі як маладога чалавека з чорнымі крыламі і патухлай паходняй) і бога сну Гіпнаса (яго малявалі як юнака з кіям і рогам, напоўненым вадой з ракі забыцця Леты ці макавым сокам). Багі смерці і сну былі звязаны братэрскай сувяззю – гэтак жа, як сон начны і сон вечны. Яшчэ і сёння ў нашай мове мы часта выкарыстоўваем выразы «заснуў вечным сном» або «спі спакойна». Таму выява маку на надмагіллях з'яўляецца сімвалам вечнага, а анёлы, якія трымаюць у руках мак, часта былі адным з дэкаратыўных элементаў магільнай агароджы.

Смерць як пераход.

Надмагільны помнік мог быць выкананы ў форме дзвярэй – брамы ў вечнае жыццё. Матыў адчыненых, прыадчыненых або цалкам зачыненых дзвярэй быў папулярны ў перыяд рэнесансу, барока і ў XIX ст., а сам надмагільны помнік мог быць выкананы ў форме прыад-

чыненых дзвярэй, перад якімі стаіць анёл у доўгім адзенні, Гэта ён сімвалічна расхінае перад душой памерлага браму ў вечнае жыццё. На надмагіллях часта можна ўбачыць выяву анёлаў жалобы з апушчанымі крыламі; анёлаў веры, якія паказваюць кірунак да шляху выратавання, або анёлаў смерці, якія суправаджаюць душы памерлых па дарозе на неба.

«Памятай аб смерці».

Напамінанні аб тленнасці і непазбежным канцы жыцця сустракаліся не толькі ў літаратуры. Лацінскую максіму «Memento mori» («Памятай аб смерці») можна было ўбачыць на надмагіллях, але часцей на іх малявалі сімвалы хуткабежнасці чалавечага жыцця, тлену і смерці. Пра мімалётнасць жыцця на помніках нагадваюць выявы зламаных дрэў, перавязаных жалобнымі стужкамі ўрнаў, згарэлых свечак, разбураных калон, завялых кветак. Тленнасць жыцця (і адначасова душы, якая пакідае цела) сімвалізуюць таксама і матылі.

Матылі – сімвал шматзначны. Кароткі жыццёвы цыкл матыля, яго сталае «паміранне« і адраджэнне ў наступнай форме (ад яйка праз лічынку, кукалку і да імаго[236]), робіць з яго сімвал хуткацечнага жыцця, смерці і ўваскрэсення.

Птушкай, якая сімвалізуе смерць, ёсць сава – атрыбут хтанічных боствaў (боствaў падземнага сусвету). Даўней лічылася, што вухканне совы прадвесціць смерць. Саму смерць малявалі на надмагільных помніках у выглядзе чэрапа, скрыжаваных костак, радзей – у выглядзе шкілета ці апушчанай паходні – старажытнага сімвала Танатаса.

Вялікую распаўсюджанасць мела і іншая сімволіка кароткатэрміновасці жыцця. Часцей за ўсё яе сімвалізаваў

---

[236] Імаго (лац.: imago – «вобраз») – дарослая стадыя індывідуальнага развіцця насякомых і некаторых іншых членістаногіх са складаным жыццёвым цыклам.

пясочны гадзіннік. Пры тым, што пясочны гадзіннік таксама з'яўляецца і атрыбутам захавальніка часу Хронаса. Яшчэ на надмагіллях можна было ўбачыць выяву старога, які трымае ў руцэ пясочны гадзіннік або касу.

Аб непазбежнасці смерці павінны нагадваць надмагільныя надпісы (у тым ліку распаўсюджанае лацінскае выслоўе «Quod tu es, fui, quod sum, tu eris» («Я быў тым, хто ты зараз, а тым, хто я зараз, яшчэ ты будзеш»).

Словы Гарацыя «Non omnis moriar» («Увесь я не памру») – гэта надзея на доўгую памяць сярод жывых, спроба ў камені ўвекавечыць сваё месца, заслугі і свае дабрадзействы. Таму на надмагіллях мы часта бачым не толькі эпітафіі, але і сімвалічныя выявы прафесій (ноты на магілах музыкаў, кнігі на магілах пісьменнікаў або палівачкі і граблі на магілах садоўнікаў і г. д.), а таксама напамінанні аб дасягненнях нябожчыка.

На надмагіллях можна ўбачыць і знакі ўсеагульнай надзеі на ўваскрэсенне і жыццё вечнае. Часта яны ўвасабляюць галоўныя хрысціянскія дабрадзейнасці: веру (крыж), надзею (якар) і любоў (сэрца), якія паказваюць прамы шлях да збаўлення праз веру ва ўваскрэсенне. Часам трапляецца і больш старажытны сімвал – змяя, якая пажырае сама сябе.

Асаблівае значэнне на могілках маюць вечназялёныя расліны, напрыклад плюшч ці барвінак. Яны настолькі зрасліся з могілкавым пейзажам, што іх лічаць нават фітаіндыкатарамі – раслінамі, якія дазваляюць гісторыкам культуры знаходзіць месцы былых некропаляў. Гэтыя расліны мелі таксама сімвалічнае значэнне неўміручасці і будучага раю. На могілках нярэдка можна ўбачыць тую ці папараць. Папараць, якая расце ў вільготных і цёмных месцах, заўсёды ўспрымалася як расліна, якая жыве «паміж сусветамі».

На надмагіллях можна ўбачыць таксама і выявы пальмавага лісця (знак праведнасці, цноты, маральнай перамогі над сусветам), лаўровага ліста (доўгая памяць і неўміручасць), пальму (знак справядлівасці, славы і вечнага жыцця), лілеі (нявіннасць – малюнкі гэтых кветак часцей за ўсё сустракаюцца на магілах дзяцей і маладых жанчын), і, нарэшце, ружы (памяць і тленнасць чалавечага жыцця). На магілах вядомых людзей, у тым ліку вайскоўцаў, часта сустракаецца як сімвал адвагі, дубовае лісце або вянкі з яго. Яшчэ ў Старажытным Рыме вянок з дубовага лісця ўручалі тым, хто ў бітве выратаваў жыццё суграмадзян. А плюшч, дзякуючы сваёй цэпкасці, сімвалізуе доўгую памяць.

Якія ж помнікі і пахавальная сімволіка захаваліся сёння на нашых старых могілках? Для вырабу помнікаў найчасцей выкарыстоўваўся чорны, шэры і чырвона-ружовы граніт ці мармур. У 1920–1960-х гг. помнікі пачалі вырабляюцца таксама і з бетону, або бетону з дамешкам гранітнай дробкі.

Вельмі выразныя па сваёй форме дэндралагічныя помнікі нагадваюць ствол дрэва з абсечанымі галінамі. Такія помнікі ставіліся як знак таго, што нябожчык не пакінуў пасля сябе нашчадкаў. Помнікі такой формы стаяць на магілах Зоф'і Міклашэвіч, Баляслава Шукевіча, Нікадзіма Мілевіча і інш.

У XIX ст. Еўропа адкрыла для сябе Егіпет і на могілках пачалі будавацца сямейныя капліцы-пахавальні, усталёўвацца надмагільныя помнікі ў выглядзе стэл, рабіцца надпісы, якія нагадваюць па зместу егіпецкія пахавальныя тэксты.

Каменная стэла на месцы пахавання – гэта не проста стэла, гэта чыясьці малітва-літанія: праслаўленне, згад-

ванне самых галоўных рысаў Бога. У той час лічылася, што сапраўднае імя Бога з'яўляецца тайнай. Егіпцяне верылі, што калі звяртацца да Бога ў малітве і пералічваць пры гэтым найпрыгажэйшыя і наймілейшыя яго рысы, можна выпадкова агучыць сапраўднае імя і тады Бог абавязкова адорыць сваёй міласцю таго, хто яго просіць. Лідскія могілкі таксама закранула гэтая хваля цікаўнасці да Егіпта. У цэнтральнай частцы, там дзе маюцца пахаванні найбольш заможных лідзян, пачынаючы з XIX ст., стаяць помнікі з чорнага граніту стылізаваныя пад егіпецкія стэлы. Гэта помнікі фамілій Крахельскіх і Садоўскіх. Захавалася сямейная капліца-пахавальня Граблісаў. Часткова захаваўся фамільны склеп Максімільяны Садоўскай.

Калі ідзеш уздоўж старажытных егіпецкіх грабніц, на ўваходзе ў кожную грабніцу маюцца надпісы – памінальная формула, якая згадвае гэтага нябожчыка. І нябожчык як быццам просіць мінака прачытаць гэтую формулу, успомніць, памянуць яго добрым словам перад тварам Усёмагутнага Бога. Вось напрыклад падобны надпіс: «Для цябе гэта толькі подых ветрыку ля вуснаў, а для мяне – жыццё вечнае». Гэта памінанне, успамін пра чалавека, прачытанне таго, што знаходзіцца перад вачамі і складае аснову егіпецкай культуры памяці.

На ўзор агульнаеўрапейскага стылю XIX ст., які ў нейкай ступені наследаваў егіпецкаму стылю, на помніку маглі пакінуць зварот да наведвальнікаў могілак з просьбай аб малітве за памерлага. Напрыклад на помніку Марціну Калясінскаму ў апошнім радку маецца адсыл да надпісу ў егіпецкай грабніцы:

«Божа, зжалься над душою
с. п. Штабс-капітана Марціна Калясінскага.
Жыў 76 гадоў, памёр 15 сакавіка 1890 года.

Знясіленая жонка просіць мінакоў
аб уздыху да Бога.»

Або надпіс на помніку Валерыі з Хрулёў Каранеўскай:

«Тут спачываюць парэшткі
с. п. Валерыі з Хрулёў Каранеўскай
памерла 4 сакавіка 1880 г., ва ўзросце 34 гады
з чатырма дзецьмі.
Мінакоў просіць аб трох “Здровась Марыя”».

На хрысціянскім надмагіллі заўсёды прысутнічае выява крыжа, што павінна сведчыць пра адданасць чалавека Богу. Выява матыля можа казаць пра тое, што тут пахавана дзіцё, напрыклад як на помніку 11-ці гадоваму Пятру Масіне. Выява анёлка ці ягня таксама сімвалізуе дзіцячае пахаванне. Арол са схіленай уніз галавой і вянком у дзюбе – знак таго, што пад магільнай плітой пахаваны лётчык. Зламаная ружа можа быць сімвалам маладосці, смерці ў росквіце жыцця. На больш заможных каменных помніках XIX ст. маюцца выбітыя разьбяром выявы вянкоў з дубовых лістоў абвітых стужкай, а на бетонных помніках 1940–1950-х гг. такія вянкі прарысаваны фарбай. На яшчэ больш дарагіх помніках, напрыклад на варшаўскіх Павонзках, выявы вянкоў зроблены як барэльеф.

У стылістыцы надмагільных помнікаў ўжывацца наступныя элементы:

1). Выява крыжа;

2) Формула з некалькіх літар:

3) У шляхты выява герба;

4) Імя, прозвішча;

5) Пасада, якую займаў чалавек пры жыцці, чын або прафесія;

6) Даты нараджэння і смерці;

7) Мастацкае аздабленне сімваламі;

8) Біяграфічныя звесткі, жалобны тэкст, эпітафія.

Больш падрабязна і з прыкладамі па кожнай пазіцыі.

1) Выява крыжа сведчыць аб адданасці чалавека Богу і аб тым, што тут пахаваны хрысціянскі вернік. На помніках сустракаюцца як класічная выявы крыжоў, так і мальтыйскія крыжы.

2) Абавязковая формула месціцца ніжэй крыжа і складаецца з двух літар: s. p. – святой памяці (с. п.) і трох лацінскія літар D.O.M.[237] – «Deo Optimo Maximo» – «Богу Найлепшаму і Найвялікшаму», лац.;

3) Шляхецкае паходжанне нябожчыка пацвярджаецца выявай ці назвай герба на помніку. Трэба ўлічваць, што пры напісанні некаторых прозвішчаў шляхта выкарыстоўвала падвоеныя зычныя літары, напрыклад: Нарбутт, Тукалла, Паццэвіч, Рылла.

4) Заўсёды маюцца персанальныя звесткі пра нябожчыка, яго імя і прозвішча. На помніку жанчыне форма прозвішча дазваляе даведацца пра яе матрыманіяльны стан. Канчатак прозвішча на -ева, -ова, -іна, -ына кажа пра яе замужжа. Напрыклад: Ляскавічова, Стэфанавічова, Хрулёва, Брейвіна, Кулешына. Калі пахавана незамужняя панна, то прозвішча мае канчатак -оўна, -еўна. Напрыклад: Ляскавічоўна, Стэфанавічоўна, Хрулёўна. У выпадку пахавання замужняй жанчыны абавязкова дадавалася прозвішча сям'і, з якой яна паходзіць, як даніна павагі да роду нябожчыцы. Напрыклад: Максімілія Садоўская з Даўгялаў, Ядвіга Пацэвічова з Яцкевічаў.

[237] Калі рымляне былі язычнікамі гэта фраза прызначалася богу Юпітэру. Пасля прыняцця хрысціянства яе сталі ўжываць у адносінах да Адзінага Бога.

На помніках, усталяваных на месцы пахавання дзяцей, імя напісана ў памяншальна-ласкальнай форме, напрыклад: Ясь Хруль, Манюся Камінская, Ясь і Юзя – дзеці Баляслава і Аляксандры Шукевічаў.

5) Адукаваны чалавек або добры прафесіянал ганарыўся сваім становішчам у грамадстве, таму родныя выказвалі яму павагу і пісалі на помніку назву справы, якой займаўся нябожчык ці яго чын. Напрыклад: Марцін Калясінскі, штабс-капітан; Канстанцін Кучынскі, калежскі асэсар; Ежы Гербедзь, ляснічы. На помніку замужняй жанчыны магла абазначацца пасада ці чын яе мужа, гэтым падкрэсліваўся статус нябожчыцы, Напрыклад: Дар'я Кучынская, жонка калежскага асэсара; Разына Кулешына, палкоўнікава.

6) Звесткі пра працягласць жыцця нябожчыка маглі падавацца як формула. Замест слова «нарадзіўся (-лася)» знак «*», а замест слова «памёр (-ла)» знак «†». Напрыклад: Эмілія Буткевічова з Адамовічаў *1813 г. †1879 г.

Але часцей на помніку пазначалася дата смерці (больш важная для ўшанавання душы памерлага малітвай) і працягласць жыцця чалавека. Напрыклад: Міхал Бычкоўскі, пам. 27.05.1933 г., жыў 24 гады.

Ёсць прыклады напісання даты нараджэння і даты смерці: Стэфан Буткевіч, нар. 19.02.1815 г., пам. 30.03.1896 г.

Захаваліся помнікі з лакунамі (разрывамі) ў надпісах, што здаралася, калі помнік заказалі загадзя, а потым не паспелі, або не было каму заказаць працяг надпісу. Напрыклад, лакуны мае надпіс на помніку Канстанціну Кучынскаму.

7) Розныя сімвалічныя выявы на помніках павінны без слоў апавядаюць пра нябожчыка.

8) На помніках часцяком прысутнічаюць эпітафіі (могуць быць у вершаванай форме) прысвечаныя памерламу.

Напрыклад, вершаваныя эпітафіі на помніках Юзафу Грабавецкаму, Максіміліяне Садоўскай, Юзафу і Канстанцыі Змітровічам.

Пасля аднаўлення старых гарадскіх (каталіцкіх) могілак у 2017–2020 гг., бала прааналізавана інфармацыі аб імёнах 1583 асоб, з іх 827 мужчын і 756 жанчын.

Найбольш распаўсюджаныя імёны сярод мужчынскіх: Ян 12%; Юзаф 9%; Станіслаў 5%; Міхал 5%; Казімір 5%; Адам 4%; Вінцэнт, Антон, Пётр, Стэфан па 3%.

Найбольш распаўсюджаныя імёны сярод жаночых: Марыя 12%; Ганна 10%; Юзэфа 5%; Зоф'я, Ядвіга, Хелена па 4%; Анэля, Антаніна, Эмілія, Катажына, Разалія, Стэфанія па 3%.

Рэдкія мужчынскія імёны: Альгерд, Геранім, Густаў, Лонгін, Нарцыс, Норберт, Гіляры, Панцеляймон, Эрнест, Эверэст.

Рэдкія жаночыя імёны: Адэльфіна, Аўрэлія, Апалонія, Брыгіда, Віктарына, Грасыльда, Міхаліна, Максымільяна, Клара, Клементына, Леонтына, Ружа, Разына, Пракседа, Петранеля, Пелагея, Рэгіна, Схаластыка, Саламея, Фларыяна, Эўфімія, Эўфрузыя, Яганна.

Памяншальна-ласкальныя формы імён: Алёнка, Болесь, Зэнюсь, Касюня, Крысіо, Люцынка, Леонэк, Марыянак, Маруся, Ромусь, Рысіо, Разалька, Тэрэня, Тадзя, Уладачак, Уладзя, Хелюня, Юрась, Ядця, Янусь.

І пры канцы кнігі, трэба ўсе ж сказаць некалькі слоў пра кароткі, але важны і цяжкі перыяд перад пахаваннем нябожчыка. Час паміж смерцю і пахаваннем лічыўся пераходным перыядам, калі свет жывых і мёртвых пераплятаўся паміж сабой і мяжа паміж імі сціралася. Гэта адлюстроўвалася ў народных павер'ях, звязаных з прац-

эсам пахавання памерлых. Лічылася, што маладая маці, якая пакінула немаўлят, праз нейкі час пасля смерці вернецца, каб карміць сваё дзіця. Таксама лічылася, што душа, якая пакінула цела, наведвае жывых і нават можа ўдзельнічаць ва ўласным пахаванні. Таму ў доме памерлага завешвалі ўсе люстэркі (лічылася, што адлюстраванне асобы нябожчыка прадвесціць новую смерць у сям'і), дзверы не замыкалі на ключ або адчынялі акно, каб душа магла спакойна вылецець на вуліцу. Ваду, якой абмывалі цела памерлага, дазвалялася выліваць толькі ў строга вызначаных месцах, а ўсе прадметы, якія дакраналіся да цела памерлага, лічыліся нячыстымі. Каб душа не вярталася дадому, ля парога маглі пакласці сякеру ці траву, асвечаную ў храме. Цела памерлага абкурвалі раслінамі, асвечанымі падчас Калядаў ці клалі гэтыя расліны пад галаву нябожчыка. Вялікую колькасць падобных абрадаў з Лідчыны сабраў і ў свой час надрукаваў наш зямляк Вандалін Шукевіч.

# Пасляслоўе

Старыя лідскія могілкі былі закрыты ў 1963 г. Апошняе афіцыйна дазволенае гарадскімі ўладамі пахаванне было праведзена ў лістападзе 1960 г. Тады трагедыя здарылася у маладой сям'і Вайтукевічаў. Ян выправіўся зранку на працу, а цяжарная жонка засталася дома на хатняй гаспадарцы. Жылі маладыя па вуліцы Энгельса ў прыватным доме. Гэта быў іх апошні ранак разам. З працы Ян не вярнуўся, і сына свайго, які нарадзіўся праз некалькі месяцаў, на пачатку 1961 года, не ўбачыў. Яну было 25 гадоў. Жонка праз ўсё жыццё даглядала месца пахавання свайго першага кахання.

Маюцца два пахаванні немаўлят, зробленыя ў 1963 г. каля капліцы, але гэтыя пахаванні праведзеныя з парушэннем забароны гарадскіх улад на выкарыстанне могілак.

16.06.1983 г. прынята рашэнне пра ліквідацыю могілак. Адразу ў мясцовай газеце «Уперад» быў надрукаваны зварот да жыхароў горада аб пераносе парэшткаў родных на іншыя могілкі, што многія і зрабілі, у тым ліку тата аўтаркі гэтай кнігі перазахаваў парэшткі свайго бацькі.

У 1980-я гг. спецыяльна прывезеная група камсамольцаў з Наваградка знішчыла ўсе крыжы, зруйнавала магілы[238].

У адным з першых артыкулаў 1990-х гг. у «Чырвоным Штандары» пра могілкі пісалася: «Пералазім цераз ржавую агароджу могілак, паварочваем управа. Перад намі высокая стэла – помнік палеглым у Лідзе ... польскім лётчыкам. Помнік пазялянелы, з адбітымі краямі. Новы толькі надпіс: «Пашана іх памяці!».

---

[238] Савук Антось. Лідскі вайсковы аэрадром (1919 – 1939) // Лідскі летапісец. 2003. №2(22). С. 28–34.

На версе бачна частка крылаў каменнага арла. Калегі кажуць, што яшчэ некалькі гадоў таму ён быў цэлы. Спрабую наблізіцца, каб лепей пабачыць. Раптам на нешта натыкаюся.

- Гэта магілы. Агульныя магілы жаўнераў, – кажуць мне калегі. Паглядзіце вакол кустоў ... Я гляджу вакол. Бачу нізкія шэрыя помнічкі з крыжамі. Некаторыя з іх нават стаяць, на некаторых цалкам бачныя надпісы.

- Што з гэтым будзе далей? – пытаюся.

- Не вядома. Хаця, наогул, вядома: гарадскія ўлады хочуць з могілак зрабіць парк[239].

- Парк на магілах? ... З гэтым пытаннем іду потым да ўладаў.

- Што вас дзівіць, – маладая сімпатычная дзяўчына, Ларыса г., першы сакратар гарадскога камітэта камсамолу ў Лідзе высока ўздымае бровы.

- І Вільня, і Варшава так сама пабудаваны на людскіх касцях! – кажа як быццам з лёгкай інтэлектуальнай перавагай у голасе. – Мала маем месца, чаму мы павінны адмовіцца ад лішняга кавалка зямлі. Ва ўсякім выпадку, гістарычныя помнікі плануем перанесці на іншыя могілкі. Хто будзе вызначаць іх каштоўнасць? Я думаю, што пра гэта павінен клапаціцца нядаўна створаны клуб Аматараў польскай культуры. Проста трэба атрымаць адпаведныя каштоўныя паперы ...»[240].

Пад час візіту журналіста «Чырвонага Штандара» з Вільні Леакадзіі Камаішкі да галоўнага архітэктара працягваецца тое ж: «Прамоўца пачынае пераконваць нас, што пасля ўсяго таго што адбылося, могілкі ў такім стане не могуць застацца, таму што гэтыя руіны кажуць толькі пра тое, як мы не павінны захоўваць памяць аб загінуўшых.

---

[239] Па іншай версіі планавалася пабудаваць тут некалькі шматпавярховікаў.

[240] Kołyszko Aleksander. W walce o przetrwanie // Ziemia Lidzka. 2001. № 4(47).

Пра аднаўленне магілаў не можа быць і гаворкі. Яны занадта пашкоджаны, і грошай на гэта не хапае. Таму ён лічыць, што яго праект у дадзеным выпадку сапраўды выратавальны – капліца перарабляецца ў магазін, дзе можна купіць вянкі, кветкі і г. д., гістарычна каштоўныя магілы ўпарадкоўваюцца ...»[241].

У 1991–92 гг. Таварыствам сяброў Гродна і Вільні з Польшчы была праведзена інвентарызацыя гэтых могілак. Могілкі былі вельмі занядбаныя і закінутыя, «да гэтага прычыніліся планы мясцовых уладаў зрабіць тут гарадскі парк. Гэта прывяло да масавых перазахаванняў на іншыя могілкі і да шматлікіх актаў вандалізму».

Вынікі інвентарызацыі старых лідскіх могілак: «Згодна са станам на 1992 г. захавалася каля 80% мураванай агароджы выкананай у 1903 г. Самыя старыя з захаваўшыхся надмагілляў паходзяць з 20 і 30-х гадоў XIX ст. Апошнія пахаванні зроблены каля 1960 г. Сярод 2 700 надмагілляў, якія захаваліся, і месцаў пахавання да 1945 г.: надмагілляў з надпісамі каля 20%, без надпісаў каля 17%, земляных магіл 30%. Большасць надмагілляў носіць сляды вандалізму. На капліцы часткова захаваўся дах, але няма дзвярэй, што прывяло да таго, што яна выкарыстоўвалася як туалет. На вайсковай частцы могілак маецца каля 60 надмагілляў (разам з агульнымі магіламі). У сярэдняй частцы стаіць помнік лётчыкам.

У 1991 г. таксама праводзілі інвентарызацыю праваслаўных могілак. Найстарэйшае надмагілле – 1858 г., апошнія пахаванні 1977 г. Захавалася 417 надмагілляў (да 1920 г. – 142, 1921–1945 гг. – 145, пасля 1945 г. – 130). Могілкі таксама цярпелі ад вандалаў, але царква працавала ўвесь час, што іх стрымлівала»[242].

241 Там жа.
242 Śladecki Dariusz. Nie chciane zabytki // Ziemia Lidzka.1996. № 18–19.

Летам і восенню 2001 г. вернікі пад кіраўніцтвам пробашча лідскай фары кс. Юзафа Багдзевіча пастараліся навесці парадак на старых могілках. Рэканструкцыя помніка лётчыкам, а потым рэканструкцыя капліцы св. Барбары і яе асвячэнне – значны этап ў барацьбе за гэты кавалак зямлі і гістарычную памяць.

Для навядзення парадку на старых могілках лідзяне пачалі самаарганізоўвацца. Неабходна адзначыць, што велізарную ролю ў гэтым у свой час адыграла «Таварыства польскай культуры Лідчыны імя Адама Міцкевіча», якое шмат гадоў узначальваў выбітны грамадскі дзеяч Аляксандр Колышка. Выратаванне могілак пасля панавання тут вандалаў – у значнай ступені справа гэтага Таварыства.

У 2017 г. Таварыства сяброў Лідчыны ў Гданьску пад старшынствам прафесара Копец Ядвігі (у дзявоцтве Тумелевіч) распрацавала праект рэканструкцыі гістарычных могілак пры суфінансаванні Міністэрства культуры і нацыянальнай спадчыны, Гданьскага фонду пры падтрымцы мэра Гданьска Паўла Адамовіча і прыватных спонсараў. Была атрымана згода старшыні Лідскага райвыканкама на выкананне запланаваных работ.

Так з ініцыятывы нашчадкаў лідскіх сямей: Адамовіч, Намёт, Стасевіч, Тумелевіч, Хруль і інш., родавыя пахаванні якіх знаходзяцца якраз на гэтых могілках, у 2017–2020 гг. была праведзеная рэнавацыя, складзены дэтальны план могілак, якія маюць 4 га, інвентарызацыя дрэў і помнікаў, адноўлены старажытны мур па ўсяму перыметру, пастаўленыя дзве новыя ўваходныя каваныя брамы, па перыметру ўздоўж мура высаджаны клёны як памяць аб тым, як гэтыя ж дрэвы аздаблялі могілкі 100 год таму, наведзены парадак на тэрыторыі: засыпаны долы якія засталіся пасля перапахавання парэшткаў і працы чорных капальнікаў,

выкарчаваны хмызняк і старыя засохлыя дрэвы, расчышчаны сцежкі і на пустых месцах засеяна трава, за капліцай арганізаваны невялікі пляц, дзе можна ўсталяваць крыж або сімвалічны помнічак, калі месца пахавання родных дакладна невядома. На месцах безназоўных пахаванняў, азначаных толькі ўзгорачкам зямлі, усталяваны 1000 бетонных крыжоў.

Важны і цікавы вынік рэнавацыі – знаходка самага старога помніка 1834 г. (надпіс на помніку: с. п. Соф'я Барановіч, †15.01.1834, найлепшай маці, памяць ад дзяцей). Адноўлена больш за 1500 прозвішчаў, складзены алфавітны спіс пахаванняў па сектарах, зроблены здымкі больш за 1300 помнікаў з адноўленымі надпісамі. Тэрыторыя могілак падзелена на сектары і азначана нумарнымі бетоннымі слупкамі. Інфармацыя і здымкі па выніках рэнавацыі месцяцца на сайце «Павет».

Пры браме галоўнага ўваходу на могілкі, з правага боку на муры прымацаваная памятная дошка на беларускай і польскай мовах з наступным тэкстам:

«Гістарычныя могілкі ў Лідзе.

Могілкі ў Лідзе паўсталі на замкавай зямлі ў 1797 г. Першапачаткова гэта было адзінае агульнагарадское месца пахавання. У 1865 г. могілкі сталі лічыцца рыма-каталіцкімі. Драўляная капліца св. Барбары была пабудавана ў 1800 годзе, а ў 1930 годзе на яе месцы пачалося будаўніцтва каменнай капліцы. У 1900–1903 гадах могілкі былі абнесены мурам, які існуе і па сённяшні дзень.

Апошняе пахаванне на могілках адбылося ў 1960 годзе.

У 80-я гады XX ст. улады пастанавілі зліквідаваць могілкі. Супраціў грамадзянскай супольнасці прывёў да адмены ўладамі папярэдняга рашэння. Аднак надмагіллі ў значнай ступені засталіся пашкоджанымі, а капліца раз-

буралася. У 1988 годзе «Таварыства польскай культуры Лідчыны імя Адама Міцкевіча» у Лідзе (першай польская арганізацыя ў СССР) арганізавала грамадскія мерапрыемствы па ўпарадкаванні месца вайсковага пахавання. Ад гэтага часу вайсковае пахаванне сталася пад апекай палякаў на Лідчыне.

У 2000–2003 гадах стараннямі парафіі Узвышэння св. Крыжа адноўлена капліца.

У 1990–1992 гадах праведзена інвентарызацыя 2700 надмагілляў.

У 2017 годзе «Таварыства сяброў Лідчыны» з Гданьска распрацавала праект рэнавацыі гістарычных могілак пры фінансавай падтрымцы Міністэрства культуры і нацыянальнай спадчыны Рэспублікі Польшча і са згоды Мэра горада Ліды пачалася рэалізацыя запланаванай працы. У 2018–2020 гадах праведзены працы па рэнавацыі з фінансавай дапамогай Міністэрства культуры і нацыянальнай спадчыны Рэспублікі Польшча, Канцылярыі Сенату РП, Фонда Гданьска пры падтрымцы прэзідэнта Гданьска Паўла Адамовіча і прыватных спонсараў».

Другая дошка з такім жа тэкстам прымацаваная каля заходняй ўваходнай брамы (з боку ваенных пахаванняў).

Інфармацыйныя шыльды былі зняты.

Зараз могілкі знаходзяцца пад наглядам Лідскай ЖКГ.

Яны маюць моцны турыстычны патэнцыял, бо існуе вялікая цікаўнасць да іх з боку як турыстаў гэтак і лідзян. Трэба думаць пра далейшае ўладкаванне гэтага значнага для горада месца і наданне яму, нарэшце, статуса помніка пад ахоўвай дзяржавай.

Тое самае трэба зрабіць і для старых праваслаўных могілках.

Шчырыя словы падзякі за адданую працу на працягу чатырох гадоў па рэнавацыі старых гарадскіх могілак трэба сказаць прафесару Ядвізе Копець, прафесару Збігневу Намёту, Вользе Бурч, Людміле Цыбрук, старшыні Лідскай раённай грамадскай арганізацыі «Беларускі звяз ваенных маракоў» Уладзіміру Каспяровічу, членам звязу маракоў Юрыю Сосіку і Аляксею Якімчыку, іншым валанцёрам, а таксама ўсім сапраўдным людзям, якія ўвесь час выказвалі самую гарачую падтрымку, зацікаўленасць і спагаду, падтрымлівалі словам і справай.

Наша стаўленне да могілак – лепшая мера нашай культурнасці і самапавагі.

Аўтары маюць надзею, што кніга будзе працаваць на захаванне нашай гістарычнай памяці і спрыяць аднаўленню здабыткаў нашай гісторыі.

# Спісы пахаваных на могілках горада Ліда

Каб паменшыць колкасць памылак, спісы друкуюцца на тых мовах, на якіх яны былі напісаны.

## Спіс пахаваных на гарадскіх могілках каля царквы св. Георгія.

Па інфармацыі царквы

У свой час пасля актаў вандалізму ўдалося перапісаць шмат імён з помнікаў якіх сёння ўжо няма. За апошнія гады склаўся новы спіс пахаваных тут лідзян, сваякі якіх прыходзілі ў царкву і запісвалі сваіх памерлых для памінальнай службы. Зараз гэтыя прозвішча напісаны на памінальнай пліце каля храма.

У спісах, відавочна, шмат памылак, але выпраўленняў не рабілася, каб не нарабіць памылак яшчэ больш, з той жа прычыны не рабіўся і пераклад.

1. протоиерей Иосиф Осипович Коялович (04.05.1835 – апрель 1919) и жена его Елисавета;
2. Адриан (21.02.1866–29.03.1882), полковой священник 172 пехотного Лидского полка;
3. Александр Петрович Казанский (†09.05.1908), священник Лидского полка;
4. Николай Николаевич Красницкий (†11.11.1909);
5. протоиерей Валериан Гречихо (†18.12.1912, жил 73 года);
6. иерей Михаил Гомолицкий (†10.09.1904), Ольга (†29.03.1899) и Людмила (†1909);
7. иерей Антоний Омельянович, похоронен за алтарем Георгиевской церкви (†06.11.1904, жил 73 года) и его дочка Мария Антоновна (1872–1893);
8. Александров Николай Георгиевич (19.12.1910–03.09.1947);

9. Алуневич Гавриил Лукич (1896–1957);
10. Арефьев (1918–1954);
11. Бабоненкова Анастасия (1866–1958);
12. Батурин Дмитрий (1912–1951);
13. Богданов Александр Гаврилович (†1911);
14. Богуславчик Валерий (1953–1954);
15. Бордовская Александра Афанасьевна (1874–1955);
16. Боровик Оля (†1940);
17. Бруква Ольга (1914–1959);
18. Бухтанчук В.П.;
19. Бурбыча Степан Матвеевич (1915–1960);
20. Буча Симеон Дмитриевич (1902–1924);
21. Бычок Борис (†1925);
22. Бычок Дмитрий (†1925);
23. Бычок Мария (†1925);
24. Василевичи (†1950-е гг.);
25. Винокурова Манечка (20.01.1886–14.12.1887);
26. Власенко Линька (20.04.1885–12.04.1887);
27. Войнеховский Николай Иосифович (†01.03.1914 на 30 году жизни);
28. Войтович Виктор (1887–1956);
29. Волчок Валентин (19.12.1927–13.06.1943), погиб за Родину;
30. Воробьёва (†1928);
31. Воробьёва Стефанида (†1942);
32. Ганевич Александра Николаевна (†1955, жила 75 лет);
33. Ганевич Иван Мартинович (1913–1942);
34. Ганевич Илья (жил 90 лет);
35. Ганевич Мартин Мартинович (1873–1955);
36. Ганевич Фёкла (жила 78 лет);
37. Гарицкая Людмила (†на 81 году жизни);
38. Гармазамс (1905–1938);
39. Герасименко Михаил Александрович (1914–1957);
40. Германюк Александра Петровна (†1933 на 61 году жизни);
41. Германюк Никита Николаевич (†1924 на 61 году жизни);
42. Гильвей Анна (1878–1955);
43. Глинина Лидия Николаевна (1957–1958);
44. Глинская Мария Васильевна (1903–1959);

45. Големполь Владимир (†1953);
46. Големполь Людмила (1945–1948);
47. Големполь София (1946–1948);
48. Голобурдо Николай Романович (1901–1952);
49. Голодковский Евгений (1879–1953);
50. Голуб Вера Николаевна (11.09.1871–04.10.1944);
51. Голуб Никодим Никанорович, полковник российской армии (03.06.1869–20.06.1938);
52. Голуба Александра Николаевна (†1912);
53. Гросс Анна (жила 9 лет);
54. Гросс Константин (†1943);
55. Гросс Любовь (†1950);
56. Гришель Сергей (†1948, жил 48 лет);
57. Губаревич Дария (1890–1938);
58. Губейко Макарий Григорьевич (1901–1942);
59. Гурбанович Татьяна Т. (†1946);
60. Давидюк Анна Григорьевна (†12.05.1958);
61. Дежурко Евгения (1895–1951);
1271. Wojtowicz Wiktor ur. 19.03.1960, zm. 26.07.1960 (sektor 2);
1272. Wojtukiewicz Jan (Войтукевич Ян) 1935–1960 (sektor 6);
1273. Wojtukiewicz Jan (sektor 2);
1274. Wolska Joanna z Szeciłłów zm. 12.01.1847, żyła l. 27 (sektor 2);
1275. Wołk Jan zm. 28.04.1960, żył l. 55 (sektor 2);
1276. Wołk Kazimierz zm. 18.10.1957, żył l. 86 (sektor 19);
1277. Wołk Michał zm. 12.09.1942, żył l. 30 (sektor 19);
1278. Wołk-Karaczewska Helena żyła 6 mies. (sektor 1);
1279. Wołk-Karaczewska Helena zm. 09.05.1959, żyła l. 46 (sektor 8);
1280. Wołk-Karaczewski Bronisław zm. 1954 (sektor 1);
1281. Wołkow Michał zm. 20.12.1888, żył l. 65, Marya z Kułtoszów zm. 24.12.1866, żyła l. 37, syn Kazimierz zm. 25.05.1875, żył l. 22, Barbara z Jórewiczów zm. 30.08.1899, żyła l. 34 i córka Zofiia żyła 1 rok 5 mies., Wiktoria z Mizydrów zm. 11.08.1870, żyła l. 25 (sektor 2);
1282. Wołkowie Kazimierz i Franciszka, pamiątka z 1.05.1876 (sektor 2);
1283. Wołoczkiewicz Henryk ur. 15.04.1954, zm. 24.11.1954 (sektor 2);
1284. Wołubicki Józef zm. 26.06.1941 (sektor 17);
1285. Woron Stanisław ur. 1888, zm. 15.02.1946 (sektor 10);
1286. Worona Błażej syn Romana (sektor 1);
1287. Worona Stanisław zm. 02.03.1928, żył l. 53, Tunkiewicz Walżen żył l. 80, Tunkiewicz Katarzyna żyła l. 68 (sektor 12);
1288. Woronicz Czesław zm. 20.08.1934, żył l. 61 (sektor 19);

1289. Woronicz Edward zm. 30.02.1943, żył l. 21 (sektor 16);
1290. Worono Wawrzyniec, Ewa i cała rodzina, 1880 (sektor 9);
1291. Worono .... zm. 05.07.1944, żyła l. 75 (sektor 1);
1292. Worono Aleksander zm. 23.05.1946, żył l. 49 (sektor 1);
1293. Worono Helena 1891–1971, Jan 1882–1960 (sektor 1);
1294. Worono Kazimierz zm. 01.01.1937, żył l. 73 (sektor 1);
1295. Worono Roman zm. 19.10.1955, żył l. 25 (sektor 1);
1296. Worono Stefanija (sektor 12);
1297. Woszeszciek Józef i Elżbieta zm. 28.01.1909, ż. l. 80 (sektor 2);
1298. Zabiełło Józefa (sektor 2);
1299. Zachwatowicz Lukasz zm. 16.08.1891, żył l. 80, Urszula zm. 12.12.1891, żyła l. 73, Katarzyna zm. 03.10.1886, żyła l. 28 (sektor 1);
1300. Zajelski Wincenty zm. 22.09.1904 i żona Teofila zm. 14.12.1905 (sektor 18);
1301. Zaleska Adolfina z Kozakowskich zm. 1878, żyła l. 27 (sektor 1);
1302. Zaleska Bronisława z Gornostajów zm. 13.05.1937, żyła l. 26 (sektor 3);
1303. Zaleska Terenia ur. 06.09.1940, zm. 27.11.1940 (sektor 4);
1304. Zaleska Weronika z Kułakowskich zm. 09.01.1921, żyła l. 27 (sektor 19);
1305. Zaleski Jan zm. 11.02.1932, żył l. 70 (sektor 10);
1306. Zaleskie Teresa i Helena (sektor 4);
1307. Zapaśnik Antoni zm. 25.04.1912, żył l. 70 (sektor 14);
1308. Zapaśnik Eufemija zm. 09.09.1903, żyła l. 47, córka jej Alońka żyła l. 17 (sektor 2);
1309. Zapaśnik Helena zm. 19.03.1944, żyła l. 56 (sektor 12);
1310. Zapaśnik Jadwiga zm. 20.10.1920, żyła l. 38 (sektor 16);
1311. Zapaśnik Józef zm. 22.02.1929, żył l. 52 (sektor 14);
1312. Zapaśnik Karol zm. 18.11.1933, żył l. 57 (sektor 16);
1313. Zapaśnik Karol zm. 24.12.1898, żył l. 68 (sektor 4);
1314. Zapaśnik Onufry (sektor 13);
1315. Zapaśnik Paulina zm. 1943, żyła l. 81 (sektor 12);
1316. Zarecki Mikołaj zm. 21.03.1937, żył l. 47 (sektor 10);
1317. Zarzeccy Wojciech, Maria i Róża (sektor 9);
1318. Zarzecki Józef syn Wojciecha ur. 19.12.1800, zm. 29.01.1869 i żona Hanna g(eboren); v(on) Hravenitz ur. 01.07.1807, zm. 01.10.1891 (sektor 9);

1319. Zarzecki Mikołaj-Józef (syn Józefa) ur. 11.09.1843, zm.1883, żona Maria Zarzecka ur. 01.03.1854, zm. 02.09.1935 i ich córka Anna 1899 żyła l. 19 (sektor 9);
1320. Zaworonkiewicz Regina zm. 17.10.1960, żyła l. 53 (sektor 14);
1321. Zdanowicz Helena zm. 14.09.1919, żyła l. 3 (sektor 8);
1322. Zdanowicz Edward zm. 06.03.1929, żył l. 6 (sektor 8);
1323. Zdanowicz Józef zm. 06.02.1954, żył l. 59 (sektor 6);
1324. Zdanowicz Maria ur. 1886, zm. 1850, żyła l. 63 (sektor 8);
1325. Zedlerowa Joanna z Lipińskich zm. 18.11.1871, żyła l. 62 (sektor 9);
1326. Zelizowska Janina zm. 02.01.1945, żyła l. 4 (sektor 8);
1327. Zelizowskie Jan zm. 17.11.1938, Róża zm. 16.01.19... żyła 17 miesięcy (sektor 8);
1328. Zenowicz Teofil zm. 1865, żył l. 60, Anna z Oskierków zm. 1862, żyła l. 53, Adela z Zenowiczów Szabłowska zm. 1895, żyła l. 52, Szabłowski Zygmunt zm. 1881, żył l. 50 (sektor 8);
1329. Zerkówna Jadwiga ... (sektor 7);
1330. Zienkiewiczówna Jadwiga ur. 26.03.1923, zm. 07.11.1938 (sektor 17);
1331. Zieńczyk Bronisław ur. 20.02.1889, zm. 14.01.1890 (sektor 2);
1332. Ziółkowska L. zm. 25.04.1926 (sektor 2);
1333. Zmitrowicz Helena zm. 26.03.1944, żyła l. 63 (sektor 1);
1334. Zmitrowicz Józef ur. 18.10.1832, zm. 15.02.1916, Konstancja z Bohdanowiczów ur. 28.10.1839, zm. 08.12.1924 (sektor 3);
1335. Zmitrowicz Maciej zm. 1875, żył l. 80, Barbara zm. 1887, żyła l. 75 (sektor 2);
1336. Zmitrowicz Piotr zm. 18.05.1906, żył l. 78 i dzieci Kazimiera, Katarzyna, Marcianna (sektor 13);
1337. Zmitrowicz Stanisław zm. 1920, żył l. 28 (sektor 10);
1338. Zmitrowiczowa Anna z Kolendów zm. 04.12.1908, żyła l. 41 (sektor 1);
1339. Zubricki Piotr zm. 01.07.1911, żył l. 63, Teofila zm. 24.02.1914, żyła l. 76 (sektor 15);
1340. Zubricki Piotr zm. 19.04.1943, żył l. 25 (sektor 15);
1341. Zylenas Genowefa zm. 08.10.1911 (sektor 1);
1342. Żabo Piotr i córka Pamella Narbutowa zm. 18.03.1872 w wieku 47 lat (sektor 2);
1343. Żebrowski Jan Pantaleon zm. 17.10.1960, żył l. 83 (sektor 4);

1344. Żelozowska Joanna zm. 11.10.1922 (sektor 16);
1345. Żerko Kazimierz zm. 03.09.1940, żył l. 75 (sektor 12);
1346. Żerko Michalina zm. 26.08.1956, zyla l. 85 (sektor 12);
1347. Żochowska Teofila zm. 06.08.1897 (sektor 10);
1348. Żochowski Stanisław zm. 24.01.1892 (sektor 7);
1349. Żołędź Anna i Anna Katarzyna i Wincenty zm. 13.05.1910, żył l. 75 (sektor 2);
1350. Żołnierczyk Emilia zm. 14.03.1953, żyła l. 72 (sektor 8);
1351. Żorowa Halina zm. 14.08.1922, żyła l. 38 (sektor 10);
1352. Żorówna Anna zm. 18.10.1930 (sektor 10);
1353. Żuk Adam zm. 14.06.1915, żył l. 40 (sektor 8);
1354. Żuk Bonifacy zm. 1960, żył l. 90, Maria zm. 1943, żyła l. 74 (sektor 14);
1355. Żuk Józef zm. 07.05.1915, żył l. 40 (sektor 8);
1356. Żukowska Antonina zm. 09.09.1951, żyła l. 62 (sektor 13);
1357. Żukowska Józefa zm. 1936, żyła l. 22 (sektor 19);
1358. Żukowska Karolina zm. 19.10.1895, żyła l. 68 (sektor 2);
1359. Żukowska Marja zm. 1959 (sektor 14);
1360. Żukowski Ignacy zm. 02.06.1920, żył l. 50 (sektor 19);
1361. Żukowski Jan zm. 19.09.1937, żył l. 18 (sektor 13);
1362. Żukowski Onufry zm. 18.04.1897, żył l. 57 (sektor 19);
1363. Żukowskiego Macieja zm. 1883 i zwłoki familij Szostaków (sektor 10);
1364. Żurawska Janina zm. 1939, żyła l. 17 (sektor 13);
1365. Żurawska Maria (Żorowska) zm. 1930, żyła l. 17 (sektor 10);
1366. Żurawska Melania zm. 1939, żyła l. 47 (sektor 13);
1367. Żurawski Roman zm. 23.01.1956, żył l. 66 (sektor 3);
1368. Żybko Helena zm. 13.08.1919, żyła l. 36 (sektor 2);
1369. Żybko Jadwiga zm. 15.02.1933, żyła l. 24 (sektor 2);
1370. Żybko Paweł żył l. 40 (sektor 2);
1371. Żyburtowicz Maria zm. 04.04.1937, żyła l. 78 (sektor 9);
1372. Żyliński Stanisław zm. 18.06.1950, żył l. 20 (sektor 10);
1373. Żyliński Zygmund zm. 15.10.1947, żył 1 rok (sektor 10).

# Дадаткі

***Камендатура дзяржаўнай паліцыі Лідскага павета, 20.7.1926***[1]

*Пану старасту Лідскага павета*

**Справаздача**

12 ліпеня 1926 г. у 15-30 палкоўнік Адам Залеўскі, намеснік камандзіра палка, узляцеў з аэрадрома 11 палка ў Лідзе. Узлёт адбыўся нармальна і палкоўнік Залеўскі накіраваўся на ўсход. Каля гадзіны лётаў над Кір'янаўцамі, вёскай і маёнткам п. Ляскоўскага ў 15 км. ад Ліды, потым скіраваў самалёт у бок Ліды. Праз некалькі мінут зноў вярнуўся да Кір'янаўцаў і там, каля 17-00 самалёт разам з палкоўнікам Залеўскім упаў на зямлю за некалькі дзесяткаў метраў ад маёнтка.

Пасля катастрофы палкоўнік Залеўскі жыў яшчэ некалькі дзесяткаў мінут (больш за палову гадзіны), але з-за унутраных і знешніх пашкоджанняў памёр.

Вайсковая камісія ў складзе капітана Стахоня, паручніка Арлінскага і паручніка Мілеўскага ўстанавіла, што тэхніка была спраўная, а прычына катастрофы ў памылках арыентацыі на апараце «Спад», для палётаў на якім палкоўнік Залеўскі не меў адпаведнага вопыту. Таксама магчыма, што палкоўнік з-за невядомай прычыны страціў прытомнасць. Прычына катастрофы не была ўстаноўлена дакладна і грунтуецца толькі на дапушчэннях. Вышыня, з якой упаў самалёт плк. Залеўскага, была каля 150 м.

Цела прэпаравана ў вайсковым шпіталі лекарам маёрам Бучынскім. Стала вядома: косткі чэрапа не паламаныя, мозг не мае значных пашкоджанняў. У грудной клетцы зламаны 5 рэбраў з левага і 6 з правага боку. Рэ-

[1] ДАГВ. Ф. 200. Воп. 1. Спр. 9. Арк. 408.

бры часткова ўбіты ў лёгкія. Сэрца не пашкоджана. У лёгкіх каля 1 л. крыві. Органы брушной поласці не пашкоджаны, але тут было каля 1,5 л. крыві. Левая і правая рука зламаныя. Правая нага зламаная ў 2-х месцах, а менавіта ў калені і галёнцы. Усё цела пашкоджана ўдарам, мае большыя ці меншыя раны.

*Палкоўнік Залеўскі быў жанаты і бяздзетны. Родных, акрамя жонкі, не меў.*

*Пахаваны палкоўнік 15 ліпеня на мясцовых могілках пры ўдзеле грамадства, вайскоўцаў і прыбыўшых дэлегацый.*

*Павятовы камендант*

*подпіс.*

Алесь Цвік (Алег Кавалёў)

**Легенда пра рыцара**

*(Пераклад Леаніда Лаўрэша)*

Колькі ж мне было тады? Дакладна ўжо не памятаю, але гэта ўрэзалася ў памяць на ўсё жыццё і, напэўна, нейк паўплывала на мяне. Было мне, здаецца, гадоў пяць, не болей. Можа быць, пяць з паловай. Жылі мы на вуліцы [...] у горадзе Ліда, у доме, які належаў дзіцячаму прытулку, дзе выхавацелем і адначасова настаўніцай працавала мая маці. Час быў суровы. Гэты край, размешчаны амаль побач з заходняй мяжой вялізнай краіны, якая толькі што выйграла цяжкую крывавую бітву з фашыстамі, быў запоўнены не толькі слядамі баёў і разрухі, але і трывожнымі чуткамі, якія з'яўляліся ніадкуль – то пра таямнічых імперыялістычных шпіёнаў, то пра дыверсантаў, якія шнырылі па начах цэлымі групамі, то аб інтрыгах шматлікіх ворагаў... Пра гэта часта ціхімі галасамі казалі дарослыя, і мае бацькі таксама. І я, толкам не разумеючы пра што гаворка, перапаўняўся смутнай трывогай. Часам і мае вулічныя аднагодкі, не кажучы пра старэйшых, падлівалі агню ў гэ-

тыя балячкі і дадавалі свае дэталі і пострахі. Маўляў, яны чулі ад дарослых, што на ўскраіне нашага горада ў раёне старажытных могілак жыхары найбліжэйшай вуліцы бачылі ноччу бледнае свячэнне сярод магіл і нейкія цені, якія выходзілі ці то з зямлі, ці то са старажытных склепаў. Цені гэтыя потым недзе блукалі сярод дамоў, а на досвітку зноў прыходзілі на свае месцы, пераўтвараліся ў тонкія бруі сіняватага колеру і знікалі сярод надмагілляў і крыжоў. Я, калі чуў такое, бляднеў і трэсся ад жаху. Мне, ды і іншым аднагодкам уяўлялася, што было б, калі б мы сутыкнуліся ў святле самотнага вячэрняга ліхтара з падобнымі зданямі?! Кашмар! Напэўна, яны з'елі б нас ці зрабілі б яшчэ нешта горшае!

Нехта з нашых, па-мойму яго звалі Фелікс, раптам сказаў, што яго дзядуля – мясцовы жыхар распавядаў, што духі гэтыя могуць знікнуць, калі ўгаварыць жалезнага рыцара, які ляжыць над адной з магіл [...], не выпускаць іх на волю. Маўляў, рыцар гэты некалі быў начальнікам атраду паўстанцаў, знішчанага царскімі войскамі ў адной з бітваў, а гэтыя цені ёсць яго былыя ваяры. Сёння, як і раней, ён быў іх камандзірам. Але як быццам па нейкіх законах каталіцкага касцёла, калі апоўначы ці апоўдні пакласці да яго падножжа кветкі і папрасіць прабачэння за той прайграны бой, дык ён добразычліва прыме падарунак і дасць каманду перастаць палохаць людзей. Але зрабіць гэта павінна чыстае і па ўзросце нявіннае дзіця, бо хлусаў-дарослых, тым больш савецкіх, ён слухаць не будзе!

Вось гэта гісторыя! Мяне заінтрыгавала легенда і я прыняў усё за чыстую манету, бо верыў у розныя цуды і былі. А раптам я праслаўлюся навекі? Мяне будзе ведаць кожны! Я выратую горад і людзей ад гэтых страшных зданяў і ўсім стане жыць лягчэй і весялей! Гэтая думка закралася ў галаву і не хацела яе пакідаць. Засынаючы,

я будаваў розныя планы: дзе ўзяць кветкі, куды ісці і з кім, прыдумляў нават змест майго будучага звароту да жалезнай фігуры. Пра яе нам расказвалі і дарослыя і падлеткі. Там недзе ў глыбіні могілак сапраўды быў помнік ці надмагілле з падобнай фігурай. Гэта выклікала цікавасць, але выклікала страх і трывогу. Ды і дарослыя баяліся залазіць у гэтыя цёмныя непрыемныя зараслі. Я па наіўнасці неяк расказаў гэта маці, але пачуў рэзкае: «Не займайся глупствам, лепш добра вымый бульбу ў чыгунку. Увечары будзем есці яе з селядцом. Таце ўдалося купіць сёння на кірмашы. Будзе смачна».

Пяцігадовы, я ўжо ведаў, што нават сваім бацькам нельга расказаць абсалютна ўсё. Пра гэта неаднаразова казалі старэйшыя хлапчукі на нашай вуліцы. Напрыклад, той жа Фелікс паведаміў, што калі ты знайшоў недзе недакурак і хочаш паспрабаваць пакурыць, то пра гэта не павінны ведаць бацькі, бо балюча пакараюць. Казалі нешта аб грошах у бацькоўскіх кішэнях... Ну, яму было ўжо гадоў 10, а мне ўсяго палова ад яго! Менавіта таму аўтарытэт Фелікса быў нашмат вышэй нашага, і мы прыслухоўваліся да яго парадаў. Так і атрымалася. Я заразіўся ідэяй вызвалення чалавецтва ад зданяў мінулага. Я быў дапытлівым і ініцыятыўным і вырашыў ажыццявіць свой першы ў жыцці значны подзвіг!

Наступіў дзень, калі я з маім блізкім сябрам Міколам рушыў да могілак. Быў яркі поўдзень восеньскага дня, і праз хвіліны дзве мы ўжо стаялі каля аблупленых каменных варот старадаўняга месца спачыну ў раёне ваеннага гарадка. Адна палова каваных жалезных варот была раскрытая і ніколі не зачынялася. Можа час, а можа дарослыя людзі яе моцна перакасілі, і палова гэтая проста ўрасла ў зямлю. Адразу за варотамі пачыналася алея, напаўзарослая крапівой, чартапалохам, рознымі калючкамі. Я

трымаў букет рамонкаў, зрэзаны ўпотай з нашай клумбы, а Мікола, з вылупленымі ад страху вачыма, мармытаў падобнае на «можа далей ты сам, а я тут пачакаю?».

- Э, не, мы дамовіліся разам. Нядобра пакідаць таварыша ў небяспецы, – звярнуўся я да яго сумлення, – Яшчэ знайсці яго трэба і ты потым нікому не балбачы, а то невядома, што з намі будзе!

- Не бойся, нікому я і не скажу, толькі вось неяк мне...

- Наперад, – скамандаваў я, і мы пайшлі па цэнтральнай алеі.

Далей яна стала ўжо амаль непраходнай. Крапіва і расліны з цэпкімі, вострымі шыпамі не дазвалялі ісці прама, прыходзілася абгінаць перашкоды, паглыбляючыся ў страшныя зараснікі. Праз метраў трыццаць дарожка раздвоілася, і мы не ведалі па якой рухацца далей. На могілках нікога не было, ды і не магло быць. Яны было закінуты і там даўно нікога не хавалі – не тое, што за горадам – з маршамі і барабанамі. Але куды ісці? Як у казцы: налева або направа? Стала не па сабе, але мы перамаглі трывогу і вырашылі пайсці направа ў бок нейкага цёмнага ўзвышэння ў глыбіні кустоў. Яшчэ пару асцярожных крокаў, яшчэ...

Чамусьці стала цямнець. Ці то промні сонца не маглі прабіць густыя кроны старых, замшэлых дрэў, ці то на самой справе мы былі ўжо недалёка ад рыцара, і той заглушыў паўднёвае святло. Наш шлях перагарадзілі дзве зрослыя арэшыны. Мы сяк-так прадзерліся скрозь іх і... . У двух метрах ад нас сцяжынку перагароджвала вялізнае надмагілле даўжынёй метры ў тры. Яго верхні край быў на ўзроўні галавы. З аднаго боку над ім навісала рабіна, абсыпаная крывавымі ягадамі. Пад яе разгалістымі лапамі на цёмна-чырвоным граніце напаўляжаў на правым баку тварам да нас той знакаміты жалезны рыцар! Ён увесь быў апрануты ў медныя, пазелянелыя ад часу даспехі,

галава яго была схаваная пад шлемам з закратаваным забралам. Правай рукой ён падпіраў галаву, а левай як бы прытрымліваў доўгі меч, які ляжаў каля яго ўздоўж усяго цела. Ногі былі абуты ў вастраносыя боты. Нас ахапіў жах! Падалося, што мы чуем дзіўнае рыпанне, якое нагадвае гук нязмазаных дзвярэй... Галава ў шлеме павярнулася да нас ... Раптам за маёй спіной раздаўся трэск галля. Гэта з дзікімі крыкамі і завываннямі мой сябар пакінуў мяне на з'ядзенне бронзаваму рыцару...

- Прабач, што мы парушылі твой спакой, – пачаў я завучанае. У адказ цішыня. Але я быццам бы заўважыў нейкі рух, у шчылінах забрала нешта бліснула! Падобна на вочы?! Вось гэта да! Прыйшлося сабраць разам усё сваё самавалоданне, я ж трэніраваўся дома!

- Мы, ... я, прыйшоў папрасіць цябе...

Шлем трошкі павярнуўся ў мой бок. Нешта прахрыпела ўнутры... Я ўжо быў на грані разумовага вар'яцтва, але дагаварыў:

- Просім цябе – усе хлапчукі і дзяўчынкі нашай вуліцы – не выпускай сваіх зданяў да нас. Мы іх вельмі баімся і не ведаем усёй праўды пра тваю гісторыю. Нам страшна, асабліва па вечарах, і мы баімся гуляць паблізу могілак, а тут добры пясочак, і мы скачам у яго...

І раптам:

- Не бойся малы. Я дам загад, і яны не будуць выходзіць. Іх расстралялі, але іх душы да гэтага часу просяць мяне выпускаць іх хоць на нядоўгі час. Яны шукаюць свае сем'і, але не знаходзяць. Не ведаюць, што і сем'і таксама расстраляныя. Расстраляныя толькі за тое, што яны тутэйшыя. Ты сёння гэтага не зразумееш, але ўспомні мае словы, калі станеш мудрым і дарослым. Агалі сваё сэрца, адкрый сваё сумленне, шукай праўду і дай спакой іхнім душам! Пішы аб тым, што ўтоена праз хлусню і здраду! Заўсёды

кажы праўду! Цябе за гэта не будуць любіць людзі, але будзе любіць Бог!

Шлем з забралам зарыпеў і вярнуўся ў першапачатковае становішча.

Рука, якая ляжала на мячы, прыўзнялася і зрабіла мне знак: «бывай, сыходзь».

Раптам да мяне дайшло: ужо вечар і мяне будуць шукаць. Я інстынктыўна пакланіўся рыцару, паклаў каля мяча кветкі і павольна, спіной назад, трошкі адступіў. Як я знайшоў выйсце, як вярнуўся дадому, што казаў у сваё апраўданне не памятаю, але ніхто не крануў мяне і нават не стаў лаяць.

Мне вельмі дзіўнымі і загадкавымі падаліся апошнія словы жалезнага рыцара. Я амаль нічога не зразумеў, бо гэта было занадта складана для мяне, але засела: пра праўду, не хлусіць і пра Бога!

Міколка пазбягаў мяне пару дзён. Але потым разоў з дзесяць папрасіў прабачэння і пацікавіўся: ці зрабіў я тое, што задумваў? Я адказаў што зрабіў: паклаў кветкі і пабег дадому. Я не стаў яму распавядаць аб гутарцы з жалезным рыцарам, не стаў успамінаць яго словы і настаўленне... Не кожны іх варты, не кожнаму было дадзена несці іх у душы амаль усё жыццё.

Я выканаў сваё абяцанне. Я памятаю пра іх, я пішу аб іх і аб ім, аб тых, хто без правіны пайшоў з жыцця ў той жорсткі час. Я памятаў і памятаю ўсё да гэтага часу. І вось аднойчы праз шмат гадоў, дакладней, праз 65 гадоў, я вырашыў туды з’ездзіць.

На жаль, ад вялікіх [...] могілак не засталося і следу. З правага боку высіўся корпус стандартнай двухпавярховай школы, а на месцы надмагілляў і пастамента з рыцарам быў напаўзарослы школьны стадыён без трыбун з пада-

бенствам бегавой дарожкі... Зніклі і каваныя вароты з напаўадчыненай паловай.

Зайшоў да людзей насупраць. Бабулька гадоў за дзевяноста, хрыпла растлумачыла, што ў сярэдзіне 60-ых могілкі знеслі бульдозерам, а надмагіллі выкарыстоўвалі ў будаўніцтве падмурка для савецкай школы.

- А бронзавы рыцар? – вырвалася ў мяне.

- А-а-а, рыцар! Быў такі, быў. [...] Важны быў.

Я вярнуўся да таго месца дзе была брама. Пастаяў. Змяркалася. На імгненне на фоне таполяў узнік ці то цень, ці то нейкі шызы дымок... І нібыта голас ўва мне: «Вось ты і вярнуўся... А нас даўно няма! Памятай, не забывай бронзавага рыцара!»

Міхал Шымялевіч

# *З таго свету*[2]

*(Пераклад Леаніда Лаўрэша)*

Хто ў Лідзе не знаў старога Казіміра Вісманта?

50 гадоў таму быў гэты чалавек яшчэ ў роскvіце сіл, трохі сіваваты, трохі лысаваты, але шыракаплечы, румяны і да жанчын цікаўны. Яго белая хатка пад саламяным дахам, атуленая галінастай ліпай, стаяла на Вісмантах[3] пад Лідай і пры абсаджаным бярозамі навагрудскім гасцінцы была добра бачная ад самых парафіяльных могілак. За хаткай стаяла малая абора, а трохі далей – добра пабудаванае гумно. Хатку атачала прызба[4] з каменю, на якой было так прыемна пасядзець вечарам і, папіваючы смачны квас з бярозавага соку[5] альбо яшчэ цёплае малако, паразмаўляць пра былое.

У старога ў хатцы пад столлю стаяла скрынка, поўная старых пажоўклых папер пісаных і па-славянску (па-стара-

---

[2] Шымялевіч Міхал. Збор твораў. С. 222–226.

[3] Вісманты – тэрыторыя на поўдзень ад каталіцкіх могілак, якая прымыкае да сучаснага праспекта Пераможцаў. У 1507 г. паляўнічы Захарыяш Кузьміч атрымаў ад караля Жыгімонта 6 валок (128 гектараў) зямлі на паўднёвай ускраіне горада. Гэтая мясцовасць па меншай меры да 1717 г. так і называлася – Кузьмішкі. У 1668 г. Кузьмішкі перайшлі ва ўласнасць Аляксандра Вісманта. Пазней Кузьмішкі былі падзеленыя паміж шматлікімі сваякамі і пачалі называцца Вісманты. У 1797 г. у Вісмантах былі закладзеныя могілкі, якія ў наступныя паўтара стагоддзя служылі месцам супакаення парафіян. Род Вісмантаў займаў высокія пазіцыі ў лідскай эліце. Лявон Пётр Вісмант у 1906–1914 гг. быў бурмістрам горада – Л. Л.

[4] Прызба – збудаванне-насып уздоўж вонкавых сцен па перыметры драўлянага дома, служыла для засцерагання пабудовы ад прамярзання зімой. Можа быць проста земляны насып уздоўж сцен. У больш прасунутым варыянце ўладкоўваўся з каменю, дошак (якія для прыгажосці часам нават бялілі вапнай) або жэрдак, устаноўленых на адлегласці 30–50 см ад сцен хаты; паміж дошкамі і хатай засыпалі пілавінне, салому, кастрыцу, шлак, торф, зямлю (дзёран). Вышыня прызбы – да другога рада бярвення – Л. Л.

[5] Выраб смачнага квасу з бярозавага соку Шымялевіч апісвае ў артыкуле “Бярозавы сок” – Л. Л.

беларуску – Л. Л.), і па-польску. Паперы памяталі яшчэ часы караля Аляксандра Ягелончыка, калі пазнейшая ваколіца Вісманты называлася «імём Кузмянамі альбо Кузмішкамі… пад самай Лідай за замкам гаспадарчым ляжачай» і стала ўласнасцю гаспадарчага баярына Лук'яна Гайкі, ці Гаеўскага. Потым у 1668 г. тут асеў землеўладальнік са Жмудзі пан Аляксандр Вайцехавіч Вісмант, ад якога і пайшоў род Вісмантаў лідскіх. Пра гэта сведчыў прыхаваны ў скрынцы вывадны дэкрэт Дэпутацыі Літоўска-Віленскай ад 12 студзеня 1799 г. з ладна намаляваным гербам Сас: «Жоўты маладзік на тарчы двума рагамі павернуты ўгору, на кожным яго рагу па залатой шасцікутнай зорцы, а з сярэдзіны яго ляціць уверх страла, у блакітным полі, на шлеме над каронай пёры паўліна прабітыя стралой управа». Стары Вісмант ведаў на памяць свой вялікі шматаркушовы радавод з ўсімі датамі і памятаў шмат цікавых гісторый. Яго бацька калісьці хацеў выгадаваць з сына паважанага чалавека і нават запісаў яго ў дваранскую школу ў Лідзе, але пану Казіміру неяк не пашанцавала і застаўся ён паважным земляробам на ўласнай зямлі. Меў ён трошкі болей за дваццаць гадоў, калі ў 1863 г. шляхта Лідскага павета ўзяла свае крамнёвыя стрэльбы, пісталеты і ржавыя шаблі і кінулася на прыгнятальнікаў. З той вайны пан Казімір выйшаў чыста, суха і гладка. Нават без падазрэнняў. Але пра вайну ніколі не распавядаў, бо пра «польский мятеж» расійскія ўлады ніколі не забывалі і ўспамінаць пра ўдзел у тых падзеях заўжды было небяспечна. Праз трыццаць гадоў пасля той вайны, калі пан Казімір ужо састарэў і стаў больш пабожным, чым у маладосці, бачылі яго, як пехам у пакоры пайшоў ён з Ліды, абносячы ад пробашча да пробашча цыдулку лідскага ксяндза Юзафа Сянкевіча – пастырскую візітацыю ксяндза-біскупа Аўдзеевіча, якая павінна была адбыцца ў дэканаце. Што здарылася? Ніхто

не разумеў, толькі ўжо пасля смерці нехта, можа Станіслаў Калясінскі з Траццякоўцаў, шапнуў камусьці з маладых, што пан Казімір меў нібы на сваім паўстанцкім сумленні ўдзел у экзекуцыі нейкага карчмара, ці ў Майстроўцы каля Цыбараў, ці ў іншай карчме, карчмара, прысуджанага паўстанцкім судом за даносніцтва.

У пана Казіміра быў сын, якога ён вучыў на арганіста, і ажно чатыры дачкі. Гэта былі часы, калі пачыналася будоўля чыгункі з Вільні на Роўна. Да гэтага часу Ліда была кутом, забітым дошкамі ад астатняга света. Пры будаўніцтве дарогі наплыла тут рознай басоты, пачалі рэзаць багацейшых ксяндзоў па плябаніях, нападаць на адзіночныя хутары. Часы былі страшныя. Да пана Казіміра вечарамі хадзіла на пасядзелкі і размовы лідская прыгарадная моладзь. Вядома: у доме тры дарослыя дачкі і чацвёртая – Броня, ужо ўбіваецца ў пёры. Пан Казімір кожнага любіў пачаставаць тытунём і тым больш быў задаволены, калі той, каго пачаставаў, голасна чхаў. Часам, вечарам у нядзелю, вялікая кампанія гуляла ў «злапай курыцу» (цёця-бабка), «у суседа» (рух цэлай кампаніі), «спаведніка» і г. д. Часам распавядалі ўсялякія цікавыя гісторыі, выпадкі ў горадзе, анекдоты, байкі, жахі альбо пра чары ці пра Пінокія, ці якім іншым лялькаводзе. Часам маладзёны дэкламавалі «Kiwona męczenika bożego»[6], «Uchwałę gromady żydowskiej o oddaniu syna Chaśki w soldaty» за тое, што не хадзіў у лазню, альбо такія вершы, як «Панскае ігрышча» ці «Адказ на панскае ігрышча» і іншыя, якія праз нейкі час былі надрукаваныя ў Кракаве ў кніжачках Мацея Бурачка[7]. Нярэдка прыходзілі з гармонікам і тады

[6] Легенда праКівона, Божага пакутніка, Гл.: Kiwon: Pociech, żywot i śmierć Kiwona bożego, męczennika żydowskiego. Bracia Worzałłowie, 1913. – Л. Л.

[7] З гэтых некалькіх радкоў выцякае, што вершы Францішка Багушэвіча мелі папулярнасць яшчэ да выдання ягоных кніжак, перапісваліся і чыталіся падчас вячорак. Вядома, што паэт быў знаёмы з польскай пісьменніцай Эліза Ажэшка і наведваў яе ў Гродна. Ажэшка пісала ў пісьме

танчылі на глінянай падлозе кадрыль, лансье[8], польку, мазуркаву польку і вальс. Для забавы хлопцы любілі танчыць «мікіту», перакладаючы ногі праз кій, які трымалі ў руках, і пры гэтым прыпяваць: «Мікіта, чы ты та». У карты не гулялі, толькі ў мужчынскім таварыстве бавіліся ў «шэсцьдзесят шэсць», «воза», «кіксу», а разам з паненкамі на картах гадалі. У звычайны дзень у пана Казіміра ўвечары служыла для асвятлення наша родная каханая лучына, а ў святочны дзень – газавая лямпа, напачатку – капцілка без шкла, а потым, калі газа ў вялікай колькасці з'явілася ў продажы ў Вільні і Лідзе, то са шклом.

Дзень Усіх Святых лічыцца жалобным святам. Так ужо павялося, што на Усе Святыя і на Дзень Задушны ані вяселляў, ані хрэсьбін не робяць. Сабраліся ўвечары таго дня, як звычайна, у пана Казіміра некалькі маладых хлопцаў і пачалі апавядаць пра тое і гэтае, пра святых, пра нябожчыкаў, пра жахі, пра ксяндза, які з'яўляецца ў сутарэннях палаца ў Дворышчы, пра бледны агонь, які пастаянна блудзіць каля Няцечы, і пра іншыя цікавыя рэчы. Было каля адзінаццаці вечара, калі хтосьці з Расаловічаў кінуў словы пра тое, што ў гэтую пару, пэўна, ніхто з кампаніі не меў бы адвагі пайсці на могілкі і прынесці сюды, у дом, на-

---

да Яна Карловіча з Гродна 02.11.1887 г.: «Тры тыдні таму назад быў у мяне добры Ваш знаёмы з Вільні п. Багушэвіч. Вельмі прыемна правяла я з ім некалькі гадзін. Ён мне чытаў свае беларускія паэзіі дый нават даў мне адпісы з іх з асобным вершыкам, гэтак сама па-беларуску … . Ці-ж ня праўда, што гэты рэчы вельмі харошыя, маюць нейкае асаблівае харасство, і мяне вельмі цікавіць, ці здолеюць іх зразумець дый засмакаваць у іх нашыя сяляне? Будучым летам папрабую чытаць іх маім міневіцкім знаёмым» (Гл.: Талочка Улад. Фр. Багушэвіч і Э. Арэшчыха // Запісы Беларускага навуковага таварыства. Вільня, 1938. Сш. 1. С. 35. ). Як бачым пры канцы 1887 г. вершы Багушэвіча яшчэ невядомы на радзіме і Эліза Ажэшка яшчэ толькі плануе іх «пусціць у народ» – перадаць сялянам свайго маёнтка ў Мінявічах. А першая кніга паэта, «Дудка беларуская», выходзіць у Кракаве ў 1891 г. – Л. Л.

[8] Лансье – англійскі парны бальны танец, блізкі да кадрылі, складаецца з пяці фігур – Л. Л.

прыклад, крыж з магілы. «А ты бы пайшоў?» – запыталі ў Расаловіча. «Аёй, чаму не? Што дасцё за гэта?» Пачалі таргавацца. Казалася пра кварту гарэлкі, пра рубель, нават пра кварту тытуню, але ні да чаго не дамовіліся. Раптам, калі гандляваліся за фунт цукерак, з цёмнага кута адазвалася Броня – та, наймалодшая.

- Я пайду і прынясу вам крыж, а што за гэта дасцё?

- Ты?.. Сікша! А што хочаш?

- Дайце фунт цукерак і дакажу, што не сікша! Яшчэ, халера, лаецца!

- Ваў!

- Але пабажыцеся, што не ашукаеце.

- Даліпан, – пабажыўся Расаловіч.

- Не, ты пабажыся па-сапраўднаму, па-каталіцку, скажы «далібог» і стукні сябе ў грудзі.

Усе засмяяліся, толькі Расаловіч зрабіў міну, быццам усё гэта несур’ёзна, ударыў сваёй правай рукой сталяра ў грудзі і вымавіў – «далібог!».

- Вось і пайду, вось і пайду…

Босая, у адной сукенцы, накінула хустку і, стукнуўшы дзвярыма, знікла. «Куды яна пойдзе, палова вярсты да магілак, дойдзе да брамы, пастаіць пад кутом і вернецца дахаты», – закончыў стары пан Казімір. Усе праз хвіліну забылі пра спрэчку і пачалі размаўляць пра іншае.

Вісела чорная лістападаўская ноч. Зімны вецер шумеў і рваў голае галлё бярозаў на гасцінцы, раз-пораз кідаў у твар жмені мокрага восеньскага дажджу. Са Слабады даносіўся жалобны вой сабакі. Броня адважна выйшла на гасцінец, мінула вісмантаўскі выган, вайсковыя склады, гмінныя збожжасховішчы і падышла пад самыя могілкі. Навобмацак спусцілася ў роў, залезла на муры і слізганула па мокрых і халодных камянях муроў на могілкі. У могілкавых соснах вецер шумеў яшчэ страшней. Дзесьці з

боку пастуквала галінка дрэва, а над могілкавай капліцай заплакала сава. Фунт цукерак!.. Фунт цукерак!.. У каляровых паперках з залатымі літарамі. Карамель! Кожная з ягадкай! Пасунулася наперад і, расставіўшы рукі, навобмацак пачала шукаць. Галлё шыпшыны і язміну хвасталі і кalолі яе твар і рукі. Ёсць! Намацала крыж. Але ён аброс імхом, стары і вялікі. Ня гэты. Пайшла далей. Зноў вые вецер, плача сава, зноў тыя ж шыпшына і язмін. Чарговая магіла з старой і крывой агароджай. Зноў крыж, але гладкі, новы, толькі таксама цяжкі. Яшчэ адзін упарты рух наперад – і зноў крыж. Рухам рукі абмацала – гладкі, невялікі, роўны з яе ростам. Наступіла на свежую, яшчэ мяккую магілу, упёрлася рукамі ў мокрыя канцы крыжа і адчула, што крыж паддаўся і пахіліўся. Ухапілася і ўсім целам адкінулася назад – крыж нахіліўся разам з ёй. Яшчэ раз і з паваротам, яшчэ і з паваротам. А цёмна, анічога не бачна. Падважыла крыж плячом знізу, ірванула ўверх і крыж нахіліўся. Ухапіла крыж за плячыма, пахіліла ўправа і ўлева і пачала цягнуць з зямлі. Крыж доўгі і, здавалася, біўся аб труну. Але вырвала. Хапіла абедзвюма рукамі, павярнула і таўканула ўбок, туды, дзе бачны чорныя дрэвы. Зноў магіла, зноў агароджа, мур, роў, гасцінец. Ухапіла крыж рукамі і папёрла наперад. Фунт цукерак! Вецер свістаў і падганяў яе ў спіну, крыж шараваў па мокрым пяску, а яна ўжо бегла. Што здарылася? Праз шум дрэваў пачула як быццам крыкі: «Броня!» – Была ўжо насупраць выгану. І яшчэ раз: «Броня!» – Ці гэта голас маці? А дадому яшчэ так далёка! Першы раз цапнуў яе за плечы мароз, і адчула страх. Хутчэй, хутчэй, але ногі не слухаюцца. А тысячы галасоў адусюль крычалі: «Броняяя!». Уляцела з крыжам на падворак, дрыжачымі рукамі адчыніла дзверы сяней, грымнула хатнімі дзвярыма і непрытомная ўварвалася ў

хату. Крыж упаў з яе рук, а сама яна, белая, як крэйда, абсела каля крыжа на гліняную падлогу.

Езус-Марыя, крыж! Аслупянелі ўсе, хто быў у хаце. Крыж з могілак! Ратуйце Броньку! Страціўшую прытомнасць Броню палажылі ў ложак, пачалі трэсці. Стары пан Казімір паражагнаўся, падняў крыж з падлогі і абапёр аб печ. Усіх ахапіў чорны жах. На нейкі час зрабілася ціха, толькі ў ложку слаба дыхала бледная Броня, а за вокнамі на падворку шумеў вецер, і здавалася, што пад вокнамі нехта размаўляе. Старэйшая сястра Броні, узіраючыся ў чорнае акно, дзіка закрычала: «Нябожчык! Там нябожчык!» Усе паглядзелі ў вакно: там на самай справе рухалася белая цень, і здавалася, што праз шум і ўдары ветру можна было пачуць голас нябожчыка: «Аддай мой крыж!». Усе пабялелі і пачалі жагнацца. Стары пан Казімір упаў на калені перад крыжам, а за ім упалі на калені ўсе, хто быў у хаце, і заспявалі «Анёл Панскі звеставаў Панне Марыі». Потым прамовілі літанію за душы памерлых верных і да ўсіх святых. Мінула поўнач. Калі закончылі астатні «Вечны адпачынак», у падпечку залапатаў крыламі певень, а потым галасна і доўга запеў раз, потым другі… сёмы. Вецер на дварэ паволі сцішваўся і наогул сціх. У вокны глядзела самая чорная ноч. Броня апрытомнела, агледзела ўсіх і шэптам прамовіла: «А фунт цукерак?». Моладзь, прыгнечаная паводзінамі малой авантурысткі, паўголасам загаварыла, якімі адважнымі бываюць дзяўчаты. Мінула другая гадзіна. Калі пачулі, што ў стрыя Сямёна зарыпала вага на студню, усе госці разам, сарамліва жагнаючыся, выйшлі з хаты. Пан Казімір вынес крыж у сені….

Наранку, калі развіднела, пан Казімір аднёс крыж на могілкі і ўставіў ў шырока расхістаны дол. Утаптаў пясок, адмовіў «Анёл Панскі» за душу непатрэбна патурбаванага нябожчыка і пайшоў у касцёл. У той дзень, як заўжды

ў Задушны дзень, на могілкі надышло шмат народу. Тут і прычыталі, і плакалі, і разам маліліся. Доўга стаяла некалькі вяскоўцаў над зруйнаванай магілай іх знаёмага. Шапталіся, паціскалі плячыма. Потым доўга хадзілі размовы, што гэты нябожчык у пэўны час вылазіць са сваёй труны і прыходзіць аж да сваёй хаты, якая стаіць за некалькі вёрст ад могілак.

Сын пана Казіміра ў той самы Задушны дзень знайшоў на падворку пад вокнамі паламаную галіну бярозы з прычэпленай да яе старой мужчынскай кашуляй, невядома адкуль сарванай ветрам. Броня атрымала свой фунт цукерак за 15 капеек і пастанавіла ніколі больш не лазіць ноччу на могілкі. Яшчэ пару тыдняў хадзіла як зачараваная, уначы размаўляла ў сне, зрывалася з ложка. Старая Шоціха на маладзік уначы сабрала на могілках імху, тры разы тым імхом, добра змяшаным з лавандай, абкурыла Броню і дзяўчына выздаравела. Яна потым вельмі добра выйшла замуж, за пана Станіслава Аўгуста Панятоўскага ў Ляхаўку, што пад Васілішкамі, але бядачка памерла маладой.

*Вечны адпачынак*
*Дай ім, Пане,*
*А святло вечнае няхай ім свеціць.*
*Аман*

Таццяна Нікіфарава

## Старое пахаванне. Як захаваць памяць продкаў[9]

Аблічча старых гарадскіх могільнікаў – тэма трапяткая для насельніцтва. Лёс старых могілак (размешчаных па праспекце Перамогі ў Лідзе) складаны. Іх захаванасць і тэрытарыяльную цэласнасць трагічна парушалі падзеі і людзі 20 стагоддзя. «Гістарычны горад» у горадзе, заснаваны ў 1797 годзе, з мноствам магіл людзей розных саслоўяў і канфесій.

Сюды прывозілі хаваць не толькі гараджан, але і некаторых жыхароў Лідскага павета. Узрост могілак такі, што магіл, даўно не наведваных, вельмі шмат.

Тым не менш, яны – частка культурнай прасторы, якую неабходна вывучаць і правільна пра яе распавесці сучаснаму грамадству.

Наколькі аўтэнтычнасць гэтага гістарычнага некропаля можна зберагчы і захаваць? Ініцыятарамі такой задачы выступіла грамадскае аб'яднанне сяброў Лідчыны з г. Гданьска пры фінансавай падтрымцы праектаў аднаўлення помнікаў гісторыі і культуры Міністэрствам культуры Рэспублікі Польшча.

Гэтая ініцыятыва была падтрымана Лідскім раённым выканаўчым камітэтам, і праект ужо ў дзеянні. Супрацоўнікі гістарычна-мастацкага музея ў адзін з восеньскіх дзён наведалі гэтае «месца сну» ў суправаджэнні карэннай лідзянкі, прадстаўніцы адной з найстарых сем'яў горада Галіны Лаўрэш (з сям'і Хруль). Пачынаючы гутарку пра рэалізацыю дадзенага праекту, яна сказала:

- Гісторыя гэтага горада – гэта фактычна гісторыя і маёй сям'і з 1527 года.

---

[9] Нікіфарава Таццяна. Старое пахаванне. Як захаваць памяць продкаў // Наша Слова. 2018. 8 лістапада.

Мы пазнаёміліся з цікавым падыходам, пакладзеным у аснову канцэпцыі аднаўлення, распрацаванай прафесарам архітэктуры і спецыялістам па паркавым дызайне Катажынай Размарыноўскай. Гэта так званая рамантычная рэстаўрацыя («арганізаваная занядбанасць»). Надмагіллі захоўваюцца ў існым выглядзе (закансерваваны, што вельмі важна!), але надпісы «адкрыты» для чытання (і вывучэння, што каштоўна!). Дазваляецца ачыстка і вываз смецця, але не фрагментаў надмагілляў і агародж, да якога б перыяду гісторыі могілак яны ні адносіліся. Высякаецца хмызняк, асобныя старыя дрэвы фрагментарна ўключаюцца ў агульную кампазіцыю або высаджваюцца новыя тых жа парод. Аднаўляецца гістарычная трасіроўка алей і дарожак. І што ў дадзеным выпадку важна – аднаўляецца фундатарская агароджа могілак 1903 года.

Менавіта надмагіллі – натуральная прыналежнасць і каштоўнасць любых могілак. Розных памераў, стыляў, выкананыя ў традыцыйных матэрыялах; наіўныя – самадзейных разбяроў, тыпавыя, аўтарскія, нарэшце, сапраўдныя шэдэўры сакральнага мастацтва. Надмагільныя помнікі – гэта дэманстрацыя сацыяльнага і фінансавага становішча, на гэтых могілках павятовая шляхта гэта пасняхова дэманстравала. Мы ўбачылі надмагіллі з граніту, пясчаніку, цэглы, дзікага каменю, шмат рэдкіх узораў чыгуннага ліцця і коўкі. Характэрна, што вельмі рэдка сустракаюцца паўторы вонкавага выгляду надмагілляў – знак таго, што грошай на гэтыя мэты не шкадавалі…

Тут жа можна разглядзець надмагільныя сімвалы і знакі. Выпадковаму чалавеку яны невядомыя: дэндралагічныя помнікі ў выглядзе ствалоў без галінак, часцей за ўсё падкажуць пра пахаванне чалавека, у якога няма спадчыннікаў; плюшч – знак вечнага жыцця; паходня – знак канца жыцця; зламаная ружа – знак сыходу чалавека ў росквіце

гадоў; вянок з руж – знак дабрадзейнасці; галінка лаўру – неўміручасць і чысціня; свечкі – хуткабежнасць жыцця…

Гэта так званыя, лапідарныя «лісты». Часам іх завуць (па форме помнікаў) «квадратнымі лістамі» для будучых пакаленняў. Вынікам працы на працягу года ў рамках дадзенага праекту стаў цэлы пласт «адкрытых» (расчышчаных), прачытаных і дадаткова вывучаных «каменных лістоў». На плітах чытаецца найкаштоўнейшая інфармацыя пра тое, хто пахаваны, з якой сям’і і род заняткаў памерлага. Бяры і чытай рэальную гісторыю жыцця людзей горада Ліды і Лідскага павета!

Вельмі важна, што гэтае месца, нягледзячы на разбурэнні на яго тэрыторыі, захавала архітэктурную кампазіцыю. Размяшчэнне вонкавых і ўнутраных элементаў, усё яшчэ ўзгоднена паміж сабой і творыць адзінае цэлае, у якім вызначальнымі з’яўляецца глыбінная кропка капліцы ў гонар хрысціянскай вялікапакутніцы Святой Барбары, якая з’яўляецца апякункай людзей рызыкоўных прафесій: ваяроў, пажарных… Заснавана капліца ў 1805 годзе; у яе сценах гучаў орган, яна спазнала пажар, зацягнутую рэстаўрацыю, доўгае запусценне і толькі на стыку стагоддзяў XX і XXI яе аднаўленне было завершана.

Назапасілася досыць аргументаў, каб надаць самаму старому з захаваных могільнікаў горада, рэгіянальны статус гістарычна-культурнай каштоўнасці. Гэта вельмі важна для гісторыі самога горада і генеалагічных (біяграфічных) даследаванняў пра людзей, якія яго засялялі… Дарэчы, падобныя аб’екты многія гарады ўключаюць у настальгічныя турыстычныя туры для невялікіх груп людзей.

# Змест


Ад аўтараў .......... 5
Старажытныя ўніяцкія могілкі .......... 7
Старажытныя рыма-каталіцкія могілкі .......... 15
Яўрэйскія могілкі .......... 23
Вайсковыя могілкі .......... 32
Старыя праваслаўныя могілкі .......... 39
Слабадскія могілкі .......... 49
Старыя гарадскія (каталіцкія) могілкі .......... 52
Каэтан Дэрашкевіч .......... 61
Валерыя Цехановіч .......... 64
Лясковічы .......... 70
Капліца на могілках .......... 81
Магілы ксяндзоў .......... 83
Магілы лідскай шляхты .......... 91
Эрнест Мэдэм і іншыя помнікі з надпісамі на рускай мове .......... 91
Зарэцкія .......... 92
Юзаф Грабавецкі .......... 95
Шляхта з Вялікай Перапечыцы .......... 96
Садоўскія .......... 97
Іншая шляхта Лідчыны .......... 99
Крахельскія .......... 100
Лідзяне .......... 103
Трошкі пра выраб нагробкаў .......... 116
Вайсковая частка могілак .......... 118
Магіла ксяндза Адама Фалькоўскага .......... 129
Іканаграфія нагробкаў .......... 134
Пасляслоўе .......... 144
Спісы пахаваных на могілках горада Ліда .......... 151
Спіс пахаваных на гарадскіх могілках каля царквы св. Георгія. Па інфармацыі царквы. .......... 151
Спіс пахаваных на старых гарадскіх могілках (т. з. «каталіцкіх») .......... 159
Дадаткі .......... 203

*Краязнаўчае выданне*

Леанід Лаўрэш
Галіна Лаўрэш

**Там, дзе спыніўся час...**

*Лідскія гістарычныя некропалі*

Падрыхтоўка да друку, макетаване
***В. Цяплінскі, Я.Золак***

Падпісана ў друк 30.09.2024 г. Фармат 60х84 $^{1}/_{16}$.
Ум. др.арк. 8,40. Ул.-выд. арк. 9,20.
Наклад 72 ас. Замова 09–14/2024.

Выдавецтва "ГроКарДрук".
Вул. Жыгімонтаўская, 28,
інд. 320017, м. Казімір, Мінскай вобл.



*Галіна і Леанід Лаўрэшы на старых могілках, кастрычнік 2019 г.*
*Фота Кацярыны Гардзеевай*

